Людзьмі звацца! —
Янка Купала

Літаратура і Мастацтва

ВЫХОДЗІЦЬ З 1932 г.

ШТОТЫДНЁВІК МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Пятніца, 10 жніўня 1990 г. № 32 (3546) ● Цана 10 кап.

ЗАМЕСТ ТАГО, КАБ ВІТАЦЬ...

Адкрыты ліст да Прэзідыума Вярхоўнага Савета БССР

Паважаныя народныя дэпутаты!

З вопыту ўласнага жыцця, з публікацый друку, з прамоў на першай сесіі Вярхоўнага Савета Вы маеце ўяўленне пра занядбаны стан беларускай культуры, нізкі ўзровень гістарычнай і нацыянальнай свядомасці народа, пра недаравальную абыякавасць, а часцяком і ваяўнічую варожасць улад у адносінах да спадчыны, напрацаванай папярэднімі пакаленнямі. Тое, што другія народы зберагаюць як найкаштоўнейшы скарб, у нас лічылася, ды і лічыцца смеццем. Паважаны Прэзідыум, у якой яшчэ краіне было б магчыма аддаваць архітэктурныя і гістарычныя помнікі пад кароўнік, як гэта беспакарана зроблена ў нас у Гальшанах, ужо ў перабудовачныя часы? Дзе яшчэ ўзарвана ці спалена столькі старых будынкаў, столькі цэркваў і касцёлаў, узарана курганоў, высушана рэчак, скалечана мястэчак, зменена гістарычных назваў? Немагчыма прыгадаць другую еўрапейскую краіну, дзе б гэтак планамерна вынішчалася гістарычная памяць народа.

Каб не ўзнікала ніякіх перашкод у гэтай варварскай працы, адміністрацыйна-камандная сістэма трымала пад прыгнётам і беларускае краязнаўства — галіну культуры, што выступае захавальнікам гістарычнай памяці, аберагае ўсе адзнакі нацыянальнага ладу жыцця, увесь назапашаны за тысячагоддзі масіў асаблівасцей народа. Сёння стан нашага краязнаўства нельга параўнаць нават з трагічным станам беларускай мовы. Яно на мяжы скону.

З гэтае прычыны — з нежадання сканаць — у снежні мінулага года адбылася канферэнцыя краязнаўцаў, гісторыкаў, рэстаўратараў, музейных работнікаў, дзеячаў культуры, якая з падставы шырокага прадстаўніцтва ўсіх рэгіёнаў рэспублікі і ўсіх зацікаўленых лёсам культуры арганізацый атрымала паўнамоцтвы з'езда і адрадзіла Беларускае краязнаўчае таварыства (БКТ), што існавала ў 20-х гадах, да пачатку сталінскага тэрору. З'езд прыняў Праграму, Статут і абраў Раду БКТ.

Неўзабаве ў Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР былі пададзены неабходныя паперы для рэгістрацыі Таварыства. Але ў адказе, падпісаным былым намеснікам Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета У. Мікулічам, катэгарычна адмаўлялася нават самая ідэя стварэння БКТ. Краязнаўцам дазвалялася існаваць адзіна ў якасці секцыі пры Беларускім фондзе культуры. Маўляў, і за гэта будзьце ўдзячныя.

У маі бягучага года сабраўся Вярхоўны Савет БССР новага склікання, былі абраны Старшыня і яго намеснікі, утвораны новы Прэзідыум. Але ў адносінах да БКТ усё засталося па-ранейшаму. На паўторную заяву аб рэгістрацыі БКТ зноў адказана адмовай, падпісанай намеснікам Старшыні Вярхоўнага Савета В. Шаладонавым. Зноўку са спасылкамі на дробныя хітрыкі закона 1932 г. нам даводзяць, па якой каляіне трэба ісці да лепшае будучыні. Без увагі засталіся і тлумачэнні ад імя Фонду культуры, а таксама абгрунтаваны зварот да першага намесніка Старшыні Вярхоўнага Савета С. Шушкевіча.

(Працяг на стар. 2).

Помнік на Грунвальдскім полі 15 ліпеня 1990 года, 580-я ўгодкі вялікай бітвы. Артыкул А. СІДАРЭВІЧА «Роздум пасля Грунвальда...» чытайце на стар. 5, 12 гэтага нумара. Фота У. ШУБЫ.

ВЕДАЦЬ, ШТО БАЛІЦЬ ЛЮДЗЯМ

Госць «ЛіМа» — Аляксандр Надсан

Імя апостальскага візітатара для беларусаў замежжа айца Аляксандра (А. Надсана) ужо вядома нашым чытачам. Сёлета ў сакавіку А. Надсан у ходзе сваёй паездкі на Беларусь бясплатна перадаў гематалагічнаму цэнтру ў Мінску партыю адназовых шпрыцаў, вітамінаў, іншых прэпаратаў. Пра гэтую дабрачынную акцыю паведамлялі «ЛіМ», іншыя газеты.

На мінулым тыдні айцец Аляксандр зноў прыехаў на Беларусь. І зноў — з найкаштоўным грузам для дзяцей Чарнобыля. Разам з напарнікам ён даставіў на мікрааўтобусе праз усю Еўропу лекі, абсталяванне і медыкаменты на 30 тысяч фунтаў стэрлінгаў. Такую суму ахвяравалі прыхаджане цэркваў у Англіі, да якіх звярнуўся з заклікам аб міласэрнасці і дапамозе А. Надсан.

Частку груза англійскі святар таксама перадаў Мінскаму гематалагічнаму цэнтру, дзе лечацца дзеці, пацярпеўшыя ад радыяцыі, а частку даставіў у Гомель.

Пра свае ўражанні ад наведвання Гомельшчыны, у прыватнасці — Хойніцкага раёна, А. Надсан падзяліўся ў рэдакцыі «Літаратуры і мастацтва». Разам з ім у «ЛіМ» прыйшлі пісьменнікі А. Мальдзіс, Б. Сачанка, А. Сідарэвіч.

— Наведанні шпіталяў, радзільных дамоў, дзіцячых устаноў у пацярпелых раёнах панінулі цяжкае ўражанне,—расказваў айцец Аляксандр. — Не хапае так неабходнага дыягнастычнага абсталявання, не хапае і высокакваліфікаванага медперсаналу. Многія з'ехалі, не вытрымаўшы цяжкасцей. Але тыя, што засталіся, у большасці сваёй — самаадданыя, глыбока сумленныя людзі, — падкрэсліваў наш госць.

(Працяг на стар. 2).

УЗНОС «КРУПІЦКІХ МУЗЫКАЎ»

Фальклорна-этнаграфічны калектыў «Крупіцкія музыкі» вярнуўся з паездкі ў ФРГ, дзе прымаў удзел у Еўрапейскім маладзёжным тыдні разам з калектывамі з Італіі, Чэхаславакіі, ГДР, ФРГ. Гаспадары ўрачыстасці і замежныя госці былі здзіўлены багаццем народных традыцый, прадстаўленых самадзейнымі артыстамі з Беларусі, высокім майстэрствам выканання імі народных танцаў.

Заслужаны дзеяч мастацтваў БССР У. Гром паведаміў, што творчая паездка «Крупіцкіх музыкаў» была звязана з дабрачыннай акцыяй: на сродкі, выручаныя ад канцэртаў, закуплена сем тысяч аднаразовых шпрыцоў для дзіцячай бальніцы ў вёсцы Пяцяўшчына.

І. ХАШКО.

«НАША СЛОВА»—ПРАЦЯГ ЗНАЁМСТВА

Разнастайныя матэрыялы змешчаны ў ліпеньскім выпуску бюлетэня Таварыства беларускай мовы імя Ф. Скарыны. 90-годдзе з дня нараджэння У. Дубоўкі адзначана артыкулам В. Віткі «Верны матчынаму слову». У сувязі з 80-годдзем з дня нараджэння Л. Геніюш А. Траяноўскі выступае з успамінамі «Цвілі «юргіні» каля хаты».

Пад рубрыкай «Трыбуна дэпутата» публікуюцца выступленні на сесіі Вярхоўнага Савета БССР Н. Гілевіча «Клопат дзяржаўны і ўсенародны» і А. Трусава «Як перамагчы імперскі сіндром».

Старшыня аргкамітэта «Бацькаўшчына» Я. Лецка расказвае пра намаганні па стварэнні міжнароднага згуртавання беларусаў.

У нумары — паэтычная нізка «Зямлі бацькоў — не анямецьі», падборка чытацкіх лістоў, паведамленне В. Трыгубовіч пра выступленне танцавальнага ансамбля «Васілёк» з Амерыкі, інтэрв'ю Р. Гамзовіч з кіраўніком Беларускага амерыканскага згуртавання В. Бартуль і іншыя матэрыялы.

ТЭАТР З ДАНЕЦКА

Гастрольнае лета працягвае дарыць сустрэчы з тэатральнымі калектывамі саюзных рэспублік. Працягвае гастролі ў Беларусі і Данецкі абласны музычна-драматычны тэатр імя Арцёма. З майстэрствам яго пазнаёміліся ўжо гледачы Бабруйска, а цяпер артысты з Данецка выступаюць на мінскай сцэне.

У гастрольнай афішы спектаклі, разлічаныя, як кажуць, на розныя мастацкія густы — «Дача Сталіна» У. Губарава, «Інтэрдзяўчынка» У. Куніна, «Зойчына кватэра» М. Булгакава, «Блэзе, або Інтрыгі закаханых» сучаснага французскага драматурга К. Манье...

Пасля Мінска тэатр працягне выступленні ў Віцебску. Дарэчы, гэта яго трэці прыезд у рэспубліку. Папярэднія гастролі адбыліся ў 1937 і 1960 гадах.

Дэпутацкі клуб «ЛіМа»

ЯКАЯ ПАЗІЦЫЯ Ў АПАЗІЦЫІ

Народны дэпутат БССР, лідэр Беларускага народнага фронту «Адраджэнне» Зянон ПАЗНЯК адказвае на пытанні нашага парламенцкага карэспандэнта

— На мінулым тыдні завяршылася праца першай сесіі Вярхоўнага Савета БССР XII склікання. Пракаменціруйце, калі ласка, вынікі двух з палавінай месяцаў парламенцкай дзейнасці — з пункту гледжання іх адпаведнасці ці неадпаведнасці дэмакратычным, адраджэнцкім працэсам у грамадска-палітычным жыцці рэспублікі. Наколькі ўдалося ажыццявіць тыя ідэі, з якімі

БНФ выступаў на выбарах-90!

— Лічу вынікі сесіі больш чым сціплымі. Дзве трэці рабочага часу змарнавана яе арганізатарамі, а прынятыя рашэнні шмат у чым не адпавядаюць інтарэсам людзей.

Па-першае, не падрыхтавана, не прынята ніводнага заканадаўчага акту, які б спрыяў пераходу на рыначную эканоміку і ўмацоўваў бы суверэнітэт Беларусі. Калі мець на ўвазе гэты заканадаўчы вакуум, то напышлівыя размовы аб новай эканамічнай мадэлі і ажыццяўленні суверэнітэту гучаць дэмагогіяй. Між тым жыццё за межамі Беларусі не спынілася, імкліва рухаецца да незалежнасці і дэмакратыі, пакідаючы нас далёка ззаду, у атмасферы палітычнай адсталасці, стагнацыі і рэліктавага бальшавізму. І ўжо не мы, а знешнія сілы адпаведным чынам будуць вызначаць наша становішча. Такая расплата за застой і палітычны параліч. Некалі камуністы, аматары да ўсялякага роду «ізмаў», прыдумалі слоўца — «хвасцізм». Яно вельмі дарэчы, калі характарызаваць грамадска-палітычную сітуацыю ў рэспубліцы.

Прымаючы пад увагу адсутнасць элементарнай заканадаўчай базы пад рыначную сістэму і суверэнітэт, а таксама састарэласць адміністрацыйна-камандных структур улады, у прынцыпе не было патрэбы ствараць новы кабінет міністраў паводле старой кадрава-структурнай схемы. Бессэнсоўна, лічу, было фарміраваць урад, які заведама нічога не вырашыць і збанкрутуе. Гэта марнаванне часу. Можна было прадоўжыць паўнамоцтвы старога кабінета на перыяд заканадаўчых рэформ, аднак на гэта не пайшлі. Дэпутаты ад БНФ не галасавалі пад час зацяжнога пустапарожняга міністэрскага шоу і не нясуць адказнасці за дзеянні новай адміністрацыі.

Па-другое, не прыняты неабходныя дакументы, якія б спрыялі дзяржаўнай, грамадскай дзейнасці дэпутата, пацвярджалі яго правы і магчымасці. Гэта закон аб статусе народнага дэпутата, пастаянны рэгламент і іншыя палажэнні, напрыклад, аб Сакратарыяце Вярхоўнага Савета БССР... Сесія скончылася, а дэпутаты не маюць закона, на падставе якога яны павінны ажыццяўляць свае паўнамоцтвы. Яны нават не маюць дэпутацкіх пасведчанняў, акрамя часовых картак. Аказваецца, пасведчанні «суверэнным» беларускім дэпутатам павінна зрабіць і выдаць Масква...

Затое партыйная большасць Вярхоўнага Савета на закрытым пасяджэнні, пры адключанай радыё- і тэлетрансляцыі працягнула палажэнне аб тым, што «народнаму дэпутату БССР, вызваленаму ад выканання службовых ці вытворчых абавязкаў у сувязі з працай у Вярхоўным Савеце БССР, калі ён не мае пастаяннага месца жыхарства ў Мінску, даецца жылая плошча на ўсю сям'ю ў Мінску». Гэтая ў поўным сэнсе слова непрыстойнасць вельмі абурае шмат якіх дэмакратычных дэпутатаў. Бо так нідзе не робіцца. Дэпутат, які пераходзіць на пастаянную працу ў Вярхоўны Савет, павінен атрымліваць у Мінску не пастаянную, а часовую службовую жылплошчу. Пры гэтым кватэра па месцы жыхарства бранируецца за ім на перыяд ажыццяўлення дэпутацкіх паўнамоцтваў. Аднак партыйная наменклатура не была б партыйнай наменклатурай, калі б, трапіўшы ў масавай колькасці ў Вярхоўны Савет і захапіўшы ўладу, не выкарыстала б яе і тут дзеля сваіх асабістых інтарэсаў.

І, нарэшце, трэцяе. Як след не вырашана пытанне пра выратаванне насельніцтва ад чарнобыльскай катастрофы. Тут у наменклатуры, на якой у значнай ступені ляжыць адказнасць за паслячарнобыльскія падзеі, таксама было шмат асабістых інтарэсаў. Адсюль — працягласць і заблытанасць дыскусій, адсюль — недастатковыя і нездавальняючыя рашэнні па Чарнобылю.

ЗАМЕСТ ТАГО, КАБ ВІТАЦЬ...

(Пачатак на стар. 1).

Адмоўнае стаўленне да адроджанага Беларускага краязнаўчага таварыства нельга расцэньваць інакш, чым свядомы здзек. На нашую думку, Прэзідыум павінен выправіць злачынства ў адносінах да БКТ, скасаванага ў часы сталінскага генацыду супраць беларускага народа і беларускай культуры. Нагадаем, што яго дзеячы сталі ахвярамі Курапатаў і канцлагераў.

Адмова ў рэгістрацыі БКТ — гэта абраза нашых патрыятычных пачуццяў і гвалт над нашымі грамадзянскімі правамі. Над рэспублікай вісіць чарнобыльская хмара, сродкаў на рэанімацыю культуры, гістарычнай спадчыны, па сутнасці, няма. І пры такіх жорсткіх умовах Прэзідыум Вярхоўнага Савета замест таго, каб вітаць нашую культурную ініцыятыву, душыць яе з дапамогай сталінскіх законаў.

Пагадзіцца з гэтым немагчыма.

Мы патрабуем спыніць ганебныя адносіны да БКТ і неадкладна зарэгістраваць Таварыства.

Сябры Рады Беларускага краязнаўчага таварыства: Канстанцін ТАРАСАЎ, пісьменнік; Таццяна ГАРАНСКАЯ, член Саюза мастакоў Беларусі; Алесь КІШЧЭВІЧ, эксперт БФК; Анатоль ЦІТОЎ, старшы выкладчык Мінскага інстытута культуры; Міхась ЧАРНЯЎСКІ, загадчык аддзела археалогіі Інстытута гісторыі АН БССР; Вольга ІПАТАВА, пісьменніца; Віталь СКАЛАБАН, супрацоўнік выдавецтва БСЭ; Анатоль ГРЫЦКЕВІЧ, доктар гістарычных навук, прафесар; Данута БІЧЭЛЬ-ЗАГНЕТАВА, пісьменніца; Валянцін ГРЫЦКЕВІЧ, дацэнт Ленінградскага інстытута культуры, правадзейны член геаграфічнага Таварыства СССР; Сымон СВІСТУНОВІЧ, член Саюза мастакоў Беларусі; Сяржук ВІТУШКА, малодшы навуковы супрацоўнік музея М. Багдановіча.

ВЕДАЦЬ, ШТО БАЛІЦЬ ЛЮДЗЯМ

(Пачатак на стар. 1).

Вельмі высока азваўся ён аб намесніцы старшыні камітэта «Дзеці Чарнобыля» Н. Баркоўскай, якая суправаджала святара ў яго паездцы.

Кантакты з людзьмі, якія жывуць зараз у заражаных раёнах, неабходны, гаварыў А. Надсан. Трэба ведаць, што найбольш баліць гэтым людзям, што найперш іх хвалюе. На яго думку, менавіта гэтага не хапае замежным экспертам па праблемах радыяцыі, якія працуюць на Беларусі, часцей за ўсё не ведаючы ні мовы, ні мясцовых умоў.

Удзельнікі гутаркі ў рэдакцыі прыйшлі да высновы, што адным з самых небяспечных вынікаў Чарнобыльскай трагедыі стала разбурэнне сувязей людзей з роднай прыродай, этнакультурнага соцыуму. У сувязі з гэтым гаворка, натуральна, зайшла і аб праблемах адраджэння беларускай нацыі — яе мовы, культуры, традыцый, маральных каштоўнасцей, а таксама і аб ролі, якую можа і павінна адыграць тут беларуская эміграцыя.

НАШ КАР.

● ЛІСТ У РЭДАКЦЫЮ

ЛЮДЗІ, КАЛІ Ж МЫ СТАНЕМ ЛЮДЗЬМІ?

Страшнае слова КУРАПАТЫ стала сімвалам народных пакутаў, беззаконня, масавых злачынстваў, вынішчэння лепшых сыноў і дачок нашай зямлі, сведчаннем сталінскага генацыду.

Грукочуць аўтобусы і самазвалы, імчацца легкавушкі па асфальце Мінскай кальцавой дарогі, а пад ёю — косці і чарапы з прастрэленымі патыліцамі.

Шумяць учарнелыя сосны над праваламі брацкіх магіл, а ў іх — астанкі беларусаў, рускіх, украінцаў, яўрэяў, палякаў, літоўцаў і латышоў, камуністаў і святароў усіх веравызнанняў, мужчын і жанчын, старых і падлеткаў.

Увесну гэтыя клады жахлівых пакут, ці не Боскаю воляю, укрываюць белыя пралескі, памясцоваму — курапаты і чырвоныя грыбы.

Гэты невялікі лес паміж полем і кальцавою дарогаю стаў месцам паломніцтва нашчадкаў закатаваных пакутнікаў і цудам ацалелых іх колішніх аднакамернікаў і састарэлых сяброў. Яны прыносяць кветкі, рушнікі з чырвонымі і чорнымі ўзорамі, запальваюць свечкі ля крыжа.

У нядзелю, 5-га жніўня, я абышоў увесь масіў ад аўсянішча да дарогі. У нізіне дыміліся вогнішчы, па-пляжнаму расцялешаныя людзі пілі, закусвалі, нешта смажылі, каля іх весяліліся дзеці. Я наіўна пацікавіўся, ці не памінкі спраўляюць яны. «Зачэм? Проста аддыхаем...»??? «Ну і што? Слышалі. Што-та была кагдата. Вы, старыкі, помніце, а для нас—лес і лес». Вось так! Па сцежках выгульваюць сабак, стаіць рокавы вэрхал. Людзі, калі ж мы станем людзьмі?

Ці не пара на дзяржаўным узроўні абвясціць вусцішны курапацкі лес святым нацыянальным запаведнікам, месцам пакаяння вінаватых і пакланення сумленных, маршрутам маўклівых экскурсій?

На адкрытым узгорку — вялізны валун. На ім адліты з металу надпіс: «У гэтым лясным масіве ў адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў Беларускай ССР ад 18 студзеня 1989 г. (шкада, што не паставілі нумар) будзе пабудаваны помнік ахвярам масавых рэпрэсій 1937—1941 гадоў».

Чыіх рэпрэсій? Каго каралі, вінаватых ці невінаватых, пастанова сарамліва ўмоўчвае. Сцюжаю цягне ад жалезабетоннага стылю чыноўніцкай інфармацыі. Прасцей было б напісаць: «Тут будзе помнік ахвярам сталінскага генацыду. Савет Міністраў БССР».

Што датычыць ажыццяўлення ідэй БНФ. Яны звычайна адхіляліся партыйнай дэпутацкай большасцю, але асобнымі сваімі палажэннямі ў той ці іншай форме раскіданы па многіх прынятых дакументах. Напрыклад, была адхілена Дэкларацыя аб незалежнасці Беларусі, прапанаваная Народным фронтам. У той жа час прыняты дакумент аб дзяржаўным суверэнітэце, дзякуючы працы нашых дэпутатаў, на 95 працэнтаў заснаваны на ідэях БНФ, выкладзеных яшчэ паўтара года назад.

— Чым зараз вызначаецца расстаноўка сіл у Вярхоўным Савеце! Наколькі адэкватна, на ваш погляд, цяперашні дэпутацкі корпус выяўляе волю народа! Што спрыяе і, наадварот, што замінае выпрацоўцы і прыняццю адказных рашэнняў!

У Вярхоўным Савеце БССР каля 86 працэнтаў камуністаў, прычым большасць з іх — апаратная і адміністрацыйна-гаспадарчая наменклатура. Волю народа гэтая большасць, вядома ж, не выяўляе. Яна баіцца гэтага народа. Такая сітуацыя ўтварылася таму, што ў нас няма дэмакратычнага закона аб выбарах. Адпаведна, не было і дэмакратычных выбараў. Я ўжо не кажу пра махінацыі і фальсіфікацыі з боку выбарчых камісій.

Дэмакратычныя дэпутаты па ініцыятыве групы БНФ аб'ядналіся ў Дэпутацкі клуб, які мае свой статут, прыняты 100 дэпутатамі. Гэта даволі свабоднае і шырокае аб'яднанне, вельмі неабходнае ў варунках кансерватыўнага засілля.

Дэпутацкая група (фракцыя) БНФ з 27 чалавек утворана з перад сесіяй, але заявіла пра сваё стварэнне і рэгістрацыю толькі праз два месяцы, калі больш-менш выспелі ўмовы. Да гэтага часу ўжо існавалі групы аграрнікаў і ветэранаў («Саюз»). Нядаўна абвясцілі пра сваю групу (160 членаў) і камуністы. Вылучаецца таксама група «прамыславікоў» (кіраўнікоў прадпрыемстваў і інш.).

Найбольш радыкальныя аб'яднанні — гэта БНФ і Дэмакратычны клуб (парламенцкая фракцыя БНФ уваходзіць у Дэмклуб). Пэўным лібералізмам па асобных пытаннях, але і вузкім прафесіяналізмам характарызуецца група «прамыславікоў». Партгрупа выяўляе ў асноўным інтарэсы кіруючага апарату. Найбольш палітычна рэакцыйная катэгорыя дэпутатаў — аграрнікі, пераважна кіраўнікі гаспадарак і сельгасведамстваў. Зрэшты, і сярод аграрнай групы ёсць дэмакратычна настроеныя людзі, але яны не робяць «надвор'я».

Самае сумнае, што ўсе наменклатурныя групы аб'ядноўвае стойкае непрыняцце беларускай мовы і культуры. На прыкладзе гэтых дэпутатаў добра відаць вынікі той антыкультурнай палітыкі на Беларусі, калі нацыянальны нігілізм становіцца масавай псіхалогіяй.

Да кансерватыўнай большасці Вярхоўнага Савета трэба таксама далучыць дэлегатаў ад ветэранскай арганізацыі (29 пенсіянераў). У асноўным гэта былое вышэйшае афіцэрства і высокапастаўленая некалі наменклатура, чыя дзейнасць і заслугі раскрыліся ў часы Сталіна і Брэжнева. У Вярхоўны Савет яны прыйшлі з кіруючых структур сваёй арганізацыі, мінаючы народныя выбары ў акругах. Гэтыя дэпутаты даволі актыўныя, выступаюць па ўсіх пытаннях з пазіцый пазаўчарашняга дня і галасуюць часта на ўзроўні дагматычных інстынктаў (як, напрыклад, за захаванне шостага артыкула Канстытуцыі).

У цэлым, калі суаднесці цяперашні склад Вярхоўнага Савета, яго пераважна кансерватыўную палітычную арыентаванасць, прафесійную і культурную павярхоўнасць — з тэрміновымі задачамі беларускага грамадства, то я не бачу для гэтага Савета ніякай перспектывы. Ён проста недзеяздольны па сённяшніх мерках, у яго трапілі не тыя людзі. Мяркую, як толькі палепшыцца становішча і з'явяцца магчымасці для свабодных дэмакратычных выбараў, адразу паўстане пытанне аб роспуску нашага цяперашняга Вярхоўнага Савета.

— Шмат увагі на сесіі было ўдзелена чарнобыльскай праблеме, слуханні па гэтым пытанні былі найбольш працяглымі. Беларусь абвешчана зонай нацыянальнага экалагічнага бедства. Ці можна спадзявацца, што ў бліжэйшы час сітуацыя карэнным чынам зменіцца, а прынятыя захады будуць эфектыўныя!

— На маю думку, не. Бо ва ўладзе на Беларусі па-ранейшаму знаходзяцца людзі, вінаватыя ў паслячарнобыльскай трагедыі. Яны не здольныя ратаваць народ, бо заўсёды былі аб'ектыўна варожыя яму.

Для выратавання нацыі неабходны дзве ўмовы. Першая — дзяржаўны суверэнітэт і незалежнасць Беларусі, каб скарыстаць сваю грамадскую працу, яе вынікі і энергію на вырашэнне ўласнага лёсу і дзеля свайго дабрабыту. Другая ўмова — ліквідацыя камуністычнай дыктатуры, яе адміністрацыйна-камандная сістэмы.

Важна таксама зразумець, што чарнобыльская трагедыя, якая ўжо пяты год доўжыцца на Беларусі, той абсурд, што адбываецца на нашых землях, той радыяцыйны генацыд, — маюць пад сабой злавесную прычыну і злавесны сэнс. Над нашым народам робіцца атамны медыка-радыелагічны эксперымент, у якім зацікаўлены не толькі ваенна-прамысловы комплекс СССР, але і ЗША, увесь ядзерны свет і, перш за ўсё, такая арганізацыя, як МАГАТЭ. Яна абараняе не чалавека, не людзей, а інтарэсы ядзернай энергетыкі, ядзерных манапалістаў. А манапалістамі ў гэтай галіне з'яўляюцца СССР і ЗША. Перш чым вырашыць што-небудзь у МАГАТЭ, яны дамаўляюцца паміж сабой, а потым ужо праводзяць «фармальнасці»: «выбіраюць», скажам, генеральнага дырэктара МАГАТЭ — сваю крэатуру з нейтральных краін...

Тры гады пасля катастрофы унікальны эксперымент над беларускім народам адбываўся пад строгім сакрэтам. Успомніце, колькі было хлусні, як білі сябе ў грудзі, што няма ніякай радыяцыі, што радыяцыя бясшкодная; успомніце, як нахабна ілгалі на ўвесь свет розныя партыйныя бонзы і іх міністэрскія, медыцынскія паслугачы. Успомніце, як маскоўскі акадэмік Л. Ільін летам 1989 г. прывёз на Беларусь замежных экспертаў МАГАТЭ Бенінсона, Пелерэна, Уайта. Успомніце, што казалі нам у вочы гэтыя «эксперты». А ўспомніце чарнобыльскія мітынгі і шэсці Народнага фронту, а суды над арганізатарамі «Чарнобыльскага шляху», а праследаванні за праўдзівую інфармацыю пра нашае гора, а перашкоды чарнобыльскай праўдзе! Давайце задумаемся, што абаранялася гэтак ярасна і подла, што хавалася ад народа, якая таямніца, дзеля чаго?

На працягу амаль года мы ніяк не маглі праінфарміраваць свабодны свет пра нашу трагедыю. Уся інфармацыя ішла як у вату. Мы ж не ведалі, што выпрабоўвалі сілу міжнароднай атамнай мафіі, якая не зацікаўлена ў тым, каб грамадскасць Захаду ведала пра беларускую трагедыю. Бо калі б даведалася, тады эксперыменту мог бы прыйсці канец. Сёлета нам удалося прабіць «ваконца ў Еўропу». Па кропельках пайшла інфармацыя, у людзей на Захадзе пачалі раскрывацца вочы.

І тут занепакоілася МАГАТЭ. Спешна фармуецца каманда спецыялістаў, спешна дамаўляюцца яны з Саветам Міністраў СССР аб правядзенні «навуковай» экспертызы на забруджаных землях Беларусі. Праграму МАГАТЭ вырашана фінансаваць за кошт сродкаў чарнобыльскага фонду — 1,5 мільёна рублёў. Мы памятаем «круізы», памятаем,—куды пайшло паўмільёна рублёў з дабрачыннага рахунку № 904. Збірайце, людцы, па рубліку...

Удумаемся, што адбываецца. Па-першае, МАГАТЭ вырашыла з помпай правесці «навуковую экспертызу» і супакоіць грамадскасць. Маўляў, небяспека ёсць, але не ў такіх маштабах. Больш, маўляў, непакоіць псіхагенны фактар дэзінфармаванасці, што можа выклікаць рэцыдывы радыефобіі і г. д. Генеральны дырэктар МАГАТЭ спадар Блікс, юрыст па адукацыі, у сваім інтэрв'ю «Правде» і ў іншых выступах ужо даў зразумець, якога роду чакаюцца заключэнні «незалежных экспертаў».

Па-другое, ніякія даследаванні за адведзены «экспертам» час не дадуць іншых і больш дасканалых навуковых вынікаў, чым тыя, якімі ўжо сёння валодаюць вучоныя з АН БССР. Экспертная акцыя МАГАТЭ — прафанацыя. Тым не менш яна праводзіцца ды яшчэ і фінансуецца за наш кошт.

Гэтыя і іншыя думкі я выклаў у рэфераце, зачытаным мной на сімпозіуме «Жыццё пасля Чарнобыля», які адбыўся ў Берліне ў канцы чэрвеня гэтага года. Рэферат быў трансляваны таксама па радыё «Свабода», надрукаваны ў замежным друку. Вынік — пачуў у свой адрас чарговую порцыю, скажам мякка, «незадаволенасці». Нават камсамольская газета «Знамя юности» асцярожна кінула ў мяне свой камяк. Так і хочацца сказаць — людзі, што з вамі робіцца?

А спадар Блікс тым часам выступіў на сесіі Вярхоўнага Савета БССР у сваім завуаляваным стылі і сарваў апладысменты. Якая прадбачлівасць.

Нарэшце ўспомнім, як нам прыдумалі 35-бэрную канцэпцыю, каб прадаўжаць эксперымент. Пад націскам грамадскасці яе пахавалі (амаль пахавалі). Тады прыдумалі льготы тым, хто жыве там, дзе з-за радыяцыі жыць нельга. Далі павышаную аплату. Толькі каб ты там жыў, беларус, толькі каб затрымаць цябе на той смяртэльнай зямлі... І так будзе без канца, пакуль мы не зразумеем усё і не станем змагацца ўсімі цывілізаванымі сродкамі за сваю будучыню.

— Вярхоўны Савет прыняў Дэкларацыю аб дзяржаўным суверэнітэце БССР. Вашы адносіны да гэтага дакумента! Ці можна лічыць, што пасля прыняцця Дэкларацыі ўтварылася якасна новая сітуацыя! Чым яна вызначаецца, і ў якім напрамку будуць разгортвацца падзеі ў бліжэйшы час!

— Парадокс нашай сітуацыі ў тым, што дэкларацыю аб суверэнітэце вымушаны былі прымаць тыя, каму ён не патрэбны, хто пра гэты суверэнітэт дагэтуль ніколі не думаў...

Дэкларацыя ў цэлым мае шмат станоўчага. І калі б у нас была народная ўлада і адпаведны палітычны ўзровень насельніцтва, прыняцце такога дакумента азначала б надзвычай важную і станоўчую для народа падзею — дзяржаўную самастойнасць і незалежнасць ад СССР. У нашых жа варунках акт незалежнасці Беларусі ў асноўным ніхто не заўважыў і не зразумеў, у тым ліку і самі вярхоўныя заканадаўцы. Сітуацыя трагікамічная, якая сведчыць, што на сённяшні дзень Дэкларацыя — пустая паперка, не больш. Але ад нашага грамадства залежыць, якой яна стане потым. Дэкларацыя прынятая, і гэта факт. Цяпер беларускі народ мае магчымасць змагацца за рэальнае ажыццяўленне суверэнітэту рэспублікі.

— Нягледзячы на настойлівыя прапановы і нават патрабаванні, Вярхоўны Савет так і не зарэгістраваў Беларускі народны фронт. Чым вы гэта тлумачыце!

— Паталагічным страхам КПСС згубіць уладу. Пытанне аб рэгістрацыі БНФ, узнятае на сесіі 28 ліпеня, канчаткова не было вырашана. Памятаеце, аб'явілі перапынак, пасля якога многія дэпутаты-камуністы разбегліся і не стала кворуму. Закрыццё сесіі перанеслі на 31 ліпеня, а перад гэтым засядала бюро ЦК КПБ — рашалі, як закрыць сесію, каб не зарэгістраваць БНФ.

31 ліпеня на Прэзідыуме Вярхоўнага Савета я паставіў пытанне аб разглядзе маёй заявы пра рэгістрацыю БНФ, пададзенай яшчэ 10 ліпеня. У адказ Старшыня Вярхоўнага Савета і некаторыя члены Прэзідыума паказалі мне свае спіны.

Я ўжо казаў, што ў палітычным сэнсе рэгістрацыя БНФ нам цяпер не надта і патрэбна. Аднак яна неабходна для нармальнай жыццядзейнасці некаторых нашых структур, напрыклад, камітэту БНФ «Дзеці Чарнобыля».

— На заключным этапе сесіі парламенцкая фракцыя БНФ сцвердзіла сябе як апазіцыя. Што паўплывала на прыняцце такога рашэння! Якія мэты ставіць перад сабой апазіцыя, якімі сродкамі яна будзе дамагацца вырашэння сваіх задач! Наколькі перспектыўнай бачыцца дзейнасць у новых умовах!

— Апазіцыя неабходная, бо нельга несці палітычную адказнасць за тыя недэмакратычныя, часам проста непрафесійныя рашэнні, якія прымае камуністычна-наменклатурная большасць у Вярхоўным Савеце. Аднак патрэбен быў час, каб многія дэмакратычныя дэпутаты, што выйшлі ў апазіцыю, усвядомілі неабходнасць гэтага кроку. А пераканаліся яны тады, калі ўбачылі «столь» у дэмакратычным развіцці Вярхоўнага Савета. Перспектывы яго дэмакратызацыі хоць і не да канца, але ў асноўным вычарпаныя.

Наша апазіцыя мае канструктыўны характар. Гэта значыць, што яна будзе не толькі крытыкаваць палітычны кірунак і працу Вярхоўнага Савета, але і ствараць альтэрнатыўныя законапраекты, свае структуры, друк і г. д.

Перспектыва будзе залежаць, ад нас і ад дэмакратычных перамен у грамадстве, ад поспеху дэмакратычнага руху, ад рэалізацыі нашых мэт, галоўная з якіх на сённяшні дзень — Свабода і Незалежнасць Беларусі.

Гутарку вёў
Андрэй ГАНЧАРОЎ.

Здзіўляе, што да гэтага часу, калі злачынствы афіцыйна названы злачынствамі, рэспубліканскія ўлады сарамліва змякчаюць фармуліроўкі, масавае вынішчэнне лепшых людзей называюць бязадраснымі рэпрэсіямі.

Ва ўсіх краінах Усходняй і Заходняй Еўропы (і ў ФРГ) існуюць узаконеныя таварыствы і клубы былых вязняў фашысцкіх лагераў. А ў нас каторы год па невядомых прычынах, спасылаючыся на нейкія фармальныя ўмовы, наш шаноўны ўрад упарта не хоча зарэгістраваць «Мартыралог Беларусі», ігнаруе гэтую дабрачынную арганізацыю, нібыта нейкую сумніцельна-шкодную суполку. А як бы яна магла дапамагаць нямногім яшчэ жывым, абыдзеным дзяржаўнаю ўвагаю, недабіткам сталінскага тэрору! Яны па 10—15 і 20 гадоў здабывалі золата і вугаль, руду і мінералы ў Нарыльскай і Калымскай вечнай мерзлаце, валілі тайгу на артылерыйскі лафетнік, авіяцыйную фанеру і рудстойку, часалі ружэйную балванку для аўтаматаў. У сцюжу і ў дождж гарбелі па 12 гадзін за міску турнэпсавай баланды і паечку хлеба з вотруб'я.

Дзякаваць, што пасля XX з'езда большасць рэабілітавалі пасмяротна, а жывым выплацілі кампенсацыю ў памеры трохмесячнай зарплаты па даваенных стаўках. Вось і ўсё. Так лёгка разлічыліся за дзесяцігоддзі незаслужаных пакут. Ніхто не пакаяўся, ніхто не папрасіў прабачэння. Па лагерных «заробках» вызначалася пенсія. Да апошняга часу ўдава расстралянага ў Курапатах паэта Юркі Лявоннага, сама адбыўшы дзесяць гадоў у лагеры, атрымлівала 50 рублёў пенсіі і больш — ніякіх прывілеяў.

А тыя, што катавалі на допытах, судзілі, стралялі ў патыліцы, у часе Айчыннай вайны ўдасканальвалі сваё рамяство ў заградатрадах, у трыбуналах, у «смершах» і асобых аддзелах, былі перлюстратарамі балючых салдацкіх трыкутнікаў і за слова праўды (як Салжаніцына) здавалі аўтараў у трыбунал? Усе яны як удзельнікі Айчыннай вайны («участники ВОВ») карыстаюцца льготамі і прывілеямі, хоць і мізэрнымі палёгкамі ў чарзе нараўне з пакалечанымі акопнікамі. Былых гітлераўскіх катаў улады ФРГ і цяпер адшукваюць і караюць, на іх не распаўсюджваецца тэрмін даўнасці. А каго знайшлі, каго пакаралі з нашых прывілеяваных катаў? Усе яны персанальныя пенсіянеры і спажыўцы спецпайкоў. А рэабілітаваныя не маюць права на харчовыя талоны нароўні з працаўнікамі тылу. Яны на ўсё жыццё выпалі адусюль, засталіся сумніцельнымі істотамі без аблічча і біяграфіі, баяцца прызнацца, дзе былі ў часе вайны, застаюцца людзьмі апошняга гатунку.

А колькі іх засталося? Кожны дзень адыходзяць у вечнасць скалечаныя пакутнікі. «Мартыралог» мог бы ім дапамагчы на апошнім рубяжы, але і ён пакуль што «вне закона». Рана ці позна яго ўзаконяць, але не будзе ўжо каму памагаць.

...Я хаджу па Курапатах. Ці не ад куль не самых трапных «варашылаўскіх стралкоў» па карысці слязіцца смала. Але не дзеля эмоцый, не дзеля ўласных інтарэсаў (я ўсім задаволены і забяспечаны) я ўзяўся за пяро. Дачуўся, што абвешчаны конкурс на праект помніка «ахвярам масавых рэпрэсій». Што ўзнімецца на месцы таго валуна? Чарговы скульптурна-архітэктурны гібрыд, лепшы або горшы, але аднолькава немы і бяздзейсны? Колькі іх на нашай зямлі, як казаў дзед Талаш — «балваноў»?!

Я звяртаюся да ўсяе грамадскасці рэспублікі, да ўсіх рэлігійных абшчын і арганізацый, незалежна ад веравызнання, да ўсіх сумленных людзей з заклікам распачаць збор ахвяраванняў, каб на тым узгорку паставіць велічную калі не цярыву, дык капліцу з цэглы, а можа, лепей з тых соснаў, што ўзняліся з касцей маіх равеснікаў і аднапакутнікаў, каб на алтары гарэлі свечкі, спявалі хоры духоўнай музыкі, каб званы клікалі атэістаў і веруючых на гэтае святое месца.

Хачу верыць, што на гэтую прапанову адгукнуцца мастакі і архітэктары, скульптары і разьбяры, грамадскія і рэлігійныя аб'яднанні, увесь наш народ, бо няма, бадай, ніводнай сям'і, з якой каго-небудзь не праглынуў «чорны воран».

Лепшага помніка, вартага памяці закатаваных, я сабе не ўяўляю — помніка жывога, дзейснага, галоснага.

Думаю, што многія з рэабілітаваных пажадаюць, каб іх прах быў побач з безыменнымі магіламі сяброў па трагічным лёсе.

Веру — добрыя і сумленныя сэрцы адгукнуцца і падтрымаюць маю прапанову, зламаюць супраціўленне маўклівых, але актыўных абаронцаў трагедыі, падобнай якой не ведала чалавецтва.

Трэба спяшацца: сведкі тае жахлівае пары імкліва адыходзяць у незваротны шлях, а і яны хочуць запаліць свечку на алтары помніка, да якога ніколі не зарасце народная сцежка.

Сяргей ГРАХОЎСКІ,
былы вязень ГУЛАГа з 20-гадовым стажам.

ЗВАРОТ ДА БЕЛАРУСАЎ СВЕТУ

Братове! Дзеці зямлі беларускай!

Няпросты лёс, суровы час расцерушыў нас па абшарах свету. Пры збегу розных акалічнасцяў апынуліся мы за межамі роднай Беларусі. Але Бацькаўшчына неадольна нагадвае пра сябе родным словам і песняй, перажытым у маленстве, успрынятым ад дзядоў і бацькоў, засвоеным з кніг.

Шчымленнем у сэрцы адгукаюцца вечна жывыя Скарынавы словы пра любасць да таго кутка на зямлі, дзе чалавек з божае ласкі нарадзіўся. Але мы ўсведамляем сябе яшчэ і прыналежнымі да працавітага і мужнага народа, які прайшоў драматычны шлях, дзе была і слава, і нядоля.

Нашы продкі больш за тысячу гадоў назад заклалі падваліны ўласнай дзяржаўнасці, здолелі ўзвялічыць Полацкае княства да аднаго з самых моцных і цывілізаваных у старыжытнай Русі. Разам з ім ці пазней сцвярджалі сябе княствы Тураўскае і Пінскае, Гарадзенскае і Навагародскае, Смаленскае, Віцебскае, Мсціслаўскае і іншыя. На беларускіх землях са сталіцай у Навагародку зарадзілася Вялікае княства Літоўскае, якое вырасла ў магутную шматнацыянальную дзяржаву ад Балтыкі да Чорнага мора.

Абслугоўваючы ўсё грамадства, ад сялянскага да вялікакняскага двара, беларуская мова і культура дасягнулі тут за некалькі стагоддзяў вялікага ўздыму. Праз беларускае слова на землі ўсходніх славян ішла друкаваная кніга, на нашай жа мове быў створаны адзін з найбольш дасканалых на той час у свеце юрыдычных дакументаў — Статут Вялікага княства, многія іншыя выдатныя помнікі культуры.

Мы маглі б і надалей сцвярджаць сябе як цывілізаваная еўрапейская нацыя, але доля наканавала інакш: страта дзяржаўнасці, услед за чым пачалася актыўная дэнацыяналізацыя, прывяла да духоўнага заняпаду, выцяснення, а ўрэшце і забароны роднай мовы, да велізарных людскіх страт, спрычыненых бясконцымі войнамі, якія хваля за хваляй пракочваліся па беларускай зямлі, змушаючы яе сыноў класці галовы за чужыя інтарэсы.

Нягледзячы на цяжкі прэс, усё яшчэ да канца не спаняверaны народ нараджаў дбайных сейбітаў вечнага, мужных ваяроў, якія, як Францішак Багушэвіч і Кастусь Каліноўскі, словам і зброяй уздымалі людзей на святое змаганне за шчасце і волю.

Беларускі ўрад, грамадская атмасфера ў рэспубліцы спрыялі самавыяўленню беларусаў як на Бацькаўшчыне, так і за яе межамі, дзе яны мелі ўласныя зямляцтвы, розныя суполкі і згуртаванні, свае школы, тэатры, выданні і г. д.

І калі рэвалюцыйныя буры да падвалін устрасянулі Расійскую імперыю, беларусы былі ў ліку іншых народаў, што заявілі пра сваё неад'емнае права на незалежнае дзяржаўнае існаванне. Вынікам гэтага сталася абвяшчэнне Беларускай Народнай Рэспублікі, а потым утварэнне Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, якая напачатку развівалася як нацыянальна суверэнная дзяржава. У ёй за гады дваццатыя на вышыню ўзняліся культура і свядомасць народа, а беларуская мова зноў здабыла свае законныя правы на роднай зямлі.

Аднак потым для ўсіх народаў Савецкага Саюза надышлі змрочныя часы — і наша рэспубліка страціла свой рэальны суверэнітэт, трапіла пад дыктат таталітарнай дзяржавы і яе сістэмы—нацыянальна свядомыя кадры былі амаль цалкам вынішчаны, часткова дэмаралізаваны, а сялянства, якое спрадвеку жывіла нацыю, гвалтам пазбаўлена свайго трывалага грунту — зямлі і, па сутнасці, перастала існаваць як моцная грамадская сіла, захавальніца духоўных і маральных традыцый нацыі.

Трагедыю пагвалчанага народа яшчэ больш павялічыла вайна, якая забрала ў Беларусі кожнага чацвёртага.

Асабліва балюча ўсведамляць, што ўжо ў мірны час злая нядоля абрушыла на нас адно з найбольш цяжкіх, якое ведала чалавецтва, выпрабаванняў,—Чарнобыль.

Можна, вядома, з усім змірыцца, жыць у паняверцы і бяздзейнасці. Гэта доля слабых духам. Моцныя ж змагаюцца і выжываюць, гартуючы свой дух у нягодах. Мы сёння звяртаемся да ўсіх: актывізуймася! Няхай кожны знойдзе ў сабе столькі душэўных сіл, колькі мае і здольны аддаць на дабро роднаму народу, а, значыць, і сабе. Пачынаць трэба з сябе, але выратавацца мы можам толькі разам. Як ад чарнобыльскай бяды, так і ад духоўнага, культурнага, экалагічнага, маральнага і этычнага заняпаду, да якога наш народ ішоў праз стагоддзі, а потым дзесяцігоддзі паднявольнага існавання. Толькі стаўшы народам па сутнасці, а не па назве, мы здабудзем павагу іншых народаў, а сабе—права «людзьмі звацца».

Мы — гэта ўсе, у чыіх сэрцах жыве Беларусь незалежна ад таго, да якога месца чалавек прыпісаны. Бо Беларусь — гэта не толькі пэўная тэ[illegible]торыя, але і сімвал спрадвечнай Баць[illegible]шчыны, увасабленне мужнасці і пакут, нягод і трывання, праз якія прайшлі нашы продкі і што павінны пераадолець мы ў імя будучыні нашых дзяцей, у імя таго, каб Беларусь «заняла свой пачэсны пасад між народамі»...

Згуртаванне «Бацькаўшчына» заклікае гуртавацца ў сваіх шэрагах на грунце чалавечнасці, узаемапавагі і годнасці, вернасці бацькоўскім традыцыям, шанавання духоўных набыткаў роднага народа ўсіх людзей добрай волі, як аб'яднаных у суполкі і зямляцтвы, так і паасобных, усіх, каму дарагі лёс Беларусі.

Сваю задачу ўсведамляем найперш[illegible] тым, каб аб'яднаць беларусаў Савецкага Саюза, а потым і свету, стварыць каардынацыйны цэнтр і весці мэтанакіраваную працу па задавальненні культурна-асветных патрэб суайчыннікаў, спрыяць духоўнаму, нацыянальнаму адраджэнню ўсяго беларускага народа, палітычнаму і эканамічнаму суверэнітэту Беларусі.

Аргкамітэт згуртавання «Бацькаўшчына»

Шаноўны чытач!

Ты пазнаёміўся тут са Зваротам аргкамітэта па стварэнні згуртавання «Бацькаўшчына» да беларусаў свету, гэта значыць, да тых, што жывуць за межамі БССР. Але, мяркую, словы Звароту прамаўляюць і да карэнных насельнікаў Беларусі. Так ужо распарадзіўся няўдзячны лёс, а калі больш дакладна, дык рэальныя сілы, што на працягу стагоддзяў, а потым дзесяцігоддзяў праводзілі паслядоўную палітыку дэнацыяналізацыі, што і прывяло да становішча духоўных бесхацімцаў у сваёй жа роднай хаце, на сваёй роднай зямлі. Бо хіба ж утульна пачувалі сябе тыя, хто ўсвядомлена шанаваў і абараняў традыцыі і звычаі свайго народа, культуру і мову продкаў перад тымі, хто так нахабна драў горла пра інтэрнацыяналізм, а на самай справе рабіў усё для зліцця ўсіх культур і нацый у адзін кацёл. Да нядаўняга часу становішча непадатлівага да шавіністычнага чаду беларуса мала чым адрознівалася, а часам было і горшым ад ягоных суродзічаў, што ў розныя часы пакінулі Бацькаўшчыну і, зразумела, вымушаны былі прыстасоўвацца да чужамоўнага і чужароднага атачэння, адаптавацца і інтэгравацца ў тамтэйшае атачэнне.

Справы, дзякаваць Богу, мяняюцца на лепшае. Толькі што прынятая Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце Беларусі нарэшце дае магчымасць беларускаму народу стаць гаспадаром на ўласнай зямлі. Але як далёка ў жыцці, а тым больш у палітыцы, ад добрых слоў да іх рэальнага напаўнення і ажыццяўлення. Пра гэта з глыбокім усведамленнем і заклапочанасцю гаварыў нядаўна ў «ЛіМе» Васіль Быкаў, гэта ж, толькі з іншага боку, пацвердзіў у «Аргументах і фактах» член Прэзідэнцкага савета, міністр унутраных спраў СССР В. Бакацін. Адказваючы на пастаўленае карэспандэнтам «АиФа» пытанне наконт прынятых некаторымі рэспублікамі дэкларацый аб суверэнітэце, Бакацін зазначыў, што ёсць рэальная прэзідэнцкая ўлада, адпаведныя ўказы, «а заявления, декларации о намерениях — это всего лишь намерения».

З міністрам унутраных спраў СССР можна хіба толькі пагадзіцца там, дзе справа датычыць аховы правапарадку ў тых рэгіёнах, дзе на месцах не могуць, не хочуць ці пакуль што не маюць рэальных магчымасцяў захаваць яго самі. Але нельга, ківаючы на гэта, адбіраць у народа правы на яго самыя запаветныя спадзяванні і намеры.

Каб намеры, выказаныя ў дэкларацыі, сталі рэальнасцю, патрэбны не толькі намаганні дзяржаўных, афіцыйных органаў у кожнай рэспубліцы, якія будуць увасабляць словы ў жыццё. Неабходна яшчэ і ўзрушэнне сэрцаў, душаў, актывізацыя розумаў, усведамленне ўсяго народа, што суверэнітэт нам сапраўды патрэбен, што мы дараслі, зноў дараслі пасля пэўнага здранцвення да таго, каб жыць у свабоднай і незалежнай дзяржаве, быць дбайнымі гаспадарамі на роднай зямлі, мець пачуццё ўласнай годнасці, шанаваць здабытыя народам на працягу стагоддзяў духоўныя скарбы, найдаражэйшым з якіх з'яўляецца мова.

Ці хутка такое здарыцца на нашай зямлі, ці стане яна некалі такой жа дбайна абжытай, як, скажам, зямля Фінляндыі, Бельгіі, Швецыі?..

Шмат работы наперадзе і нашым душам, і розумам, і рукам! Дапамагчы нам у гэтым могуць нашы суайчыннікі, якія жывуць у цывілізаваных краінах, набылі там вопыт і веды. Разам з гэтым, спазнаючы чужое, не загубілі, не растрацілі сваё, хоць рабіць ім гэта было і нялёгка. І хіба не пабагацелі мы душэўна, калі нарэшце пачулі беларускага спевака Данчыка з ЗША, а потым пабачылі выступленні фальклорнага гурта «Васілёк» пад кіраўніцтвам Вольгі Орса-Рамана? А як бы пашырылася наша ўяўленне пра магчымасці беларускага пазтычнага слова, калі б мы ў сябе дома выдалі напісанае на розных паралелях Наталляй Арсенневай, іншымі літаратарамі-эмігрантамі!

Гэта што датычыць спраў духоўных і душэўных. Але ж хіба не можа дапамагчы нам эміграцыя (не толькі беларуская, але і яўрэйская, польская, татарская, руская, сваімі каранямі павязаная з Беларуссю, бо чорны цень Чарнобыля ўсіх нас аднолькава закрануў і прысыпаў радыеактыўным пылам) у змаганні з гэтай найцяжэйшай на сёння бядой? Можа, і дапамагае ў меру сваіх сіл і маральнага абавязку перад роднай зямлёй. І прыклад айца Аляксандра Надсана — найлепшае таму пацвярджэнне. Зноў, не зважаючы на лаянку і бруд, што высачыліся былі з вуснаў усім вядомай Т. Бумажковай, ён працягваў збіраць у Англіі ахвяраванні на чарнобыльскую бяду і днямі прыязджаў у Мінск з аўтафургонам лекаў.

Калі б мы ўмелі жыць палюдску са сваёй эміграцыяй, яна шмат у чым здолела б нам дапамагчы. І яе вопыт асабліва прыдаўся б цяпер, калі Беларусь пераходзіць да эканамічнай самастойнасці. Каб мы мелі шчырых і кампетэнтных дарадцаў, дык, напэўна б, не мелі б такіх прыкрых недарэчнасцяў, як гэта здарылася з будаўніцтвам скуранога завода пад Мінскам у Гатаве...

Ды што казаць пра адносіны да эміграцыі з капіталістычных краін, пра што да нядаўняга часу нават гаварыць было грэшна. Хіба мы па-братэрску аднесліся да беларусаў у Польшчы, якіх там жыве каля паўмільёна? Немалы ж, калі на сусветныя меркі, народ! А згадайце, якія перадачы па Цэнтральным ці рэспубліканскім тэлебачанні, дзе б паказвалі і расказвалі, як яны там жывуць, па якіх традыцыях ладзяць сваё жыццё, якім багам пакланяюцца і г. д.?! Нічога падобнага не было. А вось пра якое-небудзь экзатычнае афрыканскае ці азіяцкае племя можна было паглядзець, пачуць і пачытаць не адзін раз! А ці ж прыйшлі мы на дапамогу беластоцкім беларусам, скажам, у той час, калі малойцы ўрываліся ў друкарню, хочучы гвалтам спыніць выданне «Нівы»? Не, не прыйшлі, а і самі салідарызаваліся з найбольш шавіністычна настроенымі салідарнікамі, спыніўшы доступ газеты ў БССР. Дарэчы, «Ніва» зноў да сваіх падпісчыкаў у БССР не трапляе, але выглядае, што гэта і цяпер асабліва нікога і не хвалюе...

Можна было шмат казаць, як мы, гэта значыць, рэспубліка, адкінулі ад сябе беларусаў, што жылі і жывуць і ў межах СССР. Хто адкажа, як гэта так сталася, што Вільня і Віленшчына, якая стольні давала культурных, актыўна дзейсных для беларускай справы людзей і перад рэвалюцыяй, і асабліва ў міжваенны час, раптам нібы здранцвела, страціла сваю беларускасць? Сёння ўжо тыя раёны, якія жывілі беларускае Адраджэнне, дамагаюцца польскай аўтаноміі, хоць дзярэўкі і цёткі, якія жывуць па вёсках, гавораць на той самай мове, што і вясковцы ў БССР. А справа ў тым, што ўсё свядома беларускае тут было вынішчана, прыдушана ці застрашана, а за просты вясковы люд актыўна змагаўся і польскі касцёл. І свядомыя польскія патрыёты, галоўным аргументам у якіх быў такі: калі католік — значыць паляк! Аргумент гэты аднолькавую сілу мае як на Беласточчыне, так і ў Беларусі, і на Віленшчыне! І вось вынік: у Вільні, дзе ў заходнебеларускі перыяд выдаваліся дзесяткі газет і часопісаў, пасля вайны нават дзеля прыліку не засталося якога-небудзь маленечкага газетнага лістка!..

Заглушылі беларускае жыццё і ў Латвіі, дзе таксама былі і свае выданні, і свае гімназіі, і свае тэатры.

А ці шмат хто сёння дасць веры, што на тэрыторыі РСФСР у дваццатыя гады існавала каля паўтысячы беларускіх школ, што студэнты Масквы выдавалі часопісы на беларускай мове?

Па ўсім і ўсіх праехалася цяжкое кола сталінізму. Але жывое заўсёды цягнецца да жыцця, да сонца. Вецер перамен, абнаўлення, нацыянальнага адраджэння не абмінуў беларусаў, што жывуць у розных канцах неабсяжнай краіны. Іх галасы ўсё часцей гучаць са старонак беларускай перыёдыкі, а самі яны імкнуцца да супольніцтва ў тых месцах, дзе жывуць разам. Існуе дзесяць зафіксаваных пры фондзе беларускай культуры зямляцтваў, у некаторых месцах ёсць афіцыйна незарэгістраваныя таварыствы. Колькі іх — пакуль што невядома, бо дасюль не было агульнанацыянальнага цэнтра, які б каардынаваў дзейнасць усіх беларускіх суполак, які б ведаў, чым яны жывуць, якой дапамогі патрабуюць. Менавіта з адчування патрэбы гэтага і ўзнік Аргкамітэт згуртавання «Бацькаўшчына». У яго складзе значныя інтэлектуальныя, грамадска-культурныя, навуковыя і творчыя сілы. Не буду даваць паіменнага пераліку, а назаву арганізацыі, таварыствы, установы, якія выказалі жаданне быць фундатарамі-заснавальнікамі «Бацькаўшчыны». Сярод іх — Акадэмія навук БССР і Белдзяржуніверсітэт імя У. І. Леніна, Саюз пісьменнікаў Беларусі і Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны. Беларускі фонд культуры і Беларускі сацыяльна-экалагічны Саюз «Чарнобыль», Тэатральна-мастацкі інстытут і Беларускі тэхналагічны інстытут імя С. М. Кірава, выдавецтвы «Мастацкая літаратура», «Беларусь» і, безумоўна, тыднёвік «Літаратура і мастацтва», які за апошнія гады шмат зрабіў для кансалідацыі і духоўнага адраджэння народа, гасцінна аддаючы месца на сваіх старонках аўтарам, што жывуць за межамі Беларусі. Рады мы былі б бачыць далучанымі да высакароднай ідэі адраджэння і кансалідацыі беларускага народа прадпрыемствы і калгасы, бо, напэўна, сярод іх кіраўнікоў і ўвогуле працоўных калектываў нямала людзей з шырокім поглядам на свет...

І вось мы падышлі да Устаноўчай канферэнцыі нашага згуртавання, якая мае адбыцца ў Доме літаратара (Мінск, Фрунзе, 5) 10 верасня, гэта значыць адразу ж пасля завяршэння скарынаўскіх свят, на якія з'едуцца людзі здалёку і зблізку. Многія госці адначасова будуць і дэлегатамі канферэнцыі. Апрача гэтага, зразумела, мы запрашаем людзей знарок на гэты сход, які павінен мець важнае грамадскае значэнне. Да тых, хто не атрымае нашых індывідуальных запрашэнняў, мы звяртаемся праз газету: ласкава просім, прыязджайце, будзем рады сустрэць і, як кажуць, без ветлівага слова і страхі над галавой не пакінем. Але разумеем цяжкасці, звязаныя з далёкай дарогай. Таму просім вас, шаноўныя чытачы, адказаць на некалькі пытанняў, звернутых да вас, і такім чынам далучыцца да той справы, якой мы сябе прысвяцілі на гэтым адрэзку часу.

1. Ці ўхваляеце Вы ідэю згуртавання беларусаў Савецкага Саюза і, шырэй, усяго свету?

2. У чым бачыце сэнс і прызначэнне гэтага згуртавання?

3. Ці вядомы Вам у тым месцы (горад, вобласць, раён), дзе Вы жывяце, землякі, якія б маглі стварыць суполку (зямляцтва) і ўвайсці з ёй у шэрагі згуртавання?

4. Ці можаце звярнуцца праз сродкі масавай інфармацыі з паведамленнем пра ідэю стварэння згуртавання і яго мясцовага аддзялення ў Вашым рэгіёне?

5. Якую б канкрэтна дапамогу ад «Бацькаўшчыны» хацелі б мець?

6. Ці хацелі б і ці змаглі б асабіста Вы ці яшчэ хто прыехаць на скарынаўскія святы і Устаноўчую канферэнцыю згуртавання «Бацькаўшчына»?

Ласкавая просьба не затрымлівацца з адказам, дасылаць яго на адрас «Літаратуры і мастацтва» з паметкай «Бацькаўшчына».

Адначасова падаю рахунак № 700510 у Белжылсацбанку і валютны рахунак 000700704 у Знешгандальбанку СССР з паметкай Аргкамітэту «Бацькаўшчына», па якіх установы і прыватныя асобы могуць пералічыць сродкі на правядзенне Устаноўчай канферэнцыі і далейшую працу згуртавання «Бацькаўшчына».

Яўген ЛЕЦКА,
старшыня Аргкамітэта.

...580 гадоў назад полацкая, пінская, наваградская, віцебская, менская, мсціслаўская, берасцейская, іншыя харугвы прыйшлі сюды, каб паставіць кропку ў двухвяковым змаганні з нямецкімі крыжакамі. 15 ліпеня гэтага года беларускія харугвы зноў луналі над Грунвальдскім полем—на Ягайлавым пагорку, ля помніка героям. Зялёная віцебская, чырвоная менская, бел-чырвона-бел-чырвона-белая наваградская, сіняя берасцейская... І ўсе — з узброеным рыцарам на кані, з нашай святою Пагоняй.

Анатоль СІДАРЭВІЧ

Роздум пасля Грунвальда, або Вяртанне да артыкула «ЦІ БУДЗЕМ МЫ НАЦЫЯЙ?»

МОЙ КАЛЕГА — Уладзімеж Казімерчак з каталіцкага «Słowa Powszechnego» — сказаў, што прыезд беларусаў на ўрачыстасць быў «Zaskoczeniem», неспадзяванкай. Што прыедуць літоўцы — у гэтым сумнення не было.

Урачыстыя хвіліны Святое Мшы. Урачыстыя хвіліны ўскладання вянкоў. Прэзідэнт Рэспублікі Войцех Ярузельскі... Бачу Вітаўтаса Ландсбергіса, Рамуальдаса Озаласа... Прыкра, балюча, сорамна: наш Вярхоўны Савет забыў пра герояў. Дэпутат Васіль Шачак прыехаў як прыватная асоба — з намі ў аўтобусе, а дэпутат Анатоль Лябедзька — у аўтобусе разам... з літоўцамі.

Прамаўляе Войцех Ярузельскі. Згадвае палякаў, літоўцаў, чэхаў і... расіянаў. Польскія сябры, якія ведаюць гісторыю, нібыта просяць прабачэння за Прэзідэнта. А я нічога кепскага ў яго прамове не бачу: генерал выхаваны на старых падручніках*. Мне крыўдна за ўрад маёй рэспублікі, за афіцыйных ідэолагаў, якія не шануюць памяць продкаў, абылгалі наш спрадвечны герб і сцяг, якія не шануюць годнасць свайго народа і — ergo — сваю годнасць. Калі б прыехала афіцыйная дэлегацыя Вярхоўнага Савета і ўрада, была б у прамове Прэзідэнта згадка і пра беларусаў. (16 ліпеня «Trybuna» ўсё-такі напісала: «Тысячы палякаў, літоўцаў і беларусаў сталі на ўзгорку вакол помніка».)

Поле слухала літоўскую мову. Поле не пачула мовы майго народа. Але хто з кіраўнікоў рэспублікі ўмее размаўляць па-беларуску? Хіба што прафесар Шушкевіч. Уявім, што прыехаў бы нехта іншы і адважыўся б прачытаць загадзя напісаны тэкст. Ото было б сораму!.. Тут жа стаіць пан Чэслаў Сенюх, перакладчык нашай літаратуры.

Нацыянальная ідэя, пра якую піша ў «ЛіМ» чытач з Ноўгарада Алесь Шчэрбін, чужая нашаму апарату. Калі б хоць трохі была блізкая, не хаваў бы ён тры гады праўду пра Чарнобыль. А тут нейкі Грунвальд. Добра, што БНФ загаварыў пра Чарнобыль, добра, што ЦК ЛКСМБ і БНФ не забылі пра Грунвальд.

Палякі пыталіся: што вы сабе думаеце? Ці думаеце вы пра годнае месца ў еўрапейскім доме? Калі ваш урад пачне паважаць сябе? Нехта кажа: у Люблінскім каталіцкім універсітэце пачынае працу кафедра беларускай мовы, а як з дзяржаўнай мовай на Беларусі?

...Прыехаўшы ў Мінск, прачытаў у лімаўскай пошце: «У Канцэлярыі ўрада не знайшлося месца ні адукацыі, ні культуры, ні якойсьці там беларускай мове. Парламент наогул галасуе супраць беларускай мовы. Парадаксальная сітуацыя! Дземянцей разважае пра суверэнітэт Беларусі. Але ці будзе гэты суверэнітэт сапраўды, калі фактычнай дзяржаўнай мовай будзе руская? Не! Гэта трэба зразумець зараз...» (Дзмітрый Абрамычаў, студэнт Мінскага педінстытута).

«Русіфікацыя закранула палякаў у той самай ступені, што і беларусаў...» (Ежы Вашкевіч, намеснік старшыні Польскага культурна-асветнага таварыства «Polonia» ў Мінску).

Мне сорамна слухаць мой парламент. Каб хоць руская мова была ў вуснах дэпутатаў рускаю... Хіба што айцец Віктар, ягоны цёзка Віктар Ганчар ды яшчэ хто з маладзейшых дэпутатаў-дэмакратаў валодаюць ёю.

...З ГРУНВАЛЬДА мы прыехалі ў Ольштын. Тут працуе выдавецтва «Pojezierze», якое на пачатку 80-х выпусціла «Пана Тадэвуша» ў перакладзе Браніслава Тарашкевіча. Тут жыве і працуе пан Мечыслаў Яцкевіч, перакладчык нашай і літоўскай літаратуры, з якім я добра гутарыў у чэрвені ў Вільні. Пан Мечыслаў добра разумее нашы праблемы. Маючы звычку пасылаць дамоў паштоўкі з відамі таго горада, дзе ён зараз знаходзіцца, перакладчык аднаго разу падышоў да кіёска ў Мінску і папрасіў «вось тую паштоўку». І пачуў ад кіяскёркі: «Ишь, какой националист выискался!»

Тое было, калі не памыляюся, у 1987-ым. У чэрвені 1990-га мы хадзілі з панам Мечыславам па Вільні. Тут ён мог пачувацца спакойна — тут ніхто не назве яго нацыяналістам за тое, што ён размаўляе па-літоўску.

Не ведаў, што буду ў Ольштыне, не ўзяў з сабою запісную кніжку. Шкадую, што не змог сустрэцца з панам Мечыславам.

Нас прынялі жаўнеры Войска Польскага. Прынялі шчыра, добра. Сустрэў земляка — былога афіцэра, а цяпер фермера, рольніка. Гаворка была і пра аб'яднанне Германіі. Палякі помняць мінуўшчыну. Палякі памятаюць Грунвальд. Яны спадзяюцца, што і мы нічога не забылі.

(Праз тыдзень пачую, што ў Гдыні знялі помнік савецкім воінам. Ведаю: разам з вызваленнем у Польшчу прыйшоў сталінізм. Але пры чым тут салдаты? Пасля вайны яны самі нацярпеліся ад дыктатуры. Мой дзядзька загінуў недзе ў Прусіі «за вашу і нашу волю»...

Не, не ўсе палякі памятаюць гісторыю...).

У казарме сядзелі ля тэлевізара: цікава было, як пакажуць святкаванне на Грунвальдскім полі. Мільгнуў бел-чырвона-белы сцяг, на мгненне з'явілася віцебская харугва. Доўга лунаў на экране сцяг Літоўскай Рэспублікі. У канцы праграмы «Wiadomości» — паведамленне аб пажары пад Сямяцічамі. Абвяшчаецца агульнакраёвы збор сродкаў, падаецца нумар рахунка.

...На Беласточчыне знішчаюць цэрквы.

Царква Марыі Магдалены ў Беластоку.

Святыня ў Нарве.

У Крыначцы жаўнеры паламалі капліцу, а ў святую крыніцу накідалі ламачча.

І вось капліца на Святой гары пад Сямяцічамі (іначай — на Грабарцы).

Польскае тэлебачанне не сказала, але ад беластоцкіх беларусаў я пачуў, што ў ноч з 12 на 13 ліпеня святыню спаліў злодзей-рэцыдывіст, якога на пэўны час выпусцілі з вязніцы.

...Прыеду ў Мінск і прачытаю пра свой артыкул у «ЛіМе» за 29 чэрвеня г. г.: «Больш шавіністычнага, больш варожага да палякаў, Польшчы і палякаў у БССР не бачыў, але і бачу, што ўвесь склад рэдакцыі і газета з'яўляюцца антыпольскім ваяўнічым рупарам. Значыць, узяліся змагацца з тымі, каго пазбавілі роднай мовы, дарэчы, нізка нахіляючыся перад рускім панам, і сваю страцілі, пазбавілі сваёй гісторыі, зруйнавалі помнікі нашай культуры, а зараз, калі ўбачылі, што не ўсё знішчана, і далей правакуецца да нас варожасць з боку прадстаўнікоў іншых народаў...» (капітан 2 рангу А. Якаўлеў, Йашкар-Ала).

Думаецца, што аўтар ліста няправільна ўжыў слова «правакаваць»...

...Паколькі палякі з'яўляюцца пераважна рыма-каталікамі, украінцы — грэка-каталікамі, беларусы ў Польшчы маюць духоўнае апірышча ў праваслаўі. Святая гара для іх тое ж, што святыні Чанстаховы для палякаў. Палякі сваімі дзеяннямі правакуюць нянавісць да сябе з боку беларусаў. Я чуў ад іх такія словы, якія ніколі не паўтару ані пісьмова, ані вусна. Гэта маладыя, адукаваныя людзі, якія вызнаюць Бога і Беларусь. Падобна на тое, што выпрабоўваецца іх хрысціянскае цярпенне.

Пра гэта я думаў на Грунвальдскім полі. І вось чытаю ліст А. Якаўлева. Ён, праўда, не абвінавачвае мяне ў фашызме, як нейкі Ігар Аллік з Баранавічаў (ведаю, што ён эстонец і каратыст). Аллік так захапіўся, што зблытаў Наталлю Арсенневу з Надзеяй Абрамавай, а Францішка Кушаля з Барысам Рагулем, «ЛіМ» параўнаў з «Литературной Россией», а абедзве газеты з — «Фёлькішэр бэобахтэр». Я маўчу пра тон пісьма (мае сябры эстонцы пачырванелі б), але мушу нагадаць пану Алліку: «Литературная Россия», «Наш современник» і інш. выданні вінавацяць за беды рускага народа адну нацыю, адзін народ, а я не саромеюся і сваіх братоў беларусаў уесці. І не палякаў і рускіх я крытыкую, а клер, ідэолагаў і г. д. Але вернемся да ліста А. Якаўлева. Хто пазбавіў вас роднае мовы? Хто разбурыў вашы помнікі? Ці не тыя дзеячы, што разбурылі ўсё: цэрквы і касцёлы, сінагогі і мячэці? Ці не тыя, хто знішчаў і палохаў тэрорам беларускую інтэлігенцыю? Ці не тыя, хто зачыняў беларускія школы гэтак, як яўрэйскія і польскія? Ці не тыя, хто пакінуў на Беларусі тры беларускія тэатры? Ці не тыя, хто на пачатку 80-х рушыў у Мінску наш першы тэатр, у якім ставілі «Сялянку» Станіслава Манюшкі і Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча? Ці не тыя, хто загадаў хапаць маладых людзей, якія выйшлі, каб выказаць свой пратэст? Ці не тыя, хто правёў побач з помнікамі гісторыі і культуры лінію метро? Якое ж дачыненне да беларускай культуры, да культуры наогул яны маюць?

Заўважу: нешта я не бачыў у тых пікетах działaczy polonijnych, нешта я не чуў на мітынгах іх прамоў, хоць і Марцінкевіч, і Манюшка належаць абедзвюм нашым культурам. Баранілі помнікі выключна беларускія «шавіністы». Ці не за гэтую маўклівасць любяць польскіх актывістаў начальнікі і ў Мінску, і ў Гародні, і ў Берасці? Польскія таварыствы рэгіструюцца вокамгненна, а вось беларускіх аніяк не ўпісваюцца ў законы.

У ПАЛЯКАЎ ёсць апірышча—Польшча. Уключыў прыёмнік — і слухай 1-ую праграму Польскага радыё, уключыў — і слухай радыё «Polonia». А ў нас? Уключыў радыё — і слухай, як дэпутаты засыпаюць адукаванага Лявона Баршчэўскага, які ведае і беларускую, і рускую, і польскую, і літоўскую, і ідыш — мовы народаў Беларусі. Засыпаюць дзеля таго, каб не абраць яго на пасаду старшыні Камісіі па нацыянальнай палітыцы і міжнацыянальных адносінах. Яму ўпікаюць, што ён — рускі. І абіраюць старшынёю беларуса, які не гаворыць па-беларуску, па-польску, па-літоўску, на ідыш. У вас, палякаў, ёсць апірышча. А нам да каго кінуцца? Мы ж самі пачуваемся эмігрантамі ў сваёй краіне. Якую ж дапамогу знойдуць тут нашы эмігранты, а таксама беларусы, што жывуць на Беласточчыне?

Адзін вельмі шаноўны паляк са спагадаю пісаў, што беларусам «дадзена... як злоўленай рыбіне, выбіраць паміж патэльняй і гаршком, г. зн. паміж паланізацыяй і русіфікацыяй». Завуць гэтага паляка Чэслаў Мілаш. Гэта наша наканаванне—увесь час змагацца за аўтэнтычнасць. Пры цары, пры Польшчы, пры Саветах. А вы, пане Якаўлеў, кажаце пра шавінізм. Мы век баронімся, а шавінізм — з'ява агрэсіўная, якая валодае сілаю. Не маральнаю, не духоўнаю, а найперш мілітарнаю, адміністрацыйна-паліцэйскаю.

Чалавек, які з маленства больш-менш ведае польскую мову, які падлеткам чытаў пра Мешка і Баляслава Харобрага, які юнаком зачытваўся Міцкевічам, Жаромскім, Прусам, Сянкевічам, я ўсё ж дазволю сабе не згадзіцца з п. Ежы Вашкевічам, які ўпікае мне адсутнасць здаровага клёку, бо «пра планаваныя прэтэнзіі палякаў да Беларусі» пішу, але канкрэтыкі на гэты конт не даю. Пану Ежы я раіў бы ўважліва чытаць тэкст. Там гаворка ідзе пра неапілсудчыкаў. «Młodzież Walcząca» — вось тая арганізацыя, якая мае свае філіі ў Гародні, Вільні і Львове. А Канфедэрацыя незалежнае Польшчы? А эміграцыйны ўрад у Лондане? І не толькі ім мроіцца «рыжская мяжа». А калі ўсе гэтыя сілы прыйдуць да ўлады?

Вось што мяне турбуе. Турбуе мяне і тое, што нашы суайчыннікі-палякі імкнуцца павялічыць колькасць сваіх адзінакроўных братоў за кошт залічэння ў лік палякаў беларусаў рымска-каталіцкага вызнання. Здаецца, я, абапіраючыся на статыстычныя звесткі, паказаў долю католікаў і палякаў у структуры насельніцтва Беларусі на розных этапах гісторыі.

Вельмі шкадую, што мой артыкул надрукаваны ў час майго побыту ў Вільні. Калі б я вычытваў карэктуру, туды не трапіла б прыкрая памылка: атрымалася, што В. Ластоўскі стаў камуністам. На самай справе ў 1919 г. палякі кінулі яго ў турму. Камуністам стаў другі эсэр — У. Ігнатоўскі, аўтар падручніка «Кароткі нарыс гісторыі Беларусі», забароненага спачатку польскімі ўладамі, а потым бальшавікамі. Нагадаю, што ўсе названыя ў артыкуле вязні польскіх турмаў (Ластоўскі, Краўцоў, Бабарэка, Лагіновіч, Луцкевіч) сталі потым ахвярамі сталінскага тэрору. Да беларускіх незалежнікаў ставіліся як да ворагаў і пілсудчыкі, і сталіністы. Ніхто не можа аспрэчыць гэты факт.

Ніхто з маіх апанентаў не можа аспрэчыць і статыстычныя звесткі. Але, паўтараю, я шкадую, што толькі нядаўна мне ўдалося пазнаёміцца з вынікамі перапісу, праведзенага ў час першай сусветнай вайны нямецкімі ўладамі. Нагадаю, што Нямеччына вяла палітыку «падзяляй і ўладарнічай»: яна не замінала дзейнасці беларускіх, польскіх, літоўскіх, яўрэй-

(Працяг на стар. 12).

Прэзідэнт Рэспублікі Польшча В. ЯРУЗЕЛЬСКІ і Старшыня Вярхоўнага Савета Літвы В. ЛАНДСБЕРГІС на Грунвальдскім полі.

*Атрымаў сёмы нумар часопіса «Вильнюс». Там у артыкуле да 580-й гадавіны Грунвальдскай бітвы таксама выяўляецца любоў да старых падручнікаў: з публікацыі даведваемся, што пад Грунвальдам змагаліся «литовцы, поляки и русские».

Кніганіс

Ю. СВІРКА. Кружка з пясчаным дном. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1990.

«Бібліятэка беларускай паэзіі» папоўнілася зборнікам лірыкі Юрася Свіркі — паэта, маленства якога супала з Вялікай Айчыннай вайной. Зразумела, што водгулле тых падзей знайшло сваё адлюстраванне ў асобных творах аўтара. Акрамя таго, на старонках кніжкі чытач сустрэне вершы-роздум аб нашым хуткаплынным часе, паэтычныя радкі, прасякнутыя любоўю да Бацькаўшчыны.

У. КАВАЛЕНАК. Радзіма крылы дала. На рускай мове. Мінск, «Юнацтва», 1989.

У дакументальнай аповесці, адрасаванай у першую чаргу старшакласнікам, лётчык-касманаўт Уладзімір Кавалёнак падрабязна ўзнаўляе асноўныя моманты свайго шляху, што прывёў яго да зорак. Гаворыцца аб падрыхтоўцы касманаўтаў, тых асноўных задачах, што стаяць перад пакаральнікамі Сусвету.

А. МАРЦІНОВІЧ. Сказаць сваё слова. На англійскай, нямецкай і французскай мовах. Мінск, «Беларусь», 1990.

Аўтар падрабязна расказвае пра сённяшні стан маладой беларускай літаратуры. Выданне адрасавана замежным чытачам, таму А. Марціновіч запыняе ўвагу на ўсіх найбольш значных творах паэзіі, прозы, крытыкі, драматургіі, а таксама кнігах для дзяцей. Адначасова расказваецца аб рабоце літаратурных аб'яднанняў рэспублікі.

А. КАЗАННІКАЎ. А зязюля кувала... Аповесць, апавяданні. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1989.

У аднайменнай аповесці пісьменнік асэнсоўвае пасляваеннае жыццё вёскі, на прыкладзе простай жанчыны Таццяны Макарэц паказвае, якім цяжкім і складаным было яно. Апавяданні «Жураўліха» і «Чужыя» — таксама спроба аўтара па-свойму ўгледзецца ў вобраз сучасніка, высветліць, наколькі трывалыя ў іх маральныя карані.

Чытаючы часопіс

ШЛЯХ да азарэння

ЦЯПЕР, калі мы нарэшце займелі права па-новаму глянуць на сваю гісторыю, пераасэнсаваць тыя моманты ў ёй, што часам выклікалі ўнутранае пярэчанне, але пра якія проста не прынята было гаварыць, найпершая і разам з тым ці не самая ўдзячная задача пісьменніка паспрабаваць падысці як мага больш прынцыпова да ўсіх гэтых няпростых працэсаў, сказаць пра іх важкае, праўдзівае слова. Гэта і робіць у новай аповесці «Праклятая любоў», надрукаванай у пятым нумары часопіса «Полымя», Алесь Жук.

Адразу мушу засведчыць, што яна добра стасуецца да папярэдніх твораў пісьменніка, такіх, скажам, як аповесці «Халодная птушка» і «Паляванне на апошняга жураўля». Канечне, у іх аўтар вымушаны быў пра набалелае гаварыць завуалявана, штосьці нават не дагаворваць. Але разам з тым нельга не заўважыць, што менавіта ў гэтых творах А. Жук засяродзіўся на шмат якіх набалелых у грамадстве праблемах.

Тут і непрыкаянасць старых людзей у вёсцы, калі духоўныя каранні падарваны, а на новым месцы, найперш у горадзе, так цяжка душы даваць маладыя парасткі. І валюнтарызм кіраўніцтва, якое не хоча, не жадае, а па сутнасці і не можа зразумець тых, хто спрадвеку жыў на зямлі. Не можа, бо глядзіць на ўсё са званіцы сваіх адміністрацыйных інтарэсаў, прытрымліваецца голай, я б сказаў, неадушаўлёнай ідэі, забываючы, што і сама ідэя гэтая, і самыя найлепшыя памкненні без чалавека — нішто.

Ды і шмат што іншае, пра што ўжо загаварылі на поўны голас, бачыцца ў згаданых аповесцях, калі іх перачытваюць з пазіцыі сённяшняга дня. Але ўсё гэтае важнае, надзённае, набалелае, што было і ў «Халоднай птушцы», ў «Паляванні на апошняга жураўля», у «Праклятай любові» паўстае ў больш шырокім, аб'ёмным ракурсе. Не, гэта не паўтор пісьменнікам знаёмых сюжэтных хадоў, у нечым падобных жыццёвых лёсаў, а само жыццё, без традыцыйнага падзелу на станоўчае і адмоўнае. Гэта тая праўда жыцця, наколькі яе здатны адчуць і раскрыць аўтар. Нарэшце, гэта мастацкая праўда, якая вызвалілася з-пад дыктату аглядкавасці, забароненасці. І сам боль вёскі, даведзенай да ручкі, але якая ўсё ж жыве, застаецца прыстанішчам духоўнасці, усяго здаровага і моцнага.

Праўда, яно, каб выжыць, павінна прабівацца скрозь падман, хлусню і абыякавасць. Цяжка і галоўнаму герою аповесці калгаснаму механізатару, а цяпер пенсіянеру Яну Кулешу. Хоць нялёгка, нясоладка і раней было, асабліва тады, калі «пабігы, ледзьве душа ў целе, але жывы вярнуўся» з фронту. Ды і пазней, калі на ногі стаў, сям'ёй абзавёўся: «мабыць, доля яго такая — усё быццам між іншым у жыцці, нібы ты і не маеш значэння для таго, што робіш сам. Вось гэтак партызанка забрала маладосць, мімаходзь завёў у свой вір фронт, а потым круціла, як тую салому ў малатарні, усё жыццё калгасная работа. Аднаўляліся, узбуйняліся, дзяцей у людзі выпіхвалі, чаго толькі не рабілі, нават камунізм будавалі, — а ўсё для нечага іншага, лепшага, толькі не для самога сябе».

Аднак, калі быў маладзейшым, з-за турботных будняў да многага не даходзіў, не задумваўся. Трэба было араць, сеяць, касіць, жаць. Не да высокіх матэрый... Тым больш балючае празрэнне на жыццёвым перавале, калі нешта і падрахункаваць варта: «...што толку з таго, што пайшоў на трактарыста, што зарабляў увесь век? Аказваецца, шчасце не заробіш. Шчасце, быццам ад бога: альбо ўдаецца, альбо не. Гэта як каму пашанцуе».

Не надта новыя высновы. Як і тое, што шмат ёсць на вёсцы прыгажэйшых мужчын, падобных Яну Кулешу, але многае ў іх не ладзіцца, бо поруч жонкі, рыхтык Янава Мар'я — усё не так, усё нечага не хапае, ва ўсім муж вінаваты. Але разам з тым у жыцці Кулеша многае куды больш складаней. Сапраўды ўжо: уласны лёс — адбітак лёсу краіны. Ды не ў тым лепшым, што было, а ўва ўсім негатыўным. Яно ж і вяло да ператварэння чалавека толькі ў звычайнага работніка, выканаўцу, пазбаўляла гаспадарлівасці. Сам Кулеш, праўда, быццам здолеў пераадолець гэты шквал «пераўтваральных» наступаў, жылка гаспадара ў яго засталася. Аднак поруч яго Мар'я, якая ўвесь час бачыць мужаву віну, што калісьці пасля вайны не паехала ў горад; Хведар Жыгар, якога заўсёды і ўсяму вучылі, «падганяючы» пад сябе, і тым самым спрабавалі вырваць з яго хлебаробскую жылку.

Хто яны? Ахвяры лёсу, што падаліся абставінам, паплылі па цячэнні, ці слабахарактарныя, няздатныя да супраціўлення ім? Зноў жа, знаку роўнасці паміж Мар'яй Кулеш і Хведарам Жыгарам не паставіш... Застаецца адно: перагортваючы старонкі канкрэтнага лёсу, паспрабаваць убачыць тое заканамернае, а потым і выніковае, з чаго пачалося бездухоўленне вёскі. Менавіта на гэтых аспектах і сканцэнтроўвае галоўную думку А. Жук, паказваючы сваіх персанажаў носьбітамі часу.

Позірк гэты на вёску, хоць асноўнае дзеянне адбываецца ў апошні перыяд застою, высвечвае і многае з больш даўняга, яшчэ з гадоў калектывізацыі. Тое, што знайшло такое поўнае адлюстраванне ў нядаўняй аповесці В. Быкава «Аблава», у А. Жука прасочваецца на іншым матэрыяле, найбольш блізкім і дарагім пісьменніку. І тут, на роднай пісьменніку ўраджайнай, чарназёмнай Случчыне ў людзей таксама была падарвана вера да ўлады, ды і прыйшлі да яе тыя, хто па-сапраўднаму і гаспадарыць не мог. Што казаць пра іншыя рэгіёны...

Якраз у далёкія трыццатыя выплыў у прамым сэнсе на паверхню жыцця Антон Кіршчэня. Бо хто ён быў, каб пра яго ведаць? Сям'я жыла бедна з-за звычайнага гультайства. Да ўсяго стары Кіршчэня «любіў пагуляць і выпіць, а на работу ў яго не ставала цярпення, спрыту і часу». Малалетні Анцік таксама хутчэй за ўсё пайшоў бы бацькавай дарогай, але тут «якраз і пачаліся камуны, таварыствы, камсамол. У камуне Анціку выдзелілі боты з высокімі халявамі, добрыя, спраўныя боты і насіў ён іх многа, бо ўзяў навыраст».

ПАЭТЫ—НЕ САЛДАТЫ...

Віктар Шніп. Шляхам ветру. Вершы. Мінск, «Мастацкая літаратура», 1990.

Пра што зараз болей за ўсё любяць пісаць паэты? Пра перабудову і пра яе ворагаў, пра Чарнобыль і занядбаную мову. Пра што зараз менш за ўсё хочацца чытаць у паэтаў? Пра занядбаную мову і Чарнобыль, пра перабудову і пра яе ворагаў.

У нашай літаратуры гэта называецца — ісці ў нагу з часам. Гучна, але — кепска. Бо паэты не салдаты, і месца іх не ў страявой шарэнзе, і самае непрымальнае, што можа (павінна) быць для паэта, — гэта раўненне. Бо творца наогул не можа жыць у нейкім адным часе, ён жыве адразу ў трох вымярэннях: мінулым, сённяшнім, будучым.

Існуе прывабная для многіх тэорыя, быццам для нармальнага развіцця таленту неабходна, каб яго акружалі графаманы, якія «рыхтуюць глебу для з'яўлення генія» (Г. Тычка). А гэтыя самыя паэты-«землякопы» заўсёды там, дзе можна добра зарабіць на папулярнай, але бяспечнай тэме, дзе можна пажывіцца без асаблівай напругі і бяссонных начэй. Яны заўсёды патрапляюць у нагу з часам і разам з тым знаходзяцца ў палоне часу, баючыся збіцца з рытму ці зрабіць хоць некалькі крокаў убок.

Адмаўляю сябе былога,
Пасылаю сябе на крыж.
Людзі выгналі з храма бога,
Я з душы выганяю мыш.

Ці не гэтымі радкамі для мяне пачалося адкрыццё складанага і драматычнага свету паэзіі (і душы) сённяшняга Віктара Шніпа? І чым яны ўразілі мяне? Нечаканым суседствам вобразаў бога і мышы? А можа, сваёй нечаканай шчырасцю? Неяк надта ўжо не ўпісвалася ягонае прызнанне ў звыклыя для нашай паэзіі рамкі. Раптам аказалася, што зусім не абавязкова шукаць горкую праўду ў іншых, таму што яна нязменна жыве ў табе самім.

Нібы чужы, іду па вуліцы,
Гляджу пад ногі прад сабою.
Назад мне страшна
азірнуцца —
Адна дарога за спіною.

«Адна дарога» — гэта і далёкая бацькоўская хата, і занядбаная мова, і высушаныя рэчкі, і разбураныя цэрквы і многае іншае. Але найперш гэта адчуванне асабістай адказнасці і віны за тое, што адбываецца з намі і вакол нас. Адсюль і пастаянная душэўная неўладкаванасць лірычнага героя, яго самота і боль.

Усвядоміўшы сябе часцінкай канкрэтнае нацыі, ён раптам жахаецца, убачыўшы і зразумеўшы, што з ёю адбываецца. З маленства любячы сваю зямлю, ён нечакана заўважае, што яна зневажаецца, знішчаецца, і ўсё гэта дзякуючы старанням адных і маўклівай згодзе другіх.

Пакінуўшы родную вёску, ён так і не знаходзіць жаданай гармоніі ў горадзе, у якім «дымна, што ў пекле, і цесна». Дзе «брудны гарачы асфальт», «лабірынты вуліц» і «дамы як акамянелыя мары».

Сустракаючыся з людзьмі, спрабуючы зразумець іхнія душы, ён заўважае падчас жахлівую неадпаведнасць у іх знешняга і ўнутранага. Ён бачыць аскепкі вялікае веры і выстылых надзей, бачыць раўнадушша і ману, бяздушша і азлобленасць... Тэмы, да глыбокага асэнсавання якіх некаторыя ідуць усё жыццё. Тэмы, якія многія ўсё жыццё стараюцца абыходзіць.

І праўды мы не любім,
Не любім і маны.
Адзін другога губім
За грошы, за чыны.
І хочам шанавання.
За што нас шанаваць?
Былінныя курганні
Не можам адстаяць.
Ды адстаім мы дачы,
Пуцёўкі, гаражы.
Заўсёды грошы ўбачым,
Не ўбачым жа — душы.
Сябе не ўвекавечым,
Загубім — пакрысе.
Ачніся, чалавеча, —
Куды цябе нясе?!

Самотныя, шчымлівыя пытанні яшчэ не раз будзе задаваць паэт. Адно не трэба забывацца, што чытач патрабуе не толькі пытанняў, але і адказаў на іх. Што чытач хоча бачыць у паэце калі не прарока, то хаця б чалавека, які абавязкова скажа яму нешта новае, невядомае дагэтуль.

Паэт спрабуе праз асабістае «я», праз будзённыя, на першы погляд, звычайныя, не паэтычныя дэталі па-свойму паказаць драматызм нашага часу, і найперш чалавека ў гэтым часе.

Замкнулі кватэры, замкнулі
і душы.
Нікому нічога супроць
не скажы.
Мой крык не пачуюць
суседчыны вушы.
Я сёння хварэю. —
Хварэеш? Ляжы!

Паштоўкі і пісьмы старыя
чытаю.
Нічога вясёлага ў словах
няма.
А я ўсё шукаю,
шукаю,
шукаю...
Смяецца і вые зіма.

Алесь Жук стварае каларытны вобраз аднаго з соцень бяздумных выканаўцаў дырэктыў. Людзі былі бяссільныя супраць кіршчэняў. Уладзе, якая гучна заяўляла аб сабе, як аб народнай, не вельмі і патрэбны быў народ, раіцца з ім яна не збіралася. Куды больш падыходзілі сляпыя выканаўцы, якія ў адпаведны перыяд насіліся са зброяй у кішэні.

Таму і атрымлівалася, што Кіршчэня і яму падобныя спекулявалі на высокіх ідэях. Простыя ж людзі ім і запярэчыць не маглі. Успомнім, што гаворыць таму ж Хведару Жыгару стары Змітрачок, калі даведаўся, што на яго дачку кінуў вока сам Кіршчэня: «Ты не бяры на мяне крыўды, хлопча. Тут нічога не зробіш. Што ж я, не бачу, што ты гаспадар, а ён пустадомак? І я так думаў, што паберацеся вы з Марыляй... Але ж чнесла яго нячыстая. А цяпер ых кулакоў вышукваюць... У цябе гаспадарка, у мяне гаспадарка... А дурню не ўкажаш, падаткне, і канцоў не знойдзеш. Адным словам, забярэ ён Марылю».

Так і сталася, выйшла замуж дачка Змітрачка за Кіршчэню, ратуючы бацьку ад немінучага раскулачвання. На жаль, і такія ўчынкі не заўсёды прыносілі палёгку. Прыходзіла чарговая разнарадка, і пад раскулачванне траплялі ўжо і блізкія «людзей з кабурой». Кіршчэня, праўда, больш Змітрачковых не ўрбаваў, хапала ў вёсцы іншых, каго ён «перавыхоўваў».

І ці не кіршчэняў віна, што сёння на сяле мала людзей, улюбёных у зямлю, пазбаўленых прыстасавальніцкіх інтарэсаў? Зерне, пасеянае ў няўдобіцу, добрага ўраджаю не дасць. Кіршчэні якраз і рыхтавалі глебу пад такую сяўбу.

Чаму добра навучыліся кіршчэні, дык гэта кіраўніцтву! І пераемнікаў рыхтавалі. Антон іншых «то культурным гаспадаром вучыў быць, то ў калгас запісваў, то аблігацыі пазыкі прымушаў браць, то яблыні ў садзе пералічваў і жыўнасць перапісваў...» А. Жук па-майстэрску ўзнаўляе асобныя эпізоды з дзейнасці гэтага «рэвалюцыянера» ад зямлі. Нешматслоўна піша, але трапляе, як кажуць, у саму сутнасць. Вось адзін прыклад.

Кіршчэня «збіраў брыгаду і перад пасяўной, і перад жнівом, і па патрэбе, і без патрэбы. Гаварыў пра важнасць моманту. І слова «таварыш» любіў.

— Таварышы, яравыя, таварышы, азімыя, таварышы, сеяць пара!

Альбо:

— Таварышы, плугі, таварышы,, бароны, таварышы, валяюцца за хлявамі...»

Невыпадкова, што сяляне «Кіршчэню пачалі перакрыўліваць». Але нутро чалавека з «бальшавіцкім запалам» па-ранейшаму для аднавяскоўцаў заставалася загадкай. Па сутнасці, ніхто і не спрабаваў зазірнуць у самае патаемнае яго душы. Маўляў, што возьмеш, пустадомак ёсць пустадомак. Страшна, праўда, што да ўлады дабраўся, але ёсць і больш лютыя начальнікі.

Пісьменнік, аднак, не спыняецца на паўдарозе, завеньчаючы Кіршчэню. Як і І. Шамякін у аповесці «Ахвяры», А. Жук закранае і ганебную дзейнасць сталінскіх органаў НКУС, якім і патрэбны былі людзі, накшталт Кіршчэні. Праўда, нашто ўжо Антон нічога святога за душой не меў, але і ён пачаў адчуваць сябе ніякавата, калі сутыкнуўся з адным з прадстаўнікоў гэтых органаў Беразоўскім.

Аднойчы, калі Беразоўскі п'яны заснуў, Кіршчэня асмеліўся, разгарнуў яго планшэтку: «Таму, што ўбачыў, нельга было нават паверыць. Спачатку ён не мог зразумець, што абазначаюць прозвішчы, акуратна напісаныя папарна, злучаныя паміж сабой стрэлачкаю. Спачатку прозвішча старшыні сельсавета, потым старшыні калгаса, дырэктара школы і далей, далей. Прозвішчы ахвяр і тых, хто павінен быў на іх данесці. Ён, Кіршчэня, павінен быў данесці на старшыню калгаса, а потым Жыгар на яго, Кіршчэню. Ён тады ўглядаўся ў спіс, стараўся запомніць прозвішчы, хто першы, хто на каго. І гэтаму страшнаму ланцугу прозвішчаў не было канца».

Аповесць прыадкрывае свайго роду «белыя плямы» ў літаратуры, узнаўляе тое, пра што не пісалася раней, пра што і цяпер пішацца мала. Аўтар, ступаючы па гэтым цаліку, праўда, часам задавальняецца і чыста інфармацыйным паведамленнем. Скажам, адносна гэтага выпадку з Беразоўскім. Зразумела, пасля такога знаёмства з планшэткай стан Кіршчэні апраўданы. Запалоханы, ведаючы, да чаго ўсё можа прывесці, ён вырашыў маўчаць. Маўчанне гэтае зацягнулася на доўгія гады. Нават пасля выхаду на пенсію Кіршчэня перакананы: «Беразоўскія памяняліся, а тыя вучнёўскія сшыткі не прапалі. Падай сігнал, і ўсё стане на свае месцы. Вернуцца назад альбо знойдуцца другія беразоўскія. Улада не любіць, калі з ёй пачынаюць занадта братацца».

Нават, засеўшы на схіле гадоў за мемуары, Кіршчэня пра «тайну» нічога не прыгадвае. Ды і не можа пра гэта пісаць, бо пры ўсім іншым хоча застацца чысценькім, ведае, даносаў ніхто не даруе.

Навошта ж, у такім разе, Кіршчэню, як паказана ў творы, уся гэтая актыўнасць, жаданне па-ранейшаму вучыць іншых? Навошта яму наводзіць паўсюдна парадак? Каб даказаць, што недарэмна пражыў жыццё і, як раней, знаходзіцца на кані? Але ж хто-хто, а Кіршчэня не можа не здагадвацца, што яго «каняка» знасіўся. Гэта яго справа верыць: «не можа быць таго, каб пільнае вока не глядзела, не прыкмячала ўсяго, што робіцца навокал. Ёсць нагляд за ўсімі, без гэтага проста нельга». Толькі навошта ў такім разе высоўвацца, звяртаць на сябе лішнюю ўвагу?

Па-мойму, усё гэта нацяжкі ў асэнсаванні вобраза, недастатковае псіхалагічнае прасвятленне паводзін Кіршчэні ў новых абставінах. Завастраючы ўвагу на ўсім негатыўным, што і ператварыла персанаж у тып пасвойму гратэскавы, А. Жук прымушае верыць яму «з паўслова». Такая недагаворанасць не на карысць твору, яна прыводзіць часам да інфармацыйнасці, хоць у чыста пазнавальным сэнсе і важнай.

Між тым, сяды-тады нават узнікае адчуванне, што аповесць перанасычана... праблемамі. Што ўжо нечакана, то нечакана. Сапраўды, крытыка толькі тое і робіць, што папракае пісьменнікаў за тэматычную заезджанасць, хадульныя персанажы, плаванне па знаёмым матэрыяле. У аповесці ж «Праклятая любоў» столькі матэрыялу, што магло б хапіць не на адзін твор. Вось толькі асобныя праблемы, якія трапілі ў поле зроку А. Жука. Адарванасць партыйнай работы ад жыцця, дагматычнасць лідэраў, іх няздольнасць быць «душой народа» (сакратар партарганізацыі Радзюк. Дыктат райкома партыі ў адносінах да старшынь калгасаў і дырэктараў саўгасаў, скаванасць дзеянняў апошніх (старшыня гаспадаркі Мяцельскі)... Зломлены лёс сялян, хто на працягу дзесяткаў гадоў знаходзіўся пад каўпаком улад (Жыгар)... У сваю чаргу, поруч з гэтымі праблемамі, у аповесці паўстаюць і такія, якія ўспрымаюцца як разгалінаванні ад іх. Скажам, пазбаўленне людзей веры ў нешта святое і ўзвышанае, паслабленне маральных крытэрыяў, ломка традыцыйнага вясковага ўкладу...

Падобнай праблемнай перанасычанасці, відаць, не мог не адчуваць і сам пісьменнік. Ён разумеў і тое, што ў аповесці абавязкова павінен з'явіцца вобраз, які б нейкім чынам кандэнсаваў у сабе вялікія і малыя праблемы. Вобраз гэты — ужо згаданы Ян Кулеш. Таптала яго жыццё, зламаць хацела, але на калені не паставіла. Хай позна, ва ўзросце, вельмі далёкім ад маладога, знаходзіць ён для сябе і душэўнае, і духоўнае прыстанішча. Увасабленнем яго становіцца Галя Русакевіч, дачка таго самага Русакевіча, які па даносу Кіршчэні апынуўся ў Сібіры.

Нездарма кажуць: душа душу шукае. Нямала перажыла і Галя Русакевіч. Хапіла ўсяго ды столькі, што і ворагу не пажадаеш. Муж піў, а потым нечакана пайшоў да другой. «У сэрца яе ўвайшоў холад». Урачы параілі памяняць клімат. Так і апынулася на бацькавай радзіме.

Узаемаадносіны з Янам Кулешам паступова перайшлі ў запозненае каханне. Аднак да шчасця ўсё ж па-ранейшаму вельмі далёка. Знаходзяцца злыя языкі, пляткараць, піша ў райком партыі жонка Кулеша. А на каго людзі, на таго і бог. Перажыванні не прайшлі бясследна і для Яна: аслепнуў, хоць потым урачам удалося часткова вярнуць зрок.

Аповесць заканчваецца на далёкай ад аптымізму ноце. Каторы раз Кулеш задумваецца над пражытым, шукае той зыходны пункт, адкуль і пачаліся ўсе беды і нязгоды. І чым болей шукае, тым больш пераконваецца — знайсці яго не так і проста, бо многае ў жыцці залежала і залежыць не толькі ад яго самога. Так ужо сталася, што нарадзіўся Ян Кулеш у час, калі вельмі шмат знаходзілася ахвотнікаў думаць за чалавека, не пытаючыся яго згоды, рыхтаваць яму «светлую будучыню». А там, дзе на першы план ставілася сусветная рэвалюцыя, сам чалавек забываўся, рабіўся ўсяго толькі звычайным выканаўцам волі ўладу маючых.

Слепата Яна Кулеша — сімвалічная. Мроя́цца, набягаюць пытанні: «...чаму сталася гэтак, што замест святла пад канец жыцця — пустая шэрасць перааранага поля?.. Навошта пракляў бог і маці, і яго любіць гэтую зямлю, усё аддаць ёй, каб атрымаць толькі шэрань, якая бясконцая, ад якой не ўратавацца тым, што заплюшчыш вочы?»

Узіраецца Кулеш у далячынь, «туды, дзе пад шэранню ворыва абазначалася рэдзенькімі маладымі прысадамі дарога ад цэнтральнай сядзібы да вёскі». Сына чакае, спадзяецца, што знойдзе той вольны час, прыедзе, адведае бацьку. Але «калі змахваў слязу, якая набягала на вочы, зноў бачыў толькі шэрае, нібы тая ваўчыная аблога, што гнала яго маладога, пустое асенняе ворыва, якому няма канца-краю».

Апошнія радкі аповесці... Няпэўнасць у жыцці героя. Як і няпэўнасць у нашым сённяшнім жыцці ўвогуле... Усе мы, як і Ян Кулеш, павінны відушчымі вачыма глянуць на свет і людзей. Але пакуль што не заўсёды ўдаецца зрабіць гэта. Шлях жа да азарэння праз пракляцце такі цяжкі і пакутлівы.

Алесь МАРЦІНОВІЧ.

Вядома, было б прасцей спісаць усю гэтую гарадскую тугу на вясковае паходжанне аўтара, на непрыстасаванасць яго да цеснаты, да «бруднага гарачага асфальту», якім «сціснулі зямлю і ўжо не выпусцяць на волю». І на ягонае шчырае «Я гэты горад не люблю. Не палюблю, відаць, ніколі» можна адказаць, напрыклад, вось гэтым глобусаўскім: «Мне падабаецца: мікраараён — Жалезны дух у канструктыўным целе. Дзіцячы пляц і школьны стадыён...»

Аднак абмежавацца гэтым тлумачэннем, значыць, зрабіць вялікую памылку. Ва ўсялякім разе, мне думаецца, тут спрацаваў яшчэ і той факт, што свежым вокам звыклыя для іншых рэчы і з'явы ўспрымаюцца больш абвострана і вывучаюцца больш прыдзірліва.

І не трэба папракаць аўтара, што ён не хоча заўважаць хараство ні гарадскіх архітэктурных збудаванняў, ні скульптурных помнікаў, ні паркаў, ні яшчэ шмат чаго, ля якога іншы не прайшоў бы раўнадушна. Не трэба хапаць яго за рукаў і навязваць свае густы. Падобная дапамога не толькі небяспечная, але падчас і шкодная. Менавіта сваё светаўспрыманне перш за ўсё характарызуе любога творцу. Да таго ж мы маем справу толькі з пэўным этапам у развіцці светабачання паэта, які можна прымаць альбо не прымаць адносна свайго, але нельга адмаўляць увогуле.

Многія з гарадскіх вершаў В. Шніпа мне імпануюць сваёй вобразнасцю і нечаканасцю вырашэння тэмы, дакладнасцю радка і той адкрытасцю, з якою аўтар гаворыць пра самае патаемнае і балючае. Возьмем для прыкладу хаця б «Дрэвы», «Памяць», «Ты не пытайся: як жывеш?», «Абразок», «Прадаўшчыца піва».. .

Горш, калі, паддаўшыся пачуццю, аўтар паспешна фіксуе на паперы тое, што бачыць навокал, не надта клапоцячыся пра глыбінны змест. Тады размовы застаюцца проста размовамі, учынкі, падзеі ператвараюцца ў звычайную канстатацыю фактаў: «А рэкламай магазіны Грош апошні забяруць. Як звяры, равуць машыны, Заглядзішся — падаб'юць».

Ёсць такі распаўсюджаны ў паэзіі прыём: рабіць вершы з некалькіх радкоў (звычайна яны ставяцца ў канцы твора). Пры гэтым усе папярэднія строфы напаўняюцца другасным, неабавязковым зместам, як бы падганяюцца пад апошнюю страфу — абавязкова свежую, арыгінальную і нечаканую. І, трэба адзначыць, нярэдка (асабліва ў невялікіх па памеру вершах) сваёй другаснасцю яны яшчэ больш узмацняюць канцоўку твора, прымушаюць зноў і зноў перачытаць яго нанова. Але нярэдка здараецца і адваротнае (як, напрыклад, у вершы «Яшчэ жывуць — нікому так не жыць...»), калі заключныя радкі як бы адрываюцца ад папярэдніх і жывуць сваім жыццём, застаюцца ў памяці чытача самі па сабе, без астатніх, якія не толькі пасля цяжка прыгадаць, але і не хочацца прыгадваць.

На шчасце, падобных вершаў у зборніку не так шмат. Бо ёсць у ім самотна-шчымлівы верш «Па пыльнай дарозе» пра вяртанне героя дадому, дзе яго ўжо даўно не чакаюць, дзе жывуць зусім чужыя людзі. Бо ёсць у ім казачна-філасофская «Быль пра сініцу» і харошыя вершы на гістарычную тэму...

Скразны матыў, які праходзіць праз усю кніжку, — матыў адзіноты. Часам ён ляжыць у аснове ўсяго твора, часам ледзь заўважны. Нярэдка ён носіць адценне болю і пакуты, нярэдка лёгкага смутку.

Уважліва ўчытваючыся ў вершы, можна заўважыць, што паэт паказвае не толькі і не столькі адчуванні свайго лірычнага «я», колькі наогул чалавечую адзіноту. Бо наш час — гэта час драматычнага абнаўлення і шматлікіх супярэчнасцей, і калі зазірнуць у душу чалавека, то сярод дабра і зла там лягчэй за ўсё адшукаць самоту.

Стыне недапітая гарбата
З пахамі пратухлага віна.
Шорах на душы ад
лістападу —
Гаспадар стаіць каля акна.

Дыхае на шыбу,
выцірае,
Стомлена кляне бясконцы
дзень.
Фортку,
уздыхнуўшы,
адчыняе.
Да суседкі маладой ідзе.

Вечарам ён вернецца дадому
І гарбату стылую дап'е.
«Дурань!» — скажа ён сабе
самому
І ад суму песню запяе.

Давайце не будзем спяшацца вінаваціць аўтара ў прапагандзе амаральных учынкаў, а паспрабуем за гэтай досыць-такі тыповай для нашага жыцця сцэнкай убачыць трагедыю чалавечай асобы. Трагедыю, пакуль што намі яшчэ як след не асэнсаваную і таму падчас выказаную вось так — праставата, аднамерна.

Памятаецца, у першым зборніку В. Шніпа, які выйшаў сем гадоў назад і меў характэрную для свайго часу назву «Гронка святла», было дужа ўпэўненае і задзірыстае чатырохрадкоўе: «Абуджаць умею гоні, Знаю, дзе зімуюць ракі... Дзённік мой —мае далоні, Мазалі — мае адзнакі». Прыгадваю яго зараз не як папрок за колішнія «грахі», а як доказ таго, што лірычны герой паэта сёння больш раскаваны і незалежны ў сваіх думках і ўчынках, што думкі яго сталі больш важкімі, больш выверанымі з жыццёвай праўдай. За гэтыя сем гадоў паэту давялося прайсці нялёгкі шлях ад юначай узнёсласці да шматлікіх расчараванняў, ад светлае веры да пакутных сумненняў.

Але ўсё ж, відаць, самы складаны, самы цяжкі шлях у паэта наперадзе. Шлях — праз памылкі — да новае веры, праз сумненні — да спасціжэння ісціны.

Алесь БАДАК.

Погляд на партрэт?

Ці не самы спрыяльны час аддало Цэнтральнае тэлебачанне прэм'еры гэтай перадачы. Яна была паказана ў пятніцу, заняўшы традыцыйнае месца «Взгляда». Дык жа не будзе вялікай нацяжкай сказаць, што галоўная рэдакцыя народнай творчасці ЦТ выйшла ў эфір са сваім «взглядом» — поглядам на асобу аднаго з вядомых нашых землякоў, кампазітара Ігара Лучанка.

У доўгім тэлеапавяданні спалучылася шмат рознага: рэфрэнам — хатняе, і чамусьці даўняе, інтэрв'ю І. Лучанка; архіўныя фотакарткі; колішнія здымкі на радзіме, у Мар'інай Горцы, калі быў яшчэ жывы ягоны бацька — дасціпны, гаваркі Міхась Лукіч; эпізод сярод дзяцей у музеі мар'інагорскай школы, дзе ёсць «мемарыяльны куток» Лучанка; сямейная ідылія; Лучанок —старшыня журы Усесаюзнага фестывалю польскай песні; Лучанок з вайсковым ансамблем — кансультуе выкананне сваёй песні і да т. п. А наконт саміх песень — дык лягчэй назваць тое, што не прагучала, чым перэлічыць уключанае ў перадачу. Тое ж, натуральна, датычыць і выканаўцаў.

Аўтары тэлепартрэта І. Лучанка назвалі сваю работу «Памяць сэрца»,—паводле назвы адной з Лучанковых песень. Магчыма, калі б за аналагічную працу (нават на тым самым відэаматэрыяле) узяліся іх беларускія калегі, была б іншаю не толькі назва, але і творчы вынік, а значыць—і агульнае глядацкае ўражанне ад самога «партрэта буйным планам». Не будзем спрачацца пра густ і прафесійную добрасумленнасць маскоўскіх тэлемастакоў — стваральнікаў гэтага параднага партрэта: а раптам «Памяць сэрца» — іх шчыры падарунак да юбілею народнага артыста СССР дэпутата Вярхоўнага Савета СССР Ігара Міхайлавіча Лучанка (які, праўда, спраўляўся... год таму)? На падарункі ж добрыя людзі адказваюць удзячнасцю...

С. ВЕТКА.

Алесь САЛТУК

Жаданне

Мне многа хочацца сказаць,
Паспавядацца, як умею,
Каб набалелая сляза
Упала з вейкі у надзею.

Каб растапіла ўсё да тла,
Каб ачышчальным стала ліўнем.
Хачу спагады і цяпла,
Бездапаможны і наіўны.

Пячэ шчымлівая туга,
Бо карацее ўжо дарога...
Надзея, дай к тваім нагам
Я пакладу сваю трывогу.

Не адкасніся, не адрынь:
Мне ад цябе патрэбна мала —
Сказ Пімена, дачка і сын,
І хлеба свежага кавалак.

Мне шмат патрэбна,
Ты даруй —
Мне свет змясціць у сэрцы трэба,
Каб у той дзень, калі памру,
Яшчэ вышэйшым стала неба.

І прыгажэйшаю — зямля
У кастрах кастрычніцкіх кляновых.
І над труною тое слова,
Што маці мне дала мая.

Сябру

У карункі сплецены лятункі,
У нераты — пражытыя гады.
Змалку мы не звыклі да ласункаў,
Хлеб жа быў заўжды без лебяды.

З мульту шылі маці нам сарочкі —
Цёпла, а галоўнае — танней.
Але радасць не хадзіла ўпрочкі
Ад цябе, браток, і ад мяне.

Радасць нам свістала і спявала
Салаўём, шпаком і вераб'ём.
І адранкам сонейка ўставала
Мірнае над сцішаным сялом.

А ў бары, нібыта іх садзілі,
Статкамі раслі баравікі.
А любілі — як жа мы любілі
Першы дотык тоненькай рукі!

Азірнуся:
Плачу і смяюся,
І дабру малюся на зямлі.
І да смерці толькі я баюся,
Сэрцы тукам каб не зараслі.

●

Хоць не з нуля,
А зноўку пачынаем
Каторы раз, каторы божы час:
Цароў на царства садзім і вянчаем
Мы самі — самі і ніхто за нас.

І локці самі мы сабе кусаем,
Калі смяюцца потым з нас цары...
О, вера наша — смешная, святая,
Не будзь цябе — кладзіся і памры.

●

Жыццё мяне пашкадавала:
То біла вобзем, то ўздымала.

Ды, дзякуй богу, я — жывы.
З людзьмі і плачу, і смяюся,
І не схіляю галавы,
І ўсё да лепшага імкнуся.

Жыццё мяне пашкадавала:
Шляхоў ужо прайшоў нямала.

Вяртаўся стомлены з дарог
І пачынаў амаль нанова,
І заўсягды, як мог, бярог
Праўдзівасць матчынага слова.

На свяце паэзіі

Рыгору БАРАДУЛІНУ

— Ры-гор!
— Працуе ваш Рыгор, —
Нам рэха сумна адказала...
Хвіліны вольнай у яго
Жыцці ніколі не ставала.

Цябе чакалі мы, браток,
Калі на Ўшаччыне сышліся.
І што патрэслі твой садок,
Ты дужа там і не журыся.

Мы тут па яблыку з'ядзім,
Душы часціначку пакінем.
Сваю пашану аддадзім
Святым Івану і Куліне.

Вяртайся пахутчэй, Рыгор, —
Твая і рэчка тут і лодка.
Палае восеньскі касцёр
І певень раздзірае глотку.

Які бязмежны лістапад,
Як шпарка круціцца планета
І мудра, калі у паэта
Ёсць свая хата і свой сад.

●

Красавік ручаямі ў ярах загалёкаў,
Лес, ад снегу знямоглы, сасонак палкі
падраўняў.
І амаль што ў зеніце ўрачыста-глыбокім
Зоркі селі ладком, як на свяце радня.

І ў мяне тут радня —
Лес, рака, абалонне.
Захлынаюцца грудзі і ў горле ад шчасця
камяк:
Сёння птушак прылёт — усяночная
сёння
Для мяне.
Хай Радзімы свяціцца імя!

Хай свіціцца рака, зоркі шчодра яснеюць
І лясы не радзеюць, і падлескі шугаюць
у высь,
І шпакі заліваюцца ледзьве заднее,
І бяссмерцяцца стрэлкі зялёнай травы.

Жартоўнае

У сорак год не падурэеш.
У сорак — мудранькія ўсе...
А я пайду, як звечарэе,
Мядзведзя пасвіць у аўсе.

Махну рукою на сініцу —
Ат, недарэчная пісклявая!
Усіх прымушу падзівіцца —
Злаўлю, хоць трэсну, жураўля.

Хоць разаб'юся, а дастану
Букецік зорачак з нябёс.
Царэўну тую, Несмяяну,
Я рассмяшу ажно да слёз.

Пакпяць — глядзі які адважны,
Яшчэ ў дадатак і хварсун...
Калі яна хоць слова скажа, —
Жывой вады ёй прынясу!

Віктар ЯРАЦ

Балада Палесся

Калі б не тая ноч красавіка,
што горыччу дыхнула неспазнанай, —
як і раней, цякла б між траў рака,
як і раней, суніцы спелі б на палянах.
Як і дагэтуль, радасць птушанём
здзіўлёна кроплі ў дзень лавіла б летні
нябёс лагодных, што вадою гром
астуджваюць над лугам перагрэтым.
Шукаў бы зноў грыбнік баравіка,
і рыбака б удача не мінала,
калі б — не тая ноч красавіка,
якой і ў страшным сне зямля не знала.

●

Былы знаёмы стаў кіраўніком —
мяне не пазнае цяпер на вуліцы.
У свой высокі кіраўнічы дом
ідзе і на сустрэчах мудра жмурыцца.
!дзі-ідзі, вышэй-вышэй-вышэй.
Такой бяды, што на маё «Дзень добры»
ты нават не павёў сваіх вушэй,
заняты клопатам народным.
Паверхі кіраўнічыя штурмуй,
пільнуй арлом суровым з паднябесся.
А мне сягоння стала весела,
што ты маўчаннем прывітанне абмінуў.

●

І думкай — магутней вулкана —
(драбіла стагоддзяў пласты
і ледніковы камень,
счарнелы ад нематы),
і знакам бяссілля,
што зернем
засейвае горкім палі,
з-пад акуляраў Эйнштэйна —
пагляд адзінокай Зямлі.

Вяртанне слова

З глыбінь часоў глядзяць імёны
незамутнёнай чысціні.
Сплылі ўчарнелыя чаўны.
А ў слоў Скарыны — подых новы.
Стагоддзі-брычкі адрыпелі
пад шум бароў і посвіст крыл.
Сівой мінуўшчыны надзеі
марудна коні валаклі.
З друкарань старажытнай Прагі,
між італьянскіх камяніц
імкнуў пагляд —
ён славы прагнуў
для той Зямлі, дзе звон крыніц,
дзе свецяць сцежкі і дубровы,
пчаліны рой гудзе вясной,
і, нібы зёлкі, лечаць словы
сваёй надзейнай прастатой,
зямною сілай і настоем,
духмяней за ліповы мёд.
І тыя словы — сам народ,
якому будзе ён даскону
вяртаць
па літары здалёк
ягоны слых,
ягоны зрок.
І ён — ратай аблогаў краю —
не дзеля званняў і выгод
з чала прасветленага пот
рукой стамлёнай выцірае.

Дзедаў сад

Гэты сад — стары і не густы,
зноў зацвіў, гайдаючы ў галінах
сок зямны, той сок, што праз пласты
па ствалах ідзе, нібы па жылах.
Гэта зноў праз тоўшчу нематы
рушылі святлом да сонца ў госці
рэк падземных песні, што заўжды
белы сад да воблакаў узносяць.
Гэта — узарваныя пупышкі
выкінулі лёгкія сцяжкі.
Ловяць пчол і яблыні, і вішні.
Спее навальніцы гул цяжкі.
Дакранешся да кары далонню —
нібы дакранешся родных рук.
Голасам, што стаў зямным бяздоннем,
адзавецца вецця кожны гук.

— Пишешь, писатель... — перш чым папрасіць чырвонец, спачувальна кажа сусед, аглядаючы мой стол.

Суседаў позірк спыняецца на томе «Витебской старины».

— Сотни на две потянет? — пытаецца ён.

Я дастаю партманетку і працягваю яму грошы.

— Обижаешь, писатель, — гаворыць сусед і глядзіць чырвонец на святло.

— Уберите Ленина с денег! — раптам цытуе ён ранняга А. Вазнясенскага і бесцырымонна плюхаецца ў мой фатэль.

На стале стосік аркушаў, на верхнім я паспеў ужо напісаць назву.

— Мой ра-да-вод... — слібізуе сусед, засунуўшы нос у мае паперы. — Всё по-белорусскому. Вчера, между прочим, по телеку тебя смотрел. Агитируешь... Всё равно народ за вами не пойдёт.

Ён на ўсялякі выпадак хавае чырвонец у кішэню і кажа далей:

— Понял, писатель? Но пасаран, как говорил товарищ Альенде, вечная ему память. Ну ладно, не обижайся. Мой ра-да-вод да пя-та-га ка-ле-на... Это как понимать — до пятого колена? Про что?

— Пра генеалогію, — адказваю я.

— Ну, ты даёшь, старичок! — чамусьці радуецца сусед. — Её ж у мужиков не бывает.

Ён на хвіліну задумваецца і ў выніку нейкіх загадкавых меркаванняў урэшце ўхваляе мой намер:

— А в общем, давно пора тебе что-нибудь такое для народа.

Ён расказвае мне барадатую показку пра жанчыну, гінеколага і сантэхніка, а потым яшчэ адну показку пра гінеколага і двух грузінаў, і да мяне даходзіць, што сусед яўна перабытаў генеалогію з гінекалогіяй. На дадатак ён выцягвае з кішэні і, натхняючы мяне на стварэнне новага літаратурна-мастацкага твора, вахлікам раскладвае на стале калоду парнаграфічных картаў.

Нарэшце мы развітваемся, і я выпісваю з аднае выдадзенае на пачатку нашага стагоддзя кнігі падкрэсленыя калісьці, можа, яшчэ за праклятым царызмам словы: «Мелі тыя крывічы звычай: калі дасягаў у іх юнак паўналецця, мусіў ён, каб назвацца мужчынам, пераплысці хуткую ды глыбокую раку, упаляваць тура або мядзведзя, раскласці ў залеву вогнішча, а таксама распавесці суродзічам аб продках сваіх да пятага калена... Калі ж не ведаў ён роду свайго, дык падлягаў выгнанню, бо ўважалася, што род ягоны, а значыцца, і зямля бацькоўская яму не дарагія, і кожны дзень можа ступіць ён на шлях здрады».

Побач, на палях, яшчэ відаць накіданае алоўкам і ўжо амаль сцёртае часам дрэва нейчага радаводу.

Як вы ўжо зразумелі, на нешта падобнае падбіла гэтая кніга і мяне.

Няхай даруе мне стрыечная бабуля Грыпінка, што чытала «Чорную магію», умела спыняць кроў, заўсёды заходзіла ў хату да мае роднае бабулі якраз тады, калі мы сядалі за стол і бралі ў рукі лыжкі, лекавала людзей і худобу зёлкамі і сем гадоў сядзела ў сталінскіх лагерах — пэўна, усё-такі не за антысавецкую і контррэвалюцыйную дзейнасць, а сапраўды за знахарства. Зрэшты, нядаўна я чытаў кнігу пра лекавыя расліны Беларусі, якая пачынаецца са словаў «Коммунистическая партия проявляет неуклонную заботу о здоровье советских людей». Хто ведае, мо бабулі Грыпінцы інкрымінавалі якраз тое, што, збіраючы свае зёлкі, яна насмелілася клапаціцца аб тым, аб чым мела права клапаціцца толькі камуністычная партыя?

Няхай даруе мне мой засакрэчаны стрыечны дзед Рыгор, які меў нейкае і, відаць, даволі блізкае дачыненне да касмічных палётаў, бо слаў нам пасылкі з ікрой і чырвонаю рыбай, а аднаго разу, калі гасцяваў у вёсцы, саламяную страху бабулінае хаты ледзьве не раскідаў вайсковы верталёт, прысланы па дзеда з бліжэйшага аэрадрома.

Няхай даруе мне дзядзька Ахрэм, які нават прыблізна не ведаў свайго дня нараджэння, а таму, не ўважаючы на ўсе жончыны захады, штовечар хадзіў падвясёлены, абсалютна слушна зазначаючы, што, магчыма, акурат сёння ён і нарадзіўся.

Даруйце мне, усе мае родзічы, якіх згадаю адно мімаходзь або не згадаю зусім. Каб канчаткова не заблытацца ў галінах і адгалінаваннях радаводнага дрэва — пагатоў, спадзявацца ўнікнуць лірычных і нелірычных адхіленняў ад такое тэмы ўсё адно наіўна — буду весці гаворку толькі аб непасрэдных сваіх продках па бацьку і маці або, як казалі даўней, па мячы і кудзелі. Апрача таго, іншая метода будзе непазбежна нагадваць хітрамудрую спробу схавацца ад адказнасці, заблытаць суддзяў і пазбегнуць выгнання.

І яшчэ адна заўвага. У цывілізаваным свеце, калі вядомы заснавальнік роду ці, прынамсі, нехта са знакамітых продкаў, радаводнае дрэва, як і належыць, малююць з наранёў. У нас жа сем дзесяцігоддзяў гэтыя карані нястомна выкарчоўвалі, і трэба было ведаць не продкаў, а нешта іншае. Напрыклад, чарадзейныя цытаты з класікаў або галоўныя задачы пяцігодак. За няведанне адной з гэтых задач слова ў слова рэктар беларускага дзяржаўнага універсітэта Сікорскі ў сямідзесятыя гады на бал знізіў мне адзнаку на эк-

замене па навуцы пад назваю «Гісторыя КПСС», а на дзяржаўным экзамене па яшчэ больш захапляючай дысцыпліне — «Навуковаму камунізму», калі я, ужо маючы сумны досвед і марачы атрымліваць стыпендыю, ведаў усе галоўныя задачы і фармулёўкі так, што яны ад зубоў адскоквалі, прафесар Круцько знізіў мне адзнаку ўжо адразу на два балы, «потому что вы, молодой человек, во всё это не верите». Бедны прафесар Круцько, няўжо ён верыў?

Такім чынам, недзе пачынаюць з каранёў, а ў нас атрымліваецца нешта адваротнае: мусім пачынаць генеалагічнае дрэва з сучка на нейкай з ягоных галінаў і ўжо адсюль спрабаваць дапясці каранёў.

Мая маці Марыя паходзіць з сялянаў вёскі Капысіца, заснаванае ў невятак ніколі і не задумаўшыся, што яна выкладае і што зрабілі з гэтаю навукаю па волі сваіх гаспадароў нашы афіцыйныя герадоты.

Як вы заўважылі, аднаўляючы радавод, я не збіраюся маляваць грунтоўных партрэтаў. Я свядома не лезу ў прыцемныя спіжарні памяці, а занатоўваю тое, што не трэба ўзгадваць, бо яно памяталася заўсёды, увесь час было як бы ў зялёным коле святла ад лямпы, што гарыць увечары на маім стале. Мне здаецца, менавіта ў россыпе такіх незабыўных драбніц ды фактаў і можна разгледзець чалавечую сутнасць дзейных асобаў майго невялікага даследавання. Пры гэтым я цудоўна ўсведамляю рызыку дарэшты скепсіць дачыненні са сваякамі, ужо і цяпер моцна сапсаваныя маімі пісаннямі.

Уладзімір АРЛОЎ

МОЙ РАДАВОД ДА ПЯТАГА КАЛЕНА, або СПРОБА ПАЗБЕГНУЦЬ ВЫГНАННЯ

домым годзе задаўненага стагоддзя за тры вярсты ад Дняпра на рэчцы Серабранцы; маці ў гэтай рэчцы некалі ледзь не ўтапілася, а я навучыўся ў ёй плаваць, і ўжо гадоў дваццаць, як у ёй не ўтопіцца нават кацянё. Як той казаў, жыць стала лепей, жыць стала весялей.

Мяркуючы па назве, матчыну вёску заснавалі перасяленцы з паблізнага мястэчка Копысь, вядомага ўжо амаль тысячу гадоў, з той самай Капысі, што была сталіцаю беларускіх кафляроў-цаніннікаў (яшчэ на пачатку нашага стагоддзя тут было дваццаць кафлявых заводаў, дасёння ацалеў толькі адзін), якіх маскоўскія цары выводзілі ў палон аздабляць грубкі ў сваіх задушлівых палацах.

Зусім побач з Копыссю, дзе маці скончыла школу, за колькі гадоў да вайны аблюбаваў сабе месца на летнік Янка Купала. Адзін з самых частых маміных успамінаў дзяцінства: народны паэт Беларусі Купала — ведама ж, несусветна багаты! — купляючы на копыскім базарчыку грыбы, зацята таргуецца за кожную капейчыну з прыгожымі тамтэйшымі яўрэечкамі.

Мамін выпускны баль прыпаў на апошні мірны вечар, калі можна назваць мірам тое, што тады чынілася ў краіне. Даведаўшыся аб пачатку вайны, мама надзела на сябе ўсе свае тры сукенкі.

У Капысіцы стаяў гарнізон напалову з немцаў, напалову з фінаў. Маці прыгадвае, што, у параўнанні з фінамі, немцы выдавалі хоць і ворагамі, але не такімі страшнымі. Асабліва фольксдойчэ Пауль, які добра гаварыў парасійску, папярэджваў вёску, калі будуць забіраць каровы або вывозіць моладзь у Нямеччыну, паведамляў, што трэба партызанам, і паказваў маёй маці пасведчанне сябра падпольнай антыфашыстоўскае арганізацыі. Таму, калі вечарамі акупанты, седзячы па хатах, пілі шнапс і спявалі пад губны гармонік свае песні, Пауль не баяўся хадзіць на вячоркі і танцаваць з нашымі дзяўчатамі. Пэўна, дзякуючы яму, у Капысіцы дагэтуль памятаюць прыпеўкі на нямецка-беларускай трасянцы.

Варум ду гойтэ не прыйшоў?
Іх цябе чакала.
Унд васэр з неба паліла,
Я дамоў адна пайшла.

Пад час вячорак з лесу нярэдка прыходзілі партызаны. Яны таксама танцавалі, курылі з Паулем на ганку і частавалі яго самагонкаю. Аднойчы яны прыйшлі і, няўдала робячы выгляд, што аніколі раней з Паулем не сустракаліся, вывелі яго з хаты і проста за хлявом застрэлілі. Нейкі асабіст, па загаду якога гэта рабілася, яўна запісаў раніцою ў сваю зводку, што народнымі мсціўцамі знішчаны яшчэ адзін фашыстоўскі захопнік.

Калі я ад'язджаў пасля школы са свайго Полацка паступаць на гістарычны факультэт Беларускага (адно па назве) універсітэта, маці, згадаўшы маладосць, з не ўласцівай ёй чуллівасцю сказала:

— Матэматыкаў будуць зваць піфагорамі, а вас — герадотамі...

Па вайне яна, закрэсліваючы ў падручніках імёны «ворагаў народа», галадуючы і мерзнучы ў інтэрнацкай стадоліне, дзе па двое ў вузкіх салдацкіх ложках вальтом спалі два дзесяткі дзяўчат, скончыла гістарычны факультэт педінстытута. Яна ўсё жыццё выкладала ў школе гісторыю, магчыма,

Мой бацька Аляксей — сялянскі сын з вёсачкі Стэцава, што схавалася ў яшчэ непавысяканых лясах Сенненскага раёна Віцебскае вобласці, між іншым, на той дзень, калі я пішу гэтыя радкі, апошняе на Беларусі вобласці, жыхарам якой яшчэ не пляцяць чарнобыльскія дамавінныя рублі.

Бацька паспеў адбыць перад вайною тэрміновую службу ў Адэсе, да якой назаўсёды захаваў у сваёй суровай душы прытоеную пяшчоту і куды паспеў звазіць мяне, васьмікласніка, за колькі гадоў да свае ранняе смерці. У дом свой вечны ён узяў ордэн Чырвонае Зоркі, а таксама медалі «За отвагу», «За боевые заслуги», «За оборону Сталинграда», «За взятие Будапешта» і з паўтузіна тых, якія давалі ўсім, хто быў на фронце, а таксама, напэўна, і ўсім, хто бясстрашна ваяваў з ворагамі народа ў тыле.

На здымках ваеннага часу я бачу старшага лейтэнанта Арлова пасля першага і другога раненняў; на вуліцах венгерскае і аўстрыйскае сталіц; у венскай піўніцы з ніштаватым кухлем у руцэ. Ці не гэтае фота натхняла мяне, калі на трэцім курсе мы з сябрам стварылі ў нас на гістарычным факультэце Клуб аматараў піва, што, як пазней стала вядома, стукачы з ліку аднакурснікаў абвясцілі ў сваіх сакрэтных рэляцыях нацыяналістычнаю арганізацыяй. Сакратар партбюро роднага факультэта ў часе разбору «справы» глыбакадумна зазначыў: «В Германии тоже всё начиналось с пива». Асаблівае шаленства выклікала ў выкладчыкаў марксізму-ленінізму створанае намі новае тэарэтычнае «вучэнне» — піваізм.

На адной з фатаграфій бацька сядзіць на лавачцы пад шыльдаю, з якой усміхаецца гумавашчокі мацак з падкручанымі і даўгімі, як у прусака, вусамі. Пакуль бацька пазіраваў перад той цырульняю ў венгерскім горадзе Сегедзе, ягоны сябра зайшоў пагаліцца і цырульнік-хартыст шырока — ад вуха да вуха — перарэзаў кліенту горла. Бацька не хаваў, што, знайшоўшы ў бакоўцы сябрава цела над поўным крыві тазам, ён разам з патрулём учыніў у той цырульні крывавы самасуд.

Атрымаўшы пасля вайны дыплом юрыста, бацька да апошніх дзён працаваў у пракуратуры; з гэтае прычыны ў мамінай вёсцы, дзе я штогод летаваў, усе, і дарослыя і дзеці, называлі мяне не інакш, як Пракурорам.

Праца, несумненна, адбілася на бацькавым характары. Ён быў маўклівы, замкнёны ў сабе чалавек, здаецца, без пачуцця гумару і з патаемным жаданнем калі-небудзь пераехаць у Адэсу. За маёй памяццю ён два разы плакаў. Першы — як займаўся школаю-інтэрнатам для дзяцей-інвалідаў.

Павесіўшы на фасадзе інтэрната лозунг «Всё лучшее — детям!», педагогі на чале з дырэктарам і сакратаром партыйнае арганізацыі (можна ўявіць, як яны праводзілі сходы, прымалі пастановы «в свете решений», а потым дзялілі свой д'яблаў заробак) бязбожна абкрадалі сваіх безабаронных выхаванцаў, трымаючы іх надгаладзь і збываючы налева нават іхнюю ўбогую, аднолькавую на ўсіх, як у турме, апратку.

Другі раз бацька плакаў, калі канаў ад раку і ніяк не мог памерці, бо яго магутнае сэрца, жывучы сваім асобным жыццём, не хацела спыняц-ца і праз месяц пасля таго, як ён ужо нічога не еў.

У свае апошнія дні ён гаварыў са мною так, як і я з ім — па-беларуску.

Нібы штосьці амаль неверагоднае, я ўспамінаю, што аднаго разу бацька прачытаў мне свой верш пра будаўніцтва Наваполацка. Колькі радкоў з яго я магу ўзгадаць і зараз. Не буду цытаваць іх, бо да літаратуры яны маюць дачыненне прыкладна такое самае, як і шматлікія творы вядомага паэта-лаўрэата М. Мяне ўражвае сам факт: мой бацька пісаў вершы!

Цяпер я перакананы, што гэта быў чалавек значна больш глыбокі і незалежны, чым некалі мне ўяўлялася.

Аднойчы, калі вецер раскідаў похапкам зладжаны ў нас на Дзвіне понтонны мост і мы з бацькам стаялі на беразе і глядзелі на людскую мітусню, ён з непрапіклівым тварам прамовіў вершаваную фразу са свае маладосці: «Течет вода Кубань-реки, куда велят большевики».

Калі тата быў ужо на Божай пасцелі, я папрасіў, каб ён — калі чалавечае існаванне працягваецца і **там** — паспрабаваў даць мне нейкі знак, напрыклад, затэлефанаваць у дзень майго нараджэння. Я баяўся, што ён абразіцца, але тата нечакана сустрэў маю просьбу з нейкаю ўсцехаю.

Яму не ўдалося дазваніцца, але праз колькі тыдняў ён — ужо **адтуль** — дапамог мне ў вельмі цяжкія дні.

Гэтыя дні пачаліся з таго, што вахцёрка нашага студэнцкага інтэрната ўвечары паклікала мяне да каменданта, дзе нібыта чакаў бацькаў сябра. Візітант аказаўся чалавекам з невыразным абліччам — з тых, якія праз пяць хвілін пасля сустрэчы надзейна сціраюцца ў памяці. Адзінаю адметнасцю ягонага твару былі маленькія, бескалёрныя вочкі-свярдзёлкі (ці, можа, дакладней, іголкі ад шпрыцоў), чые дотыкі-ўколы я адчуваў амаль фізічна. Абколваючы мяне з галавы да пятаў, госць паказаў чырвоную «корачку», з якой вынікала, што сярод сяброў майго бацькі пракідаліся і маёры Камітэта дзяржаўнай бяспекі.

Далей размова адбывалася прыкладна так:

— Орлов?

— Арлоў.

Владимир Алексеевич?

— Уладзімір Аляксеевіч.

— Родились в Полоцке тогда-то и тогда-то.

З гэтага моманту пытальнікі ў канцы сказаў зніклі.

— Окончили школу в Новополоцке в 1970 году.

— Жили на улице имени такого и такого в доме номер такой-то, квартира такая-то.

— Мать Мария Максимовна. Работает учительницей истории.

Мой візаві перайшоў амаль што на тэлеграфны стыль. Я ўжо не пацвярджаў, а толькі слухаў чамусьці вядомыя яму звесткі з майго жыцця.

Мне было дваццаць гадоў. Пад матрацам майго панцырнага інтэрнацкага ложка ляжаў абцёрханы нумар «Роман-газеты» з «Адным днём Івана Дзянісавіча» толькі што выкінутага з краіны А. Салжаніцына. Насупраць сядзеў не анекдотны (товарищ майор, организуйте чайку), а самы сапраўдны таварыш маёр, які вёў знаёмы па літаратуры і кінафільмах класічны допыт.

Апрача думак пра «Івана Дзянісавіча», я ўжо здагадваўся пра сваё галоўнае злачынства. Мае сябры з Наваполацкага політэхнічнага інстытута Вінцэсь Мудроў, Валеры Шлыкаў і сёй-той яшчэ, каго па розных прычынах я не хачу называць, пачалі выпускаць наогул бяскрыўдны, але беларускамоўны альманах «Блакітны ліхтар», дзе з'явіліся і мае вершаваныя опусы. Некалькі нумароў я прывёз у Менск і трымаў на дне валізы пад ложкам. Я амаль нікому іх не паказваў, але, як вядома з даўніх і з зусім нядаўніх часоў: дзе двое — там рада, дзе трэці — там здрада. Я яшчэ не ведаў, што на момант размовы з таварышам маёрам дапос пра існаванне нашага «Блакітнага ліхтара» ўжо быў напісаны (дарэчы, па-беларуску, — потым мне давалі яго начытаць) і куды след перададзены.

Але гэта ўжо зусім іншая гісторыя. Тым часам допыт працягваўся.

— Отец Алексей Артёмович.

— Так.

— Работает в Новополоцке прокурором.

— Не, — сказаў я.

— Как это нет? — хутчэй не здзівіўся, а абурыўся таварыш маёр.

— Не працуе, — пацвердзіў я, адчуваючы, як пачынаюць слабець ліпуча-халодныя пальцы страху, што сціскалі маю істоту.

— Почему?

— Таму, што ён памёр, — адказаў я.

Вочкі-свярдзёлкі замітусіліся і страцілі сваю вастрыню. Таварыш маёр, здавалася, ніяк не мог пагадзіцца з тым, што ягонае ведамства, якое ведала ўсё і ўсіх, магло так элементарна спудлаваць. Але ён зразумеў, што такімі рэчамі, як бацькава смерць, не жартуюць, і адразу неяк абвяў. Яшчэ былі нейкія пытанні, было папярэджанне, што пра нашую сустрэчу ніхто не павінен ведаць, але ён убачыў, што я ўжо не баюся і, пэўна, вырашыў «раскалоць» мяне, дачакаўшыся больш зручнага моманту.

Дзякуй табе, тата, што ты быў тады поруч са мною. Каб ты ведаў, як я шкадую, што не паспеў дасягнуць таго веку, калі мая і твая душы маглі б ператварыцца ў злучаныя між сабою ёмістасці: ты так і застаўся для мяне рэччу ў сабе.

Я нарадзіўся ў таты з мамаю ў год Змяі паводле ўсходняга календара і ў год смерці Сталіна — паводле савецкага. Мой дзень нараджэння ў жніўні, значыцца, у сакавіку, калі вялікі правадыр народаў нарэшце выправіўся на той свет, я ўжо існаваў, але мог не нарадзіцца, бо пасля радыёпаведамлення мама пачулася зусім блага. Свет гінуў, ад роспачы мама ў істэрыцы рвала валасы і надоўга трапіла ў бальніцу. Але тым разам савецкая медыцына перамагла і, перачакаўшы, відаць, непамысныя для мяне дні задыякальнага знаку Льва, я шчасна нарадзіўся на трэці дзень Паненкі.

Мы жылі ў скарбовым драўляным доме, якога ўжо не існуе. Акурат на месцы нашага дома і саду цяпер Палац культуры вытворчага аб'яднання «Шкловалакно» і, калі з Нью-Йорка прыязджаў беларускі спявак Данчык, я з сябрамі на гэтым месцы марна спрабаваў растлумачыць госцю, што гэта такое — Палац культуры.

Дом быў падзелены перабойкаю на дзве часткі: у адной месціліся народны суд і гарадская пракуратура, у другой — нашая двухпакаёвая кватэра. Мой дзіцячы ложак стаяў пры сцяне, за якою былі нежылыя памяшканні. Часам я спалохана прачынаўся сярод ночы і, сцяўшыся пад коўдраю, слухаў, як за сцяною хадзілі, прыцішана гаманілі і чыркалі запалкамі нейкія людзі. Мяне апаноўваў не проста страх, а страх, змешаны з невымоўнаю гідлівасцю; кшталт таго страху я перажыў нядаўна ў лесе, убачыўшы на альховай галіне над галавою клубок вужакаў. А тады, у маленстве, мая пасцель рабілася мокрая ад халоднага поту (а на самым пачатку свядомага жыцця, напэўна, не толькі ад поту), і я, не маючы болей змогі трываць гэтую пакуту, клікаў на паратунак маму. На мой голас заўсёды падыходзіў тата. Ён гладзіў мяне цяжкой даланёй па галаве, казаў нешта супакойлівае, і я засынаў. Калі праз шмат гадоў, ужо ў студэнцтве, я са смехам узгадаў тыя начныя страхі, бацька, не падтрымаўшы жартоўнага тону, сказаў, што там, за сцяною, у гэбістаў было патайнае месца сустрэч з сексотамі, і я спасціг прычыну свайго прасякнутага агідаю дзіцячага страху — я трапляў у магутнае біяполе чалавечае нізасці і подласці. Мне дагэтуль незразумела, чаму бацька не пераставіў ложак да іншае сцяны: няўжо такім чынам гартаваў мяне да будучага жыцця?

Маё маленства смялася і плакала на старадаўніх, на шчасце, яшчэ не зруйнаваных дазвання вулачках тысячагадовага Полацка, але пра пошукі скарбаў і лёхаў, што вядуць з полацкіх храмаў на той бок Дзвіны, пра выпрабаванні смеласці на вузенькім гзымсе вакол купала Багаяўленскага сабора, дзе мы пісалі на ржавай блясе імёны дзяўчынак, што нам тады падабаліся, пра Мікалаеўскі сабор, які ўзнялі ў паветра на нашых дзіцячых вачах (захаваліся дакументы, з якіх вынікае, што пасля гэтага гарвыканком выдаткаваў з гарадскога бюджэту 40 тысяч рублёў «на вывоз мусора») — пра ўсё гэта іншым разам.

У першы клас я пайшоў у 1960 годзе, калі да абяцанага Хрушчовым камунізму заставалася ўсяго дваццаць гадоў і ў сталоўках ужо можна было задарма пад'есці хлеба с гарчыцаю або соллю. Здаецца, якраз у той год у Полацку зачынілі — вядома, па просьбах бацькоў і наогул усіх працоўных — апошнюю беларускую школу.

Не памятаю, каб у нашым тагачасным полацкім жыцці было хоць што-кольвек беларускае. Прыгадваю адно выкладзенае цэглаю на аблезлым фасадзе двухпавярховае камяніцы і шмат гадоў абсалютна незразумелае мне слова «Лазьня» с дарэформавым мяккім знакам, якое пазней, відаць, таксама па просьбах працоўных, пераклалі на ўсім зразумелую мову.

Калі я вучыўся ў другім класе, Хрушчоў гаварыў на XXII з'ездзе пра забойства Кірава і іншыя крывавыя справы Сталіна, што з лагоднаю ўсмешкаю зазіраў з п'едэстала ў вокны нашае 1-й полацкай сталінскай школы. Мы з сябрам Колькам слухалі хрушчоўскі выступ па радыё разам з мамаю ў нас дома.

(Працяг на стар. 14—15).

ТЭАТР: камерцыя і культура

Мы ідзём шляхам спроб і памылак, пераймаючы з розных савецкіх і замежных сістэм механізмы гаспадарання і кіравання, якія не заўсёды могуць упісацца ў наш сацыякультурны кантэкст. Пошукі новых ідэй і рашэнняў павінны, на маю думку, абапірацца на навуку. Вось прыклад з апошніх доследаў: высвятленне грамадскае думкі пра дзейнасць СТД Беларусі і ацэнка рэспубліканскай тэатральнай сітуацыі. На сацыялагічныя апытанні адказаў кожны пяты член СТД.

БОЛЬШАСЦЬ апытаных адзначаюць павелічэнне ролі СТД у тэатральным жыцці грамадства — 69%, горада — 32%, у жыцці саміх творчых работнікаў — 58% рэспандэнтаў. Пазітыўную ацэнку дзейнасці саюза звязваюць перш за ўсё з работай у галіне паляпшэння матэрыяльных і сацыяльных умоў жыцця работнікаў тэатра, асабліва гэта тычыцца пенсійнага забеспячэння. Многія рэспандэнты падкрэсліваюць узрослы аўтарытэт СТД БССР у краіне ў цэлым, асабліва значнасць міжнародных і рэспубліканскіх акцый — арганізацыю фестываляў, аглядаў, мерапрыемстваў (53% апытаных). У той самы час трэць анкетаваных лічаць, што СТД не аказвае істотнага ўплыву на тэатральны працэс. Гэта тычыцца механізма рэалізацыі прапаноў і канкрэтных мерапрыемстваў, выказаных на пленумах, пашыраных пасяджэннях прэзідыума, семінарах.

Самыя розныя людзі сыходзяцца на тым, што ўпаў прэстыж тэатра ў грамадстве, няма новых тэатральных ідэй, інстытута крытыкі, творчых лідэраў, пагоршаў псіхалагічны клімат у калектывах і ўзровень прафесійнага майстэрства акцёраў. Кожны другі апытаны ўказвае на недабратворны псіхалагічны клімат у калектыве (у асяроддзі акцёраў), гэтую ж акалічнасць падкрэсліваюць 67% апытаных творчых работнікаў. Такое размеркаванне адказаў сведчыць пра досыць сур'ёзны патэнцыял сацыяльна-псіхалагічнай канфліктнасці ў творчых калектывах, і ў сувязі з гэтым — пра неабходнасць уважлівага і ўзважанага падыходу да вырашэння дадзенай праблемы. У першую чаргу, гэта датычыць праблемы аховы сацыяльных і прафесійных правоў творчых работнікаў (54% рэспандэнтаў лічаць, што ў гэтай сферы абставіны змяніліся ў горшы бок, 30% — засталіся ранейшымі).

На думку большасці апытаных, найбольш прыкметныя змены ў лепшы бок адбыліся ў галіне аховы ад адміністрацыйнага ўмяшальніцтва ў творчы працэс (73%), спосабах фарміравання рэпертуару (49%), магчымасці творчага пошуку (36%), паляпшэння матэрыяльных умоў жыцця работнікаў тэатра (35%). Крытыкі робяць акцэнт на камерцыялізацыі тэатра, адзначаюць невысокі інтэлектуальны і мастацкі ўзровень драматургіі, адсутнасць новых тэатральных ідэй, безабалічнасць вядучых тэатраў рэспублікі, слабую падрыхтоўку рэжысёрскіх і акцёрскіх кадраў, недастатковую прапаганду сцэнічнага мастацтва (56%).

Дадзеныя даследавання дазваляюць у нейкай меры суаднесці рэальную тэатральную сітуацыю з грамадскай думкай, настроем творчых работнікаў. Іх бачанне, агульная ацэнка сітуацыі па некаторых параметрах супадае з думкай гледачоў.

ПА ВЫНІКАХ апытання гледачоў, з навуковага асяроддзя, паменела колькасць студэнтаў, г. зн. груп гледачоў, якія традыцыйна арыентаваны на нацыянальны тэатр і складаюць вядучую групу гледачоў. Яны папракаюць тэатр у страце традыцый. Для большасці гледачоў купалаўскі тэатр — прадстаўнік нацыянальнай школы. Хоць зараз 17% гледачоў ідуць на «любімых акцёраў», усё ж найбольш падрыхтаваная аўдыторыя адзначае зніжэнне іх прафесійнага майстэрства, шмат у чым незадаволена рэпертуарнай палітыкай тэатра. Гледачы хацелі б бачыць народныя драмы, гістарычную хроніку, камедыі, творы нацыянальных аўтараў (да прыкладу «Тутэйшых» Я. Купалы, п'есы У. Караткевіча). Рэпертуарная палітыка тэатра ў цэлым арыентавана на масавую аўдыторыю, скарачаецца доля рэпертуару, адрасаваная спанатраным аматарам сцэнічнага мастацтва.

Шмат у чым мае рацыю рэжысёр тэатра В. Раеўскі, які сцвярджае, што тэатральная сітуацыя адэкватна адлюстроўвае падзеі ў грамадстве і пакуль не будзе зруху ў краіне, цяжка чакаць асаблівых зменаў і ў тэатры. Даследаванне тэатра па-за сацыяльным кантэкстам, паводле рэжысёра, асуджана на няўдачу. Выйсце са складанага становішча В. Раеўскі бачыць у канкрэтнай дзейнасці тэатра. Гэта пазіцыя прываблівая для многіх рэжысёраў. Апаненты В. Раеўскага — народны артыст СССР Р. Янкоўскі, крытык Т. Ратабыльская, мастацтвазнаўца Г. Барышаў сцвярджаюць, што ў нашых умовах кантрактная дзейнасць у заходнім варыянце — заўчасная. Патрэбна прадуманая сістэма сацыяльнай, прафесійнай абароны работнікаў тэатра. Дзяржаўныя тэатры з'яўляюцца здабыткам рэспублікі і мусяць атрымліваць пэўную датацыю.

У сучаснай сацыякультурнай сітуацыі, адзначаюць шмат якія псіхолагі, чалавек знаходзіцца ў стане «эмацыянальнага дэфіцыту». Невыпадкова для многіх гледачоў характэрна жаданне «атрымаць эмацыянальную разрадку», «адпачыць, забыцца на штодзённыя справы», «далучыцца да незвычайнага», «забыцца», «зняць напружанне». Свет тэатра многія бачаць як «свята душы» і для іх эстэтычная рэальнасць не павінна судакранацца з рэальнай рэчаіснасцю. Сацыялагічны дослед фіксуе павелічэнне долі гэтай групы гледачоў у складзе аўдыторыі (у 70-я гады — 17% аўдыторыі, цяпер — 43% глядзельнай залы). Цікавы той факт, што частка моладзі (узроставая група 15—19 гадоў) разглядае мастацтва, у тым ліку і тэатр, як адну з форм псіхалагічнай дапамогі. Тэатр неабходны тады, калі ўзнікае пачуццё адзіноты, безвыходнасці — у крытычныя хвіліны жыцця. 12% рэспандэнтаў адказалі, што тэатр мог бы даць магчымасць духоўнай апоры, жыццёвую арыентацыю, магчымасць пошуку альтэрнатыўных рашэнняў, выйсце з тупіку. На самай справе тэатр не прадастаўляе магчымасці гэтай групе гледачоў рэалізаваць свае за-

ЗАКОН ПРЫРОДНЫ, ЗАКОН ЧАЛАВЕЧЫ

«ХАМ» паводле Э. Ажэшкі ў Акадэмічным тэатры імя Якуба Коласа

Заідэалагізаваны тэатр апошніх дзесяцігоддзяў прывучыў гледачоў да таго, што ад спектакля заўсёды чакаеш актуальнай канцэпцыі, гранічнай яснасці і акрэсленасці творчай пазіцыі, калі ўсе маральныя акцэнты, нібыта тычкі, навідавоку. Новы спектакль коласаўцаў «Хам», традыцыйны па рэжысуры, разбурае гэты стэрэатып глядацкага разумення і ўспрымання. Тэатр ні на што не прэтэндуе, нікога не абвінавачвае. Бескарыслівая чалавечая дабрыня персанажаў зачароўвае залу. Па сённяшнім часе паказной міласэрнасці, ўсеагульнай бязлітаснасці і ўспышак крыўдлівага самалюбства незапатрабаваныя жыццём душэўнасць і дабрыня ўспрымаюцца асабліва востра. Яны тым больш нечаканыя, бо спектакль зроблены паводле аповесці, якая нібыта штурхае да меладраматычных эфектаў і маралізавання. У спектаклі самі паняцці дабра і зла не трапляюць пад сумненне, але імі не вычэрпваецца багацце чалавечых перажыванняў.

Здаецца, учынкі гераіні гэтага спектакля Франкі пераходзяць усе межы дазволенага, вытлумачальнага чалавечым розумам («Бес у цябе ўсяліўся, Франка, бес», — гавораць ёй аднавяскоўцы): кінула мужа, уцякла невядома куды з маладым каханкам. Усімі адрынутая, вярнулася да Паўла з чужым дзіцем, не спадзеючыся на дараванне. Павел даруе ёй. Але за дабрыню і ласку Франка адплаціла яму на свой манер: спакусіла маладога мужавага пляменніка і атруціла самога мужа... Дзіўна, ды тэатр не асуджае Франку, нібыта пакідаючы ёй час для суда над сабою.

У параўнанні з аповесцю, дзе галоўным героем з'яўляецца Павел, у спектаклі дзейнічае дуэт раўнапраўных персанажаў: Франкі — С. Акружной і Паўла — У. Куляшова, які вызначае новае прачытанне аповесці рэжысёрам Б. Эрыным. Не так важна, ці зможа паладзіць прастадушны ў шчасці і няшчасці вясковы рыбак, які не бачыў свету, акрамя ракі і лодкі, з легкадумнай, прывучанай да гарадскіх апранахаў, выгод і штодзённых уражанняў «паненкаю». Тэатр захоўвае спачувальны тон аўтаркі, далікатнасць, паэтычнасць яе светаўспрымання. Але, скарыстаўшы фарбы акварэльнай палітры ў абмалёўцы вобразаў, рэжысёр прапануе ўласны псіхалагічны малюнак іх руху.

Павел даруе гэтай жанчыне ўсё: злосць, нявернасць, лайдацтва... Тое, што не стасуецца з ягонымі ўласнымі ўяўленнямі пра маральнае. Здаецца, усю ягоную простую філасофію пра тое, што чалавек, якому добра жывецца, не будзе злобіцца і злаваць, спраўджаны лёс Франкі адмаўляе. Ды, падобна, няўдачы і супярэчнасці ўласнага жыцця не могуць пахіснуць Паўлавай веры ў ісціны, што адкрыліся яму, як вышэйшая праўда. Ён паступае нібы насуперак здароваму жыццёваму сэнсу, насуперак таму, што чакае ад яго вёска: моц і глыбіня ягонага пачуцця перамагаюць. Вяскоўцы, папляткарыўшы пра бязладнае сямейнае шчасце Паўла і асудзіўшы Франку, пагаджаюцца: як чалавеку добра, дык і ўсім добра.

Павел у выкананні У. Куляшова цэльны як глыба чалавек, не схільны да самакапання, прызвычаіўся ва ўсіх сваіх няўдачах вінаваціць адно сябе. Ён пачынае і канчае свой дзень малітвай, нязграбна водзіць пальцам па святой кнізе, напаўняючы яе словы нейкім сваім, патаемным сэнсам. Прыслухоўваецца да голасу ўласнага сумлення, намагаючыся зразумець, чаму так неспакойна і цяжка на сэрцы, што рабіць, каб зняць з сябе груз крыўды і пакутлівага болю, ды каб не пайсці супраць сумлення. Мацней за грамадскую думку, за самалюбства і нават за ўласную смерць — страсць да Франкі, якая У. Куляшовым выяўляецца ў спакоі, глыбокім і доўгім маўчанні, толькі калі-нікалі — у ласкавых зваротах да жанчыны і зрэдчас — да неба, да Бога... Не было б

«Хам» паводле Э. АЖЭШКІ. С. АКРУЖНАЯ (Франка) і У. КУЛЯШОЎ (Павел).
Фота А. ДЗМІТРЫЕВА.

патрабаванні.

Можна меркаваць, што гэтая група гледачоў арыентуецца на кампенсацыйную функцыю тэатра, і для шмат каго з іх духоўны катарсіс як мэта тэатральнага ўздзеяння падмяняецца сацыяльным катарсісам. Рост колькасці дадзенай групы гледачоў у рэальнай аўдыторыі тэатра сведчыць аб складаных працэсах, што адбываюцца ў нашым грамадстве і, відаць, адлюстроўвае ў нейкай ступені духоўную раз'яднанасць людзей, парушэнне працэсаў адаптацыі і сацыялізацыі ў навакольным асяроддзі. Ці можа тэатр арыентавацца на запатрабаванні дадзенай катэгорыі гледачоў? Цяжка сказаць адназначна, але ўлічваць інтарэсы гледачоў і ведаць сваю аўдыторыю тэатр павінен. Падрыхтаваная аўдыторыя таксама звяртае ўвагу на дэфіцыт «дабра», «прыстойнасці», «годнасці», «міласэрнасці», «спачування» і ўвогуле «яркай індывідуальнасці» сярод герояў сучаснай драматургіі.

АКЦЁРЫ хутчэй улоўліваюць гэтыя настроі; па сутнасці, сам тэатр выступае як мікрамадэль грамадства. Кожны трэці апытаны акцёр гаворыць пра невысокі ўзровень сучаснай драматургіі. «Героі сучасных п'ес часцяком бедныя, прымітыўныя, нецікавыя», «адчуваеш стому ад дэманстрацыі «дна», «сметнікаў», «валтузні ў ложку» — такія выказванні сутракаюцца досыць часта.

Акцёры востра рэагуюць на раз'яднанасць у калектыве, дэстабілізацыю «эстэтычнага стану», застой у сферы творчасці. Як ні парадаксальна, акцёры скардзяцца на «дэфіцыт узаемаадносін», «эмацыянальны голад», «адсутнасць сяброўскага пачуцця», «падтрымкі і разумення», «суперажывання і спачування», «дабрыні і міласэрнасці», «увагі і чуласці». З аднаго боку, атмасфера ў творчых калектывах адлюстроўвае грамадскую атмасферу; з другога боку, няма такой тэатральнай ідэі ці такой ідэйна-мастацкай платформы, якая магла б згуртаваць трупу. Акрамя таго, акцёры востра адчуваюць сваю сацыяльную неабароненасць, і ў савецкіх умовах кантрактная дзейнасць прыдатная далёка не для ўсіх тэатраў, далёка не для кожнага акцёра.

Нестабільнасць грамадскага жыцця, пустыя прылаўкі, талонная сістэма адштурхоўваюць ад тэатра не толькі шырокія пласты насельніцтва, але і творчых работнікаў. Цяжка патрабаваць ад акцёраў высокай творчасці пры адсутнасці ўмоў для нармальнага чалавечага жыцця. І ўсё ж як быць з прэстыжам тэатра? Якія шляхі яго далейшага развіцця?

Мы часта гаворым пра новае мысленне, але яно мае на ўвазе сувязь з культурай і духоўнай арганізацыяй усіх грамадскіх працэсаў. Неабходна змяненне сістэмы прыярытэтаў — **культурная арыентацыя грамадства.** Не замкнёная культура соцыума, абмежаваная палітычнай культурай, а наадварот — соцыум можа існаваць унутры культуры.

Ва ўсім свеце развіваецца эканоміка культуры, эканоміка інфармацыі. Паўстае праблема эфектыўнага развіцця якасці жыцця шляхам селекцыі інфармацыі па культуры і мастацтву. У Англіі за мінулы год культура і мастацтва далі нацыянальнага прыбытку 17 мільярдаў долараў, — як і тамтэйшая аўтапрамысловасць. У нас жа адсутнічае стратэгічнае мысленне і, па-ранейшаму, мізэрныя ўклады ў культуру і адукацыю, а іх значэнне толькі дэкларуецца.

Тэатр — мова ідэй, вобразаў, сімвалаў, прароцтваў, міфаў. Паводле сваёй спецыфікі тэатр можа зрабіць вельмі многа — стварыць культурную ініцыятыву, асяроддзе, умовы для кансалідацыі народа, адраджэння культуры, духоўнасці. Чарнобыльская трагедыя паставіла не толькі праблему неабароненасці, негарантаванасці самога быцця, а і праблему пераемнасці і захавання традыцый, культуры, нарэшце, будучыні нацыі. Што будзе з культурай Гомельскай і Магілёўскай абласцей, Палессем, калі людзі ўжо раз'язджаюцца ў розныя бакі, а ў будучым гэта будуць закрытыя зоны? Асэнсаванне трагічнасці нашага існавання, пошукі выйсця з нашай складанай сацыяльнай сітуацыі, сувязь духоўнасці і культуры, маралі і палітыкі — ці ж гэта не матэрыял для тэатра? Тэатр можа памагчы ў асэнсаванні гэтых працэсаў, паказаць спецыфіку нацыянальнага ўспрымання: светабачання, разумення навакольнага свету і складаных сацыяльных праблем — тым самым падрыхтуе ўмовы для кансалідацыі нацыі.

НА ЖАЛЬ, разбурана прастора тэарэтычнай думкі з нагоды складаных працэсаў, што адбываюцца ў тэатры: няма ні часопісаў, дзе абмяркоўваліся б гэтыя праблемы, няма праслойкі людзей, якія б узнавілі ўсю сістэму апазіцыі і дыскусіі ў гэтай сферы, г. зн. няма сістэмы калектыўнай дзейснай думкі. Адсутнічаюць і якія б там ні было універсальныя рэцэпты вырашэння праблем. На парадак дня паўсталі пытанні дзейнасці саюза, звязаныя ў першую чаргу з павелічэннем актыўнасці сваіх членаў арганізацыі, праўлення СТД. Патрабуе вырашэння і пытанне аб адпаведнасці метадаў і сродкаў рэалізацыі ініцыятыў творчых работнікаў. Узнікае пільная неабходнасць распрацоўкі праграмы прапаганды і далучэння да тэатра маладых гледачоў, стратэгіі фарміравання глядацкай аўдыторыі. Што ж датычыць развіцця новых мадэляў тэатра, распрацоўкі эфектыўнага механізма яго дзейнасці, дык, відаць, неабходна падумаць аб падрыхтоўцы тэатральных «менеджэраў», спецыялістаў у гэтай галіне. Тэатр будуецца і на камерцыі, і на культуры.

Валянціна ІЎЧАНКА,
кандыдат філасофскіх навук.

Генадзь Іванавіч

Да 80-годдзя з дня нараджэння народнага артыста СССР Г. ЦІТОВІЧА

Трохі больш як чатыры гады назад ён яшчэ жыў. Нават невылечная хвароба не паўплывала на ягоную натуру. Блізкія сябры, якія наведваліся да яго ў страшную бараўлянскую бальніцу, здзіўляліся духоўнай моцы, жыццястойкасці, дасціпнасці Генадзя Іванавіча — а было ж ужо не да жартоўных размоў...

Здаецца, што і цяпер не пакінуў нас яго сонечны дух — часцінка цэласнай, няўрымслівай і апантанай натуры. Справа не толькі ў тым, што імя Генадзя Іванавіча Цітовіча злучылася з назвай Дзяржаўнага акадэмічнага народнага хору БССР — калектыву, які ён заснаваў, выпеставаў і да апошняй часіны шанаваў сваёй увагай ды парадай. Справа не толькі ў тым, што дом № 9 па вуліцы Казлова, якую ён упарта называў пастарамінску Даўгабродскай, адзначаны, нарэшце, мемарыяльнай дошкай з выявай слыннага насельніка. Справа ў тым, што памяць пра Цітовіча жыве сярод многіх і многіх людзей.

Для кагосьці ён — «бацька народнага хору», для кагосьці —сябра самадзейных спевакоў, для кагосьці — душа мастацкага савета, для кагосьці — гаваркі, вясёлы, просты дзядзька, які вандраваў па краі ў пошуку яшчэ не занатаваных народных песень; для кагосьці — добры дзівак, які адзначаў сваё 70-годдзе, плывучы ў лодцы па маляўнічай рацэ...

Ёсць многа людзей рознага ўзросту, якія ведалі Цітовіча, шанавалі яго як фалькларыста, як хормайстра, як асобу. Яны памятаюць няспынную Цітовічаву скарагаворку, памятаюць ягоныя расказы — захопленыя і сакавітыя. Памятаюць таксама, што яшчэ пры жыцці Генадзя Іванавіча хадзілі пра яго ці то легенды, ці то незласлівыя анекдоты, а мо былі гэта ўсяго толькі нявыдуманыя гісторыі, у якія досыць часта трапляў ён — самабытны неспакойны чалавек.

Ён дбаў пра культуру не на словах — учынкамі сваімі ратаваў ад сканання родную песню. І ёсць надзея, што імя самога Генадзя Іванавіча зберагуць-уратуюць людзі, каб засталося яно не адно толькі радком музычнай хрэстаматыі ці ў энцыклапедыі. Бо, дзякаваць богу, для сённяшніх нашых чытачоў, дый многіх, многіх людзей, якія, можа, ніколі не трымалі ў руках «ЛіМ», не трэба тлумачыць, хто такі быў Генадзь Іванавіч і як цяпер не хапае ягонага голасу нашай культуры.

С. БЕРАСЦЕНЬ.

Генадзь Іванавіч Цітовіч. Май 1973 года.

Дзяржаўны народны хор БССР.

З Васілём ЗУЕНКАМ. 1985 год.

Фота А. КАЛЯДЫ.

Франкі, Павел ніколі б не перажыў такога яркага і пакутлівага душэўнага жыцця. Моцны, дужы, ён бездапаможны перад маленькаю Франкай, у характары якой С. Акружная парадаксальна спалучае рысы абаяльнага, але капрызлівага і жорсткага дзіцяняці-жанчыны.

Не схільная доўга заседжвацца на адным месцы і прырастаць да людзей, какетлівая пакаёўка ў вёсцы ганарыцца сваім гарадскім паходжаннем. Хоць і з ганарыстай злосцю выкрыквае Франка сведчанні сваёй высакароднасці, ды яны смешныя і недарэчныя. Якое там паходжанне ў сірацiны, якая з маленства гадавалася ў чужых людзей! Яе раптоўная пагарда да хамаў, да мужыкоў —толькі праява нежадання змірыцца з уласнаю доляю, прыняць чужы лад жыцця. Яна нядаўна кляла горад, цяпер згадвае яго з асалодай і не праміне самай дробнай магчымасці вырвацца з самотнага вясковага засценка. Так людзі, вырваныя з асяроддзя свайго натуральнага жыцця, страціўшы ўсялякую надзею на іншае жыццё, не змогшы прыстасавацца да ўмоў і змірыцца з імі, азлабляюцца, вар'яцеюць, выбрыкваюць... На злосць усім і сабе.

Калі Павел, адзін у свеце родны Францы чалавек, прыняў яе назад, яна, удзячная, шчыра хацела зрабіць усё, каб яму падабацца. Ды ёй, бачыце, цесна ў рамках працавітай і разумнай гаспадыні, — у рамках, што сама сабе ўсталявала. Спакушэнне маладзёна Данілкі, якое скаланула ўсю вёску, С. Акружная разумее і падае хутчэй як спробу гераіні вярнуць былую вольніцу, пажыць хоць бы водгуллем старога жыцця, па якім яна нудзіцца. Гэта не праява гіпертрафіраванай пачуццёвасці, і Франка злуе на вяскоўцаў, якія перашкодзілі ёй быць сабой.

С. Акружная падае Франку на рэзкіх кантрастах. Суіснаванне ў адным чалавеку супярэчлівых рысаў і якасцяў, многія з якіх набываюць уласцівасці сваіх супрацьлегласцей, утварае тэатральны і жыццёвы аб'ём вобразу. Калючая, вострая ў рухах і непрадказальная ў рэакцыях, Франка С. Акружной мяняецца на працягу ўсёй дзеі, ды ў гэтай зменлівасці захоўвае дзіўнае пастаянства. Якімі б супярэчлівымі ні здаваліся паводзіны яе гераіні — гэта заўсёды паводзіны цэльнай, паслядоўнай у сваёй супярэчлівасці асобы.

У спектаклі коласаўцаў Павел ніколі не б'е Франку. Ягоны цяжкі кулак заўсёды нерухома застывае ў паветры. Ці ж можа ён груба дакрануцца да жанчыны, што дала яму столькі шчасця і... няшчасця? Павел мацней шкадуе Франку, як пакутуе праз яе. Рэжысёр спектакля не дае Францы падставы (важнай у аповесці) помсціць Паўлу за абражаную годнасць. Толькі важкасць і значнасць ягонай пагрозы збіць разлютавалі Франку. Словы яна перажывае як дзеянне. Але і ў сцэнах атручвання мужа Франка С. Акружной не выказвае нянавісці да Паўла.

У фінале спектакля Франка палохаецца самой сябе, як быццам угледзеўшы свой звыродлівы адбітак у крывым люстры. Забойства — не насланнё, не страшны сон, гэта— рэальнасць, якой Франка проста баіцца даць веры. Актрыса знаходзіць апраўданне нечаканаму ўчынку гераіні не ва ўскладнёнай псіхалагічнай матывоўцы забойства, а ў рэзкай змене жанравай формы ролі, звяртацца да эксцэнтрычных, вострых прыёмаў. Сутыкненне разнажанравых фарбаў нечакана выяўляе глыбіню і непрасталінейнасць чалавечай свядомасці, здольнасць здзіўляцца і жахацца ўласных спраў — ці ж я гэта, ці ж са мной гэта? Са складаных сцэнічных і жыццёвых сітуацый актрыса выводзіць сваю гераіню, не дазваляючы гледачу ўсумніцца ў яе душэўнай чысціні.

...Мо Павел У. Куляшова «забіў» Франку бескарыслівасцю дабра і ўсёдараваннем? Няўжо ён, які нічога не апраўдваў, але ўсё дараваў, і цяпер — нібыта вярнуўся з таго свету: каб ратаваць сваю злачынную жонку і маліць Бога выратаваць яе,— Франка звар'яцела...

Тэатр прапануе і іншы варыянт адказу. У кожным чалавеку ёсць нешта, праз што ён не павінен пераступаць. Пераступіўшы, ён становіцца на шлях самазнішчэння. Вядома, між прыродай і чалавечай этыкай існуе адвечнае супярэчанне, але інстынкты чалавека прыроднага не бяскрыўдныя і, бывае, даводзяць да кровапраліцця. Прырода не падпарадкоўваецца законам, якія чалавек усталёўвае для сябе, але свой суд чалавек спраўляе па гэтых маральных законах.

Уладзімір МАЛЬЦАЎ.

Роздум пасля Грунвальда, або Вяртанне да артыкула «ЦІ БУДЗЕМ МЫ НАЦЫЯЙ?»

(Пачатак на стар. 5).

скіх культурна-асветных арганізацый. Мала таго, ведаючы прэтэнзіі палякаў на Познань і іншыя землі, акупаваныя Прусіяй, кайзераўскі ўрад быў зацікаўлены ў польскай актыўнасці на Беларусі і ў Літве. Дык вось, у той час працэнт польскага насельніцтва быў такі: у Гарадзенскім павеце — 5,6; у Сакольскім — 1,1; Беластоцкім — 34,1; Ваўкавыскім — 2,3; Слонімскім — 1,6; Пружанскім — 1,4; Бельскім — 34,9; Берасцейскім — 3,9; Кобрынскім — 2,3; Віленскім — 24; Свянцянскім — 6; Вілейскім — 2,5; Ашмянскім 1,7; у Лідскім павеце — 4,6 працэнта. З газеты «Наше утро», што выдавалася ў Горадні (№ 17 за 21 студзеня 1919 г.), можна даведацца, з якое кнігі ўзятыя гэтыя лічбы.

Адкуль жа пасля рэпрэсій 1939 — 1941 гг., пасля канфрантацыі першых пасляваенных гадоў, пасля дзвюх хваляў польскае эміграцыі на Гарадзеншчыне набралася не менш як 300 тысяч палякаў, што, паводле сцвярджэння п. Рышарда Кацынэля, намесніка старшыні Саюза палякаў на Беларусі, складае 27 працэнтаў усяго насельніцтва? Здаецца, я адказаў на гэтае пытанне. Пра нацыянальна-рэлігійную палітыку польскіх уладаў мае апаненты могуць прачытаць не толькі ва ўжо названых публікацыях. Сёлета ў Беластоку асобнай кніжкай выйшла грунтоўная праца нябожчыка а. Льва Гарошкі «Пад знакам «рускае і польскае веры». Пачытайце даследаванне гэтага святара, якога прымалі Папы Рымскія і якога чорнаю фарбаю аблівалі ў беларускім савецкім друку (асабліва — член Саюза пісьменнікаў Алесь Бажко): вы ўведаеце, як пілсудчыкі падрывалі каталіцкую веру ў Заходняй Беларусі, як ставілі ў няёмкае становішча Ватыкан, як лілі ваду на млын сталінізму.

Е. ВАШКЕВІЧ, Р. Кацынэль, А. Якаўлеў у лістах, польскі генеральны консул па тэлебачанні абураюцца тым, што я абразіў свой народ: напісаў, што за чачавічнае варыва многія сталі палякамі. Панове, дазвольце мне з маім народам размаўляць шчыра. Вы маглі прачытаць таксама, што пры санацыі не ўсе пайшлі на згодніцтва і згоду. Многія католікі бараніліся як маглі, а іх за гэта кідалі ў астрогі. Не толькі простых вернікаў, але і святароў — як, напрыклад, а. Вінцэнта Гадлеўскага, перакладчыка Евангелляў і Дзеяў Апосталаў, якога потым (у час вайны) за беларускі патрыятызм арыштавала і знішчыла СД. А што беларускіх святароў пазбаўлялі парафій, працы, дык гэта было звычайнаю з'явай. Нават з Бацькаўшчыны выганялі — як, напрыклад, а. Яна Тарасевіча, доктара і прафесара (чытайце ягоную кнігу «На Бацькаўшчыну», што выйшла ў 1936 г. у Вільні). Але такіх — духоўна ўстойлівых, да канца адданых — беларусаў-каталікоў была меншасць. І трэба аб гэтым шкадаваць. Зрэшты, і сярод праваслаўных былі згоднікі. Згадаем тут мітрапаліта Дыянісія і Гарадзенскага епіскапа Саву (Саветава) — праваднікоў палітыкі «польскага праваслаўя». Успомнім, што пасля вайны гэтую палітыку працягваў мітрапаліт Макарый.

Пасля вайны выгадна стала быць «рускім». Дзеля кар'еры, дзеля смачнага кавалка хлеба сотні і сотні тысяч беларусаў, «касцельных палякаў» (тэрмін а. Уладзіслава Чарняўскага) і палякаў адмовіліся, забыліся на сваю мову. Але ці заўважылі вы, як хораша зліліся польскі і рускі дух у нашай краіне? Улада гаворыць па-рускі, а карыстаецца польскімі назвамі, накінутымі ў XVII ст.: Хойнікі, Навагрудак, Брэст, Гродна... Уладзе больш да спадобы польская назва нашай сталіцы, чым адвечная —Менск. Мой карэспандэнт з Ваўкавыска А. Кананові́ч піша пра тое, што ў гарадскіх школах на Гродзеншчыне цяпер хутчэй пачуеш польскую гаворку, чым беларускую, што такую палітыку праводзіць таварыш Сямёнаў. А ўспомніце выступленне на сесіі Вярхоўнага Савета ваўкавыскага сакратара Жэбрака, які даводзіў, што на падуладнай яму тэрыторыі трэць насельніцтва — католікі і, значыць, палякі. Дык ці выпадае тутэйшым палякам жаліцца на сваё гаротнае становішча? Нешта я не чуў, каб таварышы Сямёнаў, Арцыменя, Жэбрак гарою ўсталі за беларускія школы... Дый Экзарх Філарэт — шчыры прыяцель польскай іерархіі. Экуменізм? Але экуменізм за кошт беларушчыны. Слушна піша Д. Абрамчыкаў: «...Беларуская Праваслаўная Царква не што іншае як рэгіянальнае аддзяленне Рускай Праваслаўнай Царквы. Гэта значыць, што РПЦ будзе працягваць русіфікацыю беларусаў, але ўжо пад шыльдай БПЦ. Цудоўны ход! Брава, РПЦ!» Протаірэй Святадухаўскага кафедральнага сабора а. Георгій Латушка (беларус), выступаючы перад студэнтамі і выкладчыкамі, кажа, што Святое Пісанне цяжка перакладаць на беларускую мову, і дадае: «Видимо, язык такой». І ўжо зусім, даводзяць праваслаўныя святары, нельга перавесці на беларускую мову літургію. А як жа спраўляюцца з гэтым архіепіскап Мікалай, праваслаўныя беларусы ў Польшчы? (Прыехаўшы ў Гарадок Беластоцкага ваяводства, я атрымаў падарунак: праваслаўны малітаўнік, выдадзены сёлета студэнтамі-беларусамі з дабраславення архіепіскапа Савы Беластоцкага-Гданьскага).

Русіфікацыя і паланізацыя. Мой карэспандэнт В. Вахільчук з Берасцейшчыны апавядае, як адзін пажылы ксёндз прыехаў на высвячэнне адноўленага касцёла і адкрыта агітаваў не за каталіцкую, а за польскую веру, за Польшчу і польскі ўрад. Я даўно ведаю гэтага ксяндза, памятаю, што казаў пра яго Уладзімір Караткевіч (ён таксама ведаў гэтага святара), таму і не сумняваюся ў праўдзівасці інфармацыі. Перад ад'ездам у Польшчу дазнаўся, што Польская Каталіцкая Царква не толькі Катэхізм, але і малітаўнікі друкуе кірылічным шрыфтам, ды польскімі словамі.

Пабыўшы трохі ў Польшчы, разумею, што ў руках польскага клеру, у паланізатараў ёсць, груба кажучы, казырныя карты. Заходнебеларускае насельніцтва жыве ўспамінамі пра сваю зямлю, сваю гаспадарку. Ідэал эканамічнай свабоды вабіць і моладзь, якая, бадай, нічога не ведае пра нацыянальны прыгнёт у міжваенны час. Цяпер у Польшчы ёсць усё — абы грошы. У нас жа ёсць грошы, але паліцы ў крамах пустыя. На сто нашых рублёў у Польшчы можна купіць, напрыклад, тры модныя парасоны; у нас — даплаціўшы пару рублёў — два, але пабегаўшы і пашукаўшы. Праўда, харчы дарагаватыя. Але ж адно пакрывае другое. Людзей з працягнутай рукой я бачыў толькі ў касцёле св. Яна ў Варшаве. Дык і ў нас ля цэркваў і касцёлаў сустрэнеш іх. Польскія вёскі выглядаюць годна. Драўляныя дамы ўбачыш рэдка.*

Нашым палітыкам і «аграрнікам» у Вярхоўным Савеце пара зразумець: толькі свабода прадпрымальніцтва, толькі эканамічная свабода грамадзян надае ім годнасць, у тым ліку і нацыянальную.

Наогул, змагаючыся за суверэнітэт, незалежнасць Рэспублікі ў эканамічнай і палітычнай сферах, мы ані на хвілінку не павінны забываць пра духоўную самастойнасць народа. На поўны голас мы павінны адкінуць тэорыю «триединого богоносного народа», ад якое патыхае згубай для нас. На поўны голас мы павінны бараніць сваю мову ў святынях, у школах, у друку, тэатры, на радыё, тэлебачанні, эстрадзе. Пара нам мець беларускамоўны Вярхоўны Савет, урад.

...ПАДОБНА НА ТОЕ, што праваслаўе не ўлічвае сваіх памылак. У XVI ст., калі пачалася Рэфармацыя, праваслаўная іерархія адмовілася перавесці літургію на жывую мову народа, хоць гетман Рыгор Хадкевіч (той самы, што прыняў у Заблудаве Івана Фёдарава), прапаноўваў ёй грошы на выданне адпаведных кніг. Вынік? Праваслаўе пацярпела фіяска. Найбольш разумныя іерархі перайшлі на ўсходнекаталіцкую веру і павялі за сабой народ. Унія, між іншым, была і пратэстам супраць падпарадкавання аўтакефальнай Царквы на Беларусі і Украіне маскоўскаму патрыярху, які праводзіў палітыку царызму, «трэцяга Рыма». Аднавіўшы ў XIX ст. з дапамогаю цароў свае пазіцыі, расправіўшыся ў 20-я гг. з беларускай аўтакефаліяй, прыняўшы сергіянства, Праваслаўная Царква, мусіць, думае, што і цяпер ёй удасца абаперціся на свецкую ўладу. У Расіі, мабыць, так і атрымаецца. Але не на Украіне. Не на Беларусі. БПЦ не заўважае, што каталіцкае духавенства зноў апераджае яе. Свядомыя беларусы (моладзь, інтэлігенцыя) аддаюць перавагу касцёлу. На першай беларускай Мшы, якую адпраўляў 8 ліпеня ў Чырвоным касцёле ў Мінску а. Уладзіслаў Завальнюк, я бачыў праваслаўных, бачыў тых, хто памятае, што іх продкі былі грэка-каталікамі. У Баранавічах, дзе беларускае набажэнства вядзе а. Анатоль Гей, у касцёл прыходзяць, зноў жа, не адны каталікі.

У той дзень, як я слухаў Святую Мшу на Грунвальдскім полі, біскуп Тадэвуш Кандрусевіч служыў па-беларуску ў касцёле на Кальварыі. Гэта была першая Мша, адпраўленая Яго Эксцэленцыяй цалкам па-беларуску. І зноў у касцёле было шмат праваслаўнае моладзі, інтэлігенцыі, якім дарагая памяць аб продках. Хоць пад Грунвальдам змагаліся і загінулі тысячы праваслаўных, БПЦ не адзначыла гадавіну перамогі. Як павінен ставіцца да такое царквы вернік-патрыёт?

Мой карэспандэнт з Магілёва (на жаль, ён неразборліва напісаў сваё прозвішча), апавядаючы пра тое, як народ у гэтым горадзе, затаіўшы дыханне, слухаў казанне Яго Эксцэленцыі па-беларуску, успамінае, што ў адным з заходніх раёнаў ён бачыў іншую карціну: тамтэйшы пробашч да беларусаў прамаўляў па-польску. Аўтар ліста пытае: «...аб якой любві да бліжняга размова, калі духоўныя айцы цураюцца мовы сваёй паствы? Што гэта, непавага, элементарная нетактоўнасць?..»

Пытанні слушныя. І ўсё ж будзем рэалістамі. Ежы Вашкевіч піша: «...ксяндзы-палякі, нават тыя, якія ведаюць беларускую мову, адпраўляюць мшу па-польску. Але жадаюць гэтага самі вернікі...» І тлумачыць: «Літургія — рэч кансерватыўная, а каталіцкасць на Беларусі здавён злучана з польскаю моваю». У тлумачэнні пан Ежы не мае рацыі. У XVI ст. айцы езуіты, прыйшоўшы ў Вільню дзеля таго, каб вярнуць народ з пратэстантызму, найперш навучыліся беларускай мове і прамаўлялі казанні па-беларуску; яны ж у 1585 годзе выпусцілі першы беларускі каталіцкі Катэхізіс. У XX ст. беларуская мова ў касцёлах уваскрасала. Я, здаецца, ужо давёў, хто выганяў яе з святыняў. Вернікі (пераважана пажылыя людзі) хочуць польскае мовы таму, што іх прывучылі да яе, а некаторыя і таму, што памятаюць, якія пераследы ўчыняліся за беларускую мову ў касцёле і ў школе. Нават арцыбіскуп Эдвард фон дэр Роп, які спрыяў беларушчыне, зведаў гнеў польскіх уладаў; нават біскуп Жыгімонт Лазінскі быў запалоханы.

Цяпер, калі па-беларуску да народа Божага звяртаюцца і біскуп, і простыя святары — айцы Уладзіслаў Чарняўскі, Анатоль Гей, Ян Матусевіч, Уладзіслаў Завальнюк, некаторыя іншыя, — ёсць надзея, што колісь запалоханыя вернікі ўспомняць і пра Кастуся Стэповіча, пра Аляксандра Астрамовіча, Фабіяна Абрантовіча, Адама Станкевіча, Язэпа Германовіча, Вінцэнта Гадлеўскага, Станіслава Глякоўскага, пра іншых (іх імёны вядомыя Богу) змагароў за Беларускую Каталіцкую Царкву. А што датычыць нацыянальна свядомых беларусаў, яны заўсёды памяталі пра іх, яны заўсёды чакалі, калі святары загавораць да іх у беларускай мове. Як бачым, беларускае Мшы хочуць і праваслаўныя, нашчадкі грэка-каталікоў. Таму і йдуць у касцёл. Успомніце, пане Ежы, грубую рускую прыказку: какой поп, такой и приход. Быць ці не быць Беларускай Каталіцкай Царкве — цяпер найперш залежыць ад духавенства. Я пісаў, што Беларусі патрэбна Духоўная Семінарыя. Пра гэта піша-це і Вы. Пра гэта рупіцца мансеньёр Тадэвуш. Рупіцца, наколькі ведаю, пра беларускую Семінарыю. Значыць, ёсць падставы для аптымізму.

...А. ЯКАЎЛЕЎ, пішучы пра мяне, слова **гісторык** узяў у двукоссе. Што ж, яго права. І тым не менш, я, збольшага ведаючы гісторыю Беларусі, гісторыю беларуска-польскіх адносін, буду заўсёды пільна сачыць за падзеямі. Хіба я магу змаўчаць той факт, што адзін з лідэраў палякаў у Літве, народны дэпутат СССР Ян Ціхановіч у газеце «Единство», якую выдаюць тамтэйшыя «інтэрнацыяналісты», праводзіць ідэю стварэння нейкай усходнепольскай рэспублікі на тэрыторыі сучасных Беларусі і Літвы. А як жа! База ёсць: Гарадзеншчына і Віленшчына, дзе, паводле звышаптымістычных ацэнак, жывуць сотні і сотні тысяч палякаў. Мяне, хто помніць аб Рыжскім трактаце, палохае зліццё польскага культурна-асветніцкага руху з грамадзянамі тыпу Уладзіслава Шведа, Яна Ціхановіча, тыпу нашых дзеячаў, якія варожа настаўлены да беларушчыны. Я буду заўсёды выкрываць і супрацоўніцтва духоўных асоб з дзеячамі такога кшталту. Лічу сваім абавязкам змагацца супраць русіфікацыі і апалячвання нашага народа праз Праваслаўную і Каталіцкую Цэрквы, бо я перакананы: калі Богу было заўгодна, каб на зямлі з'явіўся беларускі народ, Яму заўгодна, каб гэты народ звяртаўся да Яго і славіў Яго ў сваёй мове. Каб не паўтараліся памылкі і прыкрасці мінуўшчыны, лічу сваім абавязкам нагадваць пра іх. Нават калі гэта камусьці і не падабаецца.



«...Ад удзячных нашчадкаў». Беларуская дэлегацыя, якая прымала ўдзел ва ўрачыстасцях.
Фота У. ШУБЫ.

* Падкрэсліваю: польскія вёскі. Пра беларускія вёскі ў Польшчы трэба весці асобную гаворку.

З пошты «ЛіМа»

ЗАКОН І ТОЛЬКІ ЗАКОН

Да пытання аб рэгістрацыі БНФ

ПЫТАННЕ гэтае мае два аспекты: юрыдычны і палітычны. У такой паслядоўнасці іх і трэба разглядаць — спачатку юрыдычны бок справы з рэгістрацыяй БНФ, з потым ужо палітычны, бо дзеянні кожнага дзяржаўнага органа, якія выяўляюць палітыку дзяржавы ў той ці іншай сферы, павінны ажыццяўляцца строга ў адпаведнасці з законам.

Юрыдычны аспект разглядаемага пытання заключаецца ў тым, ці правамоцныя былі дзеянні дзяржаўных органаў, якія фактычна адмовілі Беларускаму народнаму фронту ў рэгістрацыі?

Найперш адзначым, што артыкул 49 Канстытуцыі БССР дае грамадзянам рэспублікі права аб'ядноўвацца ў грамадскія арганізацыі, якія спрыяюць развіццю палітычнай актыўнасці і самадзейнасці, задавальненню іх разнастайных інтарэсаў. Парадак рэгістрацыі нанова ствараемых грамадскіх арганізацый дагэтуль рэгулюецца Указам ЦВК БССР ад 3 мая 1932 года, дзе галоўнай умовай для рэгістрацыі вызначаецца адпаведнасць статутаў таварыстваў і саюзаў Канстытуцыі БССР (арт. 7, ч. 2).

У статуце БНФ сказана: «Беларускі Народны Фронт за перабудову «Адраджэнне» — гэта масавы грамадска-палітычны рух за перабудову грамадства і адраджэнне беларускай нацыі на прынцыпах дэмакратыі і гуманізму, развіццё культуры карэннага насельніцтва і ўсіх нацыянальных меншасцяў у Беларусі.

БНФ дзейнічае ў межах Канстытуцыі і законаў БССР, у адпаведнасці са сваёй праграмай і Статутам».

Галоўнай мэтай БНФ вызначана ўсталяванне дэмакратычнага грамадства, дасягненне рэальнага суверэнітэту. У якасці асноўных прыёмаў дзейнасці статут БНФ называе вывучэнне і аналіз становішча ва ўсіх сферах эканамічнага, палітычнага, сацыяльнага і культурнага жыцця Беларусі; правядзенне сходаў, канферэнцый, семінараў; святкаванне памятных нацыянальных датаў; удзел у барацьбе за дэмакратызацыю выбарчай сістэмы, а таксама ўдзел у выбарчых кампаніях; супрацоўніцтва з іншымі грамадскімі, дзяржаўнымі, савецкімі, партыйнымі органамі і ўстановамі ў ажыццяўленні планаў і праграм, якія адпавядаюць інтарэсам народа, і інш. Сваімі асноўнымі метадамі БНФ абвяшчае агітацыю, дыскусіі, асветніцтва (што таксама цалкам адпавядае патрабаванням Указа 1932 г.). У статуце адназначна сказана: «БНФ выступае супраць насілля і не адказвае насіллем на яго прымяненне». Да гонару ўдзельнікаў руху, яны ніводнага разу не парушылі гэты пункт свайго статута, выяўляючы тым самым палітычную сталасць і цывілізаванасць.

Уважліва прааналізаваўшы мэты, задачы, прыёмы і метады дзейнасці БНФ, адлюстраваныя ў ягоным статуце, хто возьме на сябе смеласць сцвярджаць, што яны супярэчаць Канстытуцыі? І тым не менш знайшліся такія органы, якія зрабілі заключэнне аб немагчымасці рэгістрацыі БНФ.

Прынцыпова важным момантам з'яўляецца тое, што ў існуючым заканадаўстве няма ніводнага слова пра неабходнасць адпаведнасці Канстытуцыі таксама і праграмы ствараемага таварыства ці саюза. Усе патрабаванні тычацца выключна статута.

І гэта натуральна. Бо цяжка ўявіць, каб праграмы той ці іншай грамадскай арганізацыі, партыі ці руху, якія ствараюцца, строга адпавядалі б існуючым уяўленням. Праграма — гэта заўсёды спроба, пераасэнсаваўшы мінулае і сённяшняе, зазірнуць у будучыню. Якія б гнуткія фармулёўкі ні выкарыстоўваліся б ў праграмах, яны ніколі не будуць адпавядаць становішчу спраў у палітыцы, эканоміцы, праве, ва ўсіх іншых сферах грамадскай свядомасці. Яны заўсёды будуць апярэджваць час, а таму і не адпавядаць ні існуючай Канстытуцыі, ні заканадаўству, якое дзейнічае. У гэтым іх галоўны сэнс, бо калі праграма грамадскай арганізацыі ці масавага руху адстае ад працэсаў грамадскага развіцця альбо ўсяго толькі канстатуе той ці іншы характар грамадскіх адносін, то яна ўжо не з'яўляецца праграмай у сапраўдным значэнні гэтага слова.

Вось чаму праграма БНФ не можа і не павінна адпавядаць Канстытуцыі і заканадаўству, якія дзейнічаюць сёння. Яна таксама можа не адпавядаць і нашым уяўленням пра будучыню беларускага грамадства. Гэта — толькі думка пэўнай групы грамадзян. А супярэчнасці з Канстытуцыяй пры жаданні можна знайсці нават у праграме КПСС.

Такім чынам, адмова афіцыяльных органаў зарэгістраваць БНФ на той падставе, што яго праграма не адпавядае Канстытуцыі, з'яўляецца парушэннем закона.

НЕЗРАЗУМЕЛЫМ з юрыдычнага пункту гледжання ўяўляецца і той факт, што ў аснову заключэння па праграме і статуце БНФ былы Вярхоўны Савет БССР паклаў думку Савета Міністраў, праваахоўных органаў, Акадэміі навук і... Белсаўпрофа. Уласнай думкі вышэйшы дзяржаўны орган рэспублікі так і не выказаў. Падпісаўшы заключэнне падначаленых яму органаў, ён самаўхіліўся ад гэтага пытання, перадаручыў яго вырашэнне выканаўчай уладзе. Ёй, а таксама грамадскім арганізацыям (АН БССР, Белсаўпроф) дасталося неўласцівае права тлумачэння законаў. У выніку адвольнага тлумачэння і з'явіліся нідзе не запісаныя нормы «права», адпаведна з якімі «на думку Савета Міністраў палажэнне праграмы БНФ павінна ацэньвацца з пункту гледжання іх адпаведнасці інтарэсам усіх пластоў і груп насельніцтва». Але ж хіба можна сёння назваць хоць бы адну грамадскую арганізацыю, якая сваёй праграмай задаволіла б гэтае патрабаванне?

Свой уклад у тлумачэнне заканадаўства зрабіў і Белсаўпроф. Чаго варты такі, напрыклад, папрок БНФ за тое, што яго праграма «аднаўляе тэрмін «нацыянальныя меншасці», які прымяняўся ў перыяд сталінізму, з распаўсюджваннем яго прымянення адпаведна колькаснаму складу насельніцтва?» Прафсаюзныя дзеячы, мабыць, ніколі не чыталі Маркса і Леніна, якія надзвычай шырока карысталіся гэтым тэрмінам... Нельга прызнаць кампетэнтным у юрыдычных адносінах і вывад Белсаўпрофа аб тым, што «ўвядзенне асобнымі рэспублікамі спецыяльных умоў, якія вызначаюць рэспубліканскае грамадзянства, можа паставіць значнае кола людзей ва ўмовы, калі яны не змогуць набыць грамадзянства ўвогуле». Сёння кожны з жыхароў рэспублікі фактычна мае двайное грамдзянства — БССР і СССР. Праграмай БНФ прадугледжваецца адзінае беларускае грамадзянства, і гэта зусім не будзе пярэчыць фактычнаму становішчу. Бо прыкметай цывілізаванасці любой краіны з'яўляецца як мага большая колькасць яе жыхароў з адзіным грамадзянствам.

Не абмінуў Белсаўпроф у сваім заключэнні і таго пункту праграмы БНФ, дзе ідзе гаворка пра цэнз аседласці. Але ж падобны цэнз таксама маюць многія цывілізаваныя краіны. Тым больш, што ў праграме БНФ прапануецца ўвесці яго толькі ў адносінах да грамадзян, якія прыязджаюць у рэспубліку на пастаяннае жыхарства. Цэнз гэты можа быць скарыстаны для вывучэння дзяржаўнай беларускай мовы, для вызначэння новымі грамадзянамі свайго месца ў беларускім грамадстве.

Згаданыя прыклады — не адзінкавыя, але і яны паказваюць, што застанецца ад права, калі вышэйшы дзяржаўны орган самаўхіляецца ад яго тлумачэння. Пры ведамаснай «заканадаўчай цэнзуры» наўрад ці зможа нарадзіцца і нармальна функцыянаваць любая грамадская арганізацыя, бо абавязкова будзе каму-небудзь «замінаць».

ПАЛІТЫЧНЫ АСПЕКТ пытання аб рэгістрацыі БНФ найперш тычыцца адносін да дэмакратычнага руху з боку партыйна-дзяржаўнага кіраўніцтва рэспублікі. Увогуле, цяжка зразумець усю гэтую «важданіну» вакол рэгістрацыі БНФ, асабліва ўлічыўшы, што ні КПСС, ні ВЛКСМ, ні прафсаюзныя арганізацыі нідзе і ніколі не былі зарэгістраваны. Пэўнасць у гэтае пытанне павінен унесці будучы закон СССР «Аб грамадскіх арганізацыях», праект якога нядаўна абнародаваны.

Уяўляецца непераканаўчым той папрок у адрас БНФ, што ён фактычна з'яўляецца партыяй. Праграма і статут адназначна сведчаць, што БНФ з'яўляецца масавым грамадска-палітычным рухам. Аднак нават калі б Народны фронт і абвясціў сябе партыяй, гэта не супярэчыла б закону, бо ніводная з усіх нашых канстытуцый не забараняла стварэнне іншых партый, а толькі замацоўвала кіруючую ролю КПСС.

Не вытрымліваюць крытыкі і тыя пункты заключэння афіцыйных органаў, дзе БНФ папракаюць за скажэнне гісторыі Беларусі. Гэты момант трэба разглядаць шырэй: група грамадзян мае сваё бачанне гістарычных аспектаў беларускай дзяржаўнасці. І ніхто не можа пазбавіць іх права свабодна выкладаць уласныя меркаванні. Тым больш нельга ставіць па-за законам грамадскую арганізацыю, чыя пазіцыя не супадае з афіцыйным пунктам гледжання.

У заключэнні праваахоўных органаў і Акадэміі навук адзначаецца, нібыта БНФ дае блытанае азначэнне суверэнітэту. Між тым, у праграме і статуце фронту тэрмін «суверэнітэт» увогуле не тлумачыцца. Выказваецца толькі бачанне гэтай праблемы, а за будучай Канстытуцыяй БССР пакідаецца права раскрыць сапраўдны сэнс паняцця: «У новай Канстытуцыі БССР неабходна раскрыць паняцце суверэнітэту Рэспублікі і перагледзець артыкулы, якія абмяжоўваюць яго ці яму пярэчаць».

Толькі палітычнай непрымірымасцю і неабачлівасцю з боку афіцыйных органаў можна растлумачыць той факт, што замоўчваецца цэлы шэраг практычных мерапрыемстваў і прагрэсіўных ідэй БНФ. Напрыклад, першая сесія Вярхоўнага Савета БССР XII склікання абвясціла Беларусь зонай нацыянальнага экалагічнага бедства. Між тым, менавіта БНФ упершыню запатрабаваў гэтага ў сваёй праграме.

СЁННЯ Народны фронт таксама апярэджвае і КПБ, і іншыя грамадскія арганізацыі, далучаючы ўсё новыя прагрэсіўныя ідэі. Неабходнасць прыняцця закона аб інфармацыі, стварэнне камітэта па справах грамадзян, увядзенне суда прысяжных, адмена смяротнай кары, замена абавязковай вайсковай службы прафесійным войскам, нераспаўсюджанне тэрміну даўнасці на злачынствы сталіністаў, кампенсацыя ахвярам рэпрэсій і іх сем'ям прычыненых страт, — вось далёка не поўны пералік ідэй, выкладзеных у дакументах БНФ. Гэта дае і законнае, і маральнае права зарэгістраваць масавы дэмакратычны рух.

Вядома, не ўсе палажэнні праграмы БНФ з'яўляюцца бясспрэчнымі з пункту гледжання філасофіі, юрыспрудэнцыі, палітэканоміі. Але іх, думаецца, трэба разглядаць як стымул для далейшага пошуку найбольш аптымальных тэарэтычных рашэнняў надзённых праблем рэспублікі. Менавіта так, а не супастаўляць праграмныя палажэнні БНФ з Канстытуцыяй.

Беларускі народны фронт «Адраджэнне» павінен быць зарэгістраваны. Адмовіць яму ў гэтым сёння — значыць і далей працягваць беззаконне.

Яўген НОВІКАЎ,
народны дэпутат БССР.

ЗАМАХ НА ГІСТАРЫЧНУЮ МЯСЦІНУ

Адкрыты ліст народнаму дэпутату БССР, старшыні ТБМ імя Ф. Скарыны Н. С. ГІЛЕВІЧУ і народнаму дэпутату СССР, міністру народнай адукацыі М. І. ДЗЕМЧУКУ.

Жыхары г. п. Радашкавічы ганарацца сваім мястэчкам, якое мела Магдэбургскае права. Пасёлак — старажытнае паселішча, багатае гістарычнымі помнікамі. Тут праляглі шляхі-дарогі многіх вядомых дзеячаў славянскай культуры, навукі. Сярод іх былі ў розныя гады Уладзіслаў Сыракомля, Ядвігін Ш., мастак Язэп Драздовіч, кампазітар Рагаўскі, Францішак Багушэвіч, Янка Купала, Якуб Колас, Аркадзь Чарнышэвіч, Уладзімір Караткевіч, Адам Мальдзіс, іншыя шчырыя прыхільнікі купалаўскай спадчыны, якія сваім чароўным пяром адраджаюць матчыны песні, моцна гукаюць, каб жыло і дзейнічала слова Бацькаўшчыны. Працаваў старшынёй Радашкавіцкага гарпассавета вядомы камандзір партызанскай брыгады імя Ракасоўскага, дзе быў камісарам П. М. Машэраў, А. В. Раманаў. Партызанскія шляхі-дарогі прайшоў былы старшыня Радашкавіцкага райвыканкома першы дырэктар саўгаса імя Янкі Купалы, кавалер многіх ордэнаў, ганаровы грамадзянін Маладзечанскага раёна Л. В. Волкаў.

Ганарацца жыхары сваім славутым земляком, вялікім гуманістам, вучоным, акадэмікам, ахвярай Курапатаў Б. А. Тарашкевічам, які жыў і працаваў у мястэчку з 1923 па 1931 год. Ён жа складальнік першай беларускай граматыкі. Ягоны дзядзька Аляксандр Уласаў быў сенатарам польскага сейму ад сялян. Ён жа першы рэдактар Купалы, Коласа, Бядулі ў газеце «Наша Ніва». Дзякуючы яго намаганням і Язэпа Гаўрылкіна была адчынена беларуская гімназія ў Радашкавічах, дзе вучыўся і набіраў сілы, каб расправіць крылы для ўзлёту, народны паэт Беларусі Максім Танк. Камсамольцы гімназіі Таўпека, Скурко, Лавор, Сідаркевіч, Пальчэўскі трымалі цесную сувязь з Беларускай грамадою, якой кіравалі Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі з вёскі Максімаўка, што непадалёку ад Радашкавічаў. Словам, роднае слова палымяна гучала ў барацьбе за палітычныя свабоды, за развіццё ўласнай культуры.

Ганарацца радашкаўчане вырабамі «Белмастацкерамікі». Народная мастацкая ўзоры звонкай крыніцай роднай Бацькаўшчыны бруяць у многіх краінах свету.

Сёння ідзе адраджэнне паўсюдна не толькі культуры, помнікаў, экалогіі, — ідзе цвёрдым крокам змаганне за права людзьмі звацца. У пасёлку рэстаўрыруецца старая школа пад музей і дзіцячую музычную школу. Ініцыятарамі гэтай справы і актыўнымі памочнікамі з'яўляюцца члены рады Радашкавіцкай суполкі ТБМ. Але ж новая мясцовая ўлада чамусьці не лічыць мэтазгодным стварыць музей як духоўную скарбніцу для сваіх нашчадкаў. Неяк паспажывецку, без пэўнай этыкі ставяцца да народнай спадчыны. Мяркуюць размясціць танцавальныя гурткі або пачатковыя класы замест музея. Але ж і малому вядома, што сцены, выкладзеныя гіпсавымі плітамі ад падлогі да столі, не вытрымаюць розных падскокаў. Тым больш, што месца для танцаў у пасёлку хапае. Пустуе Дом культуры, былое памяшканне РК КПБ, дзе толькі два пакоі займае школа-інтэрнат, узводзіцца новы кінатэатр. Рада Радашкавіцкай суполкі ТБМ мяркуе стварыць гісторыка-літаратурна-краязнаўчы музей. Плануецца адкрыць такія залы: 1) народныя промыслы; 2) Радашкавічы — шляхі-дарогі славутых дзеячаў славянскай культуры; 3) гісторыя пасёлка і нашы землякі на карце Радзімы і па-за яе межамі; 4) краязнаўчы клас.

Людзі са спажывецкімі настроямі, з невысокім маральным укладам самавольна захапілі кавалак зямлі, дзе быў закладзены сад вядомым вучоным, пісьменнікам, легендарным разведчыкам брыгады «Штурмавая» Ф. М. Янкоўскім, які працаваў у Радашкавіцкай школе, і першым дырэктарам гэтай школы М. Ц. Раманоўскім. Дарэчы, школа гэтая — народная будоўля. Узводзілася сіламі жыхароў пасёлка ў 1947 годзе без дзяржаўных сродкаў. Дык чаму ў нас не шануюць гістарычныя мясціны, спажывецтва бярэ верх над розумам?..

Шчыра просім Вас, Ніл Сымонавіч і Міхась Іванавіч, паспрыяць адкрыццю музея, а таксама задаволіць і яшчэ адну просьбу жыхароў: адчыніць у Радашкавічах беларускую гімназію і дамагчыся, каб ёй прысвоілі імя Браніслава Адамавіча Тарашкевіча. Мы верым: Ваш высокі аўтарытэт народных дэпутатаў дапаможа вырашыць нашы праблемы.

Са шчырай павагай

С. БЕЛЫ, Н. ЛІННІК, Г. ПУСТАХОД, В. ЛАЗАР, А. ЗЯЛЕНКА, А. ПАДДУБНЫ, В. ТРОН, Т. НЕВЯРОВІЧ, Я. ЦІМАФЕЕВА, члены Рады Радашкавіцкай суполкі ТБМ.

МОЙ РАДАВОД ДА ПЯТАГА КАЛЕНА, або СПРОБА ПАЗБЕГНУЦЬ ВЫГНАННЯ

(Пачатак на стар. 8—9).

Тады я яшчэ не разумеў, чаму мама слухае з такой увагаю.

У той самы дзень мы з Колькам наважылі адпомсціць за невядомага нам таварыша Кірава: знайшлі мой «Букварь», выдралі адтуль партрэт Іосіфа Вісарыёнавіча, выкалалі яму ржавым цвіком вочы, спалілі партрэт на вогнішчы ў нашым садзе і вырашылі, што назаўсёды расквіталіся з найлепшым сябрам савецкіх дзяцей.

У тую самую восень бульдозер перакуліў і некуды завалок нашага «школьнага» Сталіна. Праўда, п'едэстал стаіць там і сёння, мусіць, недзе недалёка чакае і ягоны былы гаспадар.

Я пішу пра гэта, бо І. В. Сталін — таксама частка майго радаводу, як зрэшты, — хацелі б мы таго ці не,— і кожнага з нас. Хіба не сведчыць пра гэта лішні раз, напрыклад, нашая з Колькам помста за Кірава?

Праз колькі гадоў, класе ў сёмым, я даведаўся, што маю і асабісты рахунак да ўсяго таго, што ўвасабляў чалавек, якога мудры Анры Барбюс назваў некалі Леніным-сёння. Маці паказала мне даведку, якую я захоўваю цяпер сярод самых дарагіх дакументаў.

Верховный суд
Белорусской ССР
4 апреля 1963 г.
г. Минск
5-10
Справка

Дело по обвинению Денисова Максима Денисовича, 1881 года рождения, пересмотрено Верховным судом БССР 5 февраля 1963 г.

Постановление от 23 марта 1933 г. в отношении Денисова Максима Денисовича отменено и дело за отсутствием состава преступления прекращено.

Денисов М. Д. по данному делу реабилитирован.

Зам. председателя
Верховного суда БССР
С. ШАРДЫКО.
Тираж 10.000.

Да гэтае даведкі мне казалі, што дзед Максім хварэў і проста памёр.

Для ўсіх нас так і засталося загадкаю, якім было тое «данное дело».

Памёр у трыццатыя гады і другі мой дзед — Арцём. Наконт ягонага лёсу ніякіх даведак не прыходзіла, але з аднаго рэдкага бацькавага аповяду я запомніў, што дзед Арцём меў малатарню, а значыцца, і ўсе магчымасці паўтарыць шлях дзеда Максіма.

Тата, тата... Як рана ты пайшоў і як позна я вылупіўся з вопрадня інфантыльнасці...

На гаспадары малатарні дзедзе Арцёме абрываецца мужчынская лінія бацькавага роду. Далей — беспрасветны туман нават без намёку хоць бы на нейкае сямейнае паданне.

Намагаюся і не магу ўзгадаць аблічча сваёй бабулі па мячы—Просі. У «фамільным архіве» не ацалела, а мо ніколі і не было ніводнае яе фатаграфіі. Бабуля Прося колькі тыдняў глядзела мяне пасля таго, як, вярнуўшыся аднаго дня дадому, маці ўбачыла зарумзаных мяне з сястрычкаю і прачытала пакінутую на стале цыдулку, з якой вынікала, што нашая нянька, вясковае дзяўчо Паліна, падалася на камсамольскай пуцёўцы ўздымаць цалінныя землі. Як хутка высветлілася, тая пуцёўка чамусьці давала Паліне права прыхапіць з сабою маміну кофту і мае з сястрою срэбныя крыжыкі, атрыманыя пасля хрышчэння ў копыскай царкве.

Нанач баба Прося зазвычай апавядала мне яўна сваю ўласную нескончаную казку пра рыбіную вайну (памятаю, што бабуліна прыхільнасць у гэтай зацятай вайне заўсёды з нейкае прычыны была на баку шчупакоў), а раніцою я почасту знаходзіў пад падушкаю пачачак арабінавых цукеракдражэ.

Аднойчы я быў з татам у бабулі Просі ў Стэцаве. Ля ейнае хаты пасвілася каза; проста за парогам пачынаўся лес, і пра лесуна, які шмат разоў «вадзіў» яе, прыходзіў на падворак даіць казу і нават начаваў у хаце пад печчу ў калядныя маразы, бабуля апавядала прыкладна так, як магла б казаць пра суседа, што жыў цераз плот.

Яна памёрла, калі я хадзіў у трэці клас. Ужо ў студэнцкія гады разоў колькі я меўся з'ездзіць да бабы Просі на магілу, але ўрэшце так і не сабраўся. Часам я думаю, што спраўджу свой намер, калі здолею ўспомніць бабулін твар.

З другой маёй бабуляю — Аўгінняй гэтае праблемы ніколі не паўставала. У любы момант я магу лёгка выклікаць у памяці не толькі яе твар, але і голас, хаду, адчуванне ейнае сухой рукі, калі яна вяла мяне з сястрою на поплаў ці на гумнішча, каб пасадзіць на грудок і пачаць свой урок батанікі.

— Гэта здрыжнічкі,— казала бабуля,— гэта ястрэц, а вунь, на выжарыне, скрыпень зацвітае. Гэта во драсён, а гэта братаўка...

Калі цяпер я чытаю ў сяго-таго з нашых улаўраных майстроў прыгожага пісьменства пра «іван-чай», «маць-і-мачыху» і «івана-ды-мар'ю», пачынае здавацца, што безліч такіх прыгожых, трапных ды непаўторных назваў беларускіх красак і траваў ведаем ужо адно мы з сястрою.

Баба Аўгіння не сядзела, як яе сястра Грыпінка, за знахарства, аднак несумненна, таксама мела стасункі з загадкавымі, але наогул прыязнымі да чалавечага роду сіламі. Яна зашэптвала зубы (скрозь гады да мяне даносіцца ейны ціхі, падобны да духмянага шамацення сена ў адрыне шэпт: «Белае карэнне, чорнае каменне, сінія берагі...»), лекавала ячмень (чамусьці па-расійску: «Ячмень-ячмень, на тебе кукиш. Чего себе купишь? Купи себе топорок, руби себя поперек...»), выводзіла мышэй і «каціную драпу»...

Таемную бабуліну сілу я адчуваю і цяпер, праз трыццаць гадоў пасля яе смерці. Пакутуючы адзін час ад бяссоння, супроць якога не дапамагаў нават старажытны народны сродак — пакладзеныя ў галовах бурштынавыя пацерні, неяк уначы я выпадкова (?) узгадаў бабуліны ўрокі: адчуў сваю руку ў ейнай, пачуў яе голас, убачыў змаршчкаваты лагодны твар і серабрыстыя хвалі, што гнаў па высокай траве вятрыска, і—нібы ў якоесьці пухкае бяздонне, імгненна праваліўся ў сон. Назаўтра я зноў паспрабаваў гэтыя лекі, і з той начы бяссонне мне ўжо не пагражае.

Бабуля часта апавядала, які добры быў да людзей пан з суседняе вёскі, у якога яна служыла ў маладосці панаёўкаю. Думаю, што гэтыя чуллівыя прыгады можна вытлумачыць найперш пазнейшым шчаслівым жыццём у калгасе, але нават у самой панскае мянушцы — Брынка — мне, далібог, чуецца нешта прыязна-чалавечае, чаго нават з самай вялікаю фантазіяй не скажаш пра ацалелыя ў памяці старых вяскоўцаў мянушкі двух першых старшыняў тамтэйшага калгасу — Раўло і, перапрашаю, Галасрака.

Неўзабаве пасля рэвалюцыі бабуля Аўгіння ледзь не загінула.

Тады ў капысіцкае навакольле нейкім ветрам занесла цырыкавых артыстаў — мусіць, ратаваліся ад чырвоных ці белых з блізкіх Магілёва або Воршы. Адны старыя капысічане згадваюць цяпер, што ў галовах бурштынавыя пацерні, неяк уначы я выпадкова (?) узгадаў бабуліны ўрокі: адчуў сваю руку ў ейнай, пачуў яе голас, убачыў змаршчкаваты лагодны твар і серабрыстыя хвалі, што гнаў па высокай траве вятрыска, і—нібы ў якоесьці пухкае бяздонне, імгненна праваліўся ў сон. Назаўтра я зноў паспрабаваў гэтыя лекі, і з той начы бяссонне мне ўжо не пагражае.

Бабуля часта апавядала, які добры быў да людзей пан з суседняе вёскі, у якога яна служыла ў маладосці панаёўкаю. Думаю, што гэтыя чуллівыя прыгады можна вытлумачыць найперш пазнейшым шчаслівым жыццём у калгасе, але нават у самой панскае мянушцы — Брынка — мне, далібог, чуецца нешта прыязна-чалавечае, чаго нават з самай вялікаю фантазіяй не скажаш пра ацалелыя ў памяці старых вяскоўцаў мянушкі двух першых старшыняў тамтэйшага калгасу — Раўло і, перапрашаю, Галасрака.

Неўзабаве пасля рэвалюцыі бабуля Аўгіння ледзь не загінула.

Тады ў капысіцкае навакольле нейкім ветрам занесла цырыкавых артыстаў — музычным выхаваннем насельнікаў паблізных хатаў і нястомна паведамляла пра падзеі ў жахлівым капіталістычным свеце і ў краіне, якая, неўважаючы на перабої з хлебам, шпарка набліжалася да светлае будучыні.

Аднойчы мае вушы злавілі з радыёэфіру фразу, якая чымсьці збянтэжыла наіўны дзіцячы розум.

— Каждый советский человек,— сказаў рэпрадуктар,— знает имена Толстого и Горького.

Цэлы дзень гэтыя словы мулялі мне, і ўвечары я адважыўся на невялікі, так бы мовіць, сацыялагічны дослед.

— Бабушка,— запытаўся я,— ты знаешь, кто такой Толстой?

— Быў чалавек таўсты, во яму такое мяно і далі,— адказала бабуля.

— А кто такой Горький?—без асаблівае надзеі працягваў я.

— А во, кажуць, горкі, як рэдзька. Або яшчэ — як хрэн, горкі.

— Да нет, бабушка, я о писателях спрашиваю,— са складанымі пачуццямі і да радыё, і да бабулі сказаў я.

— Мая, дзетка, навука малая,— рахмана азвалася баба Аўгіння... — Травы ведаю, а чытаць ненавучаная.

Вядома, мне было ніякавата, што яна — такая старая і яшчэ не чула ні пра Талстога, ні пра Горкага, пра якіх я ведаў ужо ў першым класе, а мо і раней. Аднак болей мне рупіла іншае. Атрымлівалася адно з двух: або бабуля не савецкі чалавек, або радыё хлусіць.

— А ты, бабушка, советский человек? — запытаўся я.

— Як усе, так і я,— адказала бабуля.

— І галадавала, і палачкі ў калгасе за працадні палучала.

Я, дарма што малы, і сам разумеў недарэчнасць свайго пытання: усе навокал, у тым ліку і баба Аўгіння, яўна былі савецкія людзі. Фашыстаў, капіталістаў, гаротных амерыканскіх неграў, якія паміралі ад голаду, а таксама паліцэйскіх і гангстэраў, што палілі цыгары, пілі нейкія «віскі» і казалі «Шеф вами недоволен», гэтых і іншых, зазвычай страхалюдных несавецкіх людзей я бачыў адно ў кінафільмах. Адсюль вынікала дзёрзкая ератычная высноваі, якою я палічыў за лепшае ні з кім не дзяліцца: нашаму радыё нельга было верыць.

Кажуць, што яшчэ ў самыя змрочныя гады мая цішмяная бабуля аднаго разу выявіла непахісную цвёрдасць. Прысланы з раёна начальнік, што кватараваў у ейнай хаце, загадаў бабулі зняць з покуці абразы.

— Яны ў вас есці не просяць,— адрэзала баба Аўгіння з навёкам.

Добра памятаю, што яна прасіла Бога, каб узяў яе да сябе на пачатку лета, тады, калі адцвітаюць дзьмухаўцы і, калі верыць бабулі, зямля гэткая ж мяккая і лёгкая, як дзьмухаўцовы пух. Бабуліна сэрца спынілася, калі яна сядзела на ганку і крышыла карове буракі. Я пабег на поле па цётак. Мяне абурыла, што яны некалькі разоў перапытвалі: «Бабушка заснула?», хоць я недвухсэнсоўна сказаў, што яна памерла.

Гэта здарылася першага чэрвеня.

Пра свайго мужа, а майго дзеда Максіма бабуля мне ніколі не казала. Зрэшты, тады я быў малы дый не было яшчэ даведкі з дзесяцітысячным (?) накладам, і бабуля, пэўна, лічыла такія размовы небяспечнымі. Пра дзеда я найболей ведаю ад мамы.

У вайну, якую да 17-га года часта называлі Вялікай Айчыннай, а потым перахрысцілі ў першую імперыялістычную, дзед Максім як чалавек пісьменны (ён выпісваў перад вайною нейкую газету, і мне, вядома, хочацца, каб гэта была «Наша Ніва») даслужыўся да ўнтэр-афіцэра. Пад час страшных баёў на Нарачы, калі ў 1916 годзе расейскія войскі, дапамагаючы французскім хаўрусінкам, пачалі зусім непадрыхтаванае наступленне, дзед трапіў у палон. У Нямеччыне ён працаваў у баўэра і мог пераседзець рэшту вайны на сытных харчах, але разважыў іначай: у адну з цёмных начэй паклаў у кайстру два свежыя боханы хлеба і праз два месяцы дапяў роднае капысіцкае хаты.

У вёсцы лічылася, што дзед ведае «планэты», і звычайна ніхто не адважваўся раней за яго пачынаць сеяць або жаць. Той жа, хто, не даючы веры дзедавым здольнасцям, кіраваўся сваімі «планэтамі», мог потым наракаць адно на самога сябе. Калі капысічанаў загналі ў калгас, яны, мусіць, усё-такі маючы надзею, што можна будзе неяк пражыць і там, выбралі дзеда Максіма за брыгадзіра.

Праз тры гады наш далёкі сваяк, што служыў у раённым Шклове ў НКВД (я прынцыпова супраць беларусізацыі і гэтага і іншых падобных скарачэнняў), папярэдзіў дзеда і ягонага брата Ціхана, калгаснага бухгалтара, што на іх і яшчэ на дзесяць вяскоўцаў прыйшоў данос. Хапун, казаў сваяк, чакаўся вялікі, і, калі з'ехаць кудынебудзь на данбаскія шахты ці проста зашыцца месяцы на тры ў лес, усё абыдзецца, бо возьмуць іншых.

Дзед з братам сабраў у сваёй хаце сход тых дванаццаці, чые імёны ўжо перадрукоўвалі машыністкі НКВД. Думкі падзяліліся: адны стаялі на тым, каб ратавацца; дзяды Максім і Ціхан лічылі, што хавацца — значыцца, прызнаць, што яны і сапраўды ў нечым вінаватыя. Надзвычай дарагая мне і такая драбніца: на той зборні дзед Максім сказаў, што ўсё адно замест хаванцаў схопяць іншых, якіх ніхто нават не папярэдзіў.

Назаўтра трое «ворагаў народа» падаліся ў лес, а дзевяцёра засталіся ў вёсцы, спадзеючыся, што там разбяруцца. Людзі верылі, што ўлада, якая ўжо пятнаццаць гадоў называла сябе іхняю, хоць калі-некалі здатная на справядлівасць.

Па дзеда прыйшлі ў першы дзень 1933-га. Ён сядзеў на палку, плёў рэзгіны і, як запомнілася маме, спяваў:

Што рабіць мне, як мне быць?
Ці пакінуць ці любіць?

Мама басанож бегла за санямі да аселіцы.

Праз два тыдні бабе Аўгінні і іншым жонкам арыштаваных дазволілі перадаць ім у Шклове харчы і памяняць бялізну. Старую бялізну давялося спаліць, бо яна кішмя кішэла вошамі.

Наступнаю звесткаю пра дзеда была згаданая вышэй даведка на шэрым бланку, дзе не знайшлося месца хоць бы на колькі слоў крывадушнага казённага спачування. Чалавека забілі, але няхай вас суцешыць тое, што яго забілі ні за што, невінаватага. Праўда, я маю моцны сумнеў, што тыя, хто падпісваў такія даведкі ў шасцідзесятыя гады, і тыя, хто падпісвае іх цяпер, шчыра лічаць такіх, як мой дзед, невінаватымі. Яны сапраўды былі вінаватыя — у тым, што ведалі «планэты», што калісьці выпісвалі несавецкую газету, што ім людзі верылі болей чым розным камісарам і «люцыпанерам...»

Бабуля Аўгіння сустрэлася з дзедам Максімам на небе за два гады да таго, як дзяржава ашчаслівіла нас гэтым сведчаннем свае гуманнасці і некалькімі рублямі, якія маці з цёткаю адмовіліся атрымліваць.

Імя даносчыка, што загубіў дзевяць душ, пакінуўшы бязбацькавічамі без малага тры тузіны дзяцей, хутка адкрылася. Гэта быў самы недалужны капысіцкі гаспадар камбедавец Цыбулька.

— Наша горніца з Богам не спорніцца,— з дурным гонарам весела казаў ён пра сваю хаціну-развалюху, дзе адно на печы маглі сагрэцца ягоныя вечна галодныя дзеці.

Мамін брат дзядзька Язэп шмат разоў, выпіўшы дзеля смеласці гарэлкі, браў уначы стрэльбу і ішоў помсціцца за бацьку. Бабуля Аўгіння і мама з сёстрамі, галосячы, як па нябожчыку, беглі за дзядзькам да Цыбулькавае развалюхі. Ейны гаспадар спярша аднаго за адным выпускаў на падворак усіх сваіх восем дзяцей, потым жонку, потым выходзіў у споднім сам, і дзядзька Язэп, заплакаўшы ад бяссілля, паварочваў дахаты.

— Усё адно заб'ю! — крычаў ён.

— Няхай, сынок, яго Бог уваб'е,— жагнаючыся, казала бабуля Аўгіння.

Бог не спяшаўся, і Цыбулька пераваліў за дзевяць дзесяткаў. Аднойчы, калі я з вясковаю блазнотаю тоўкся каля крамы, дзе вечна выпівалі і пра штосьці спрачаліся капысіцкія мужчыны, сівенькі падпіты дзядок з чырвонымі слязлівымі вачыма паклікаў мяне пальцам, завёў у краму і купіў грамаў трыста зліплых у суцэльны кавалак ірысак. Змеціўшы такі манеўр, адзін з падкрамных пітакоў сурова сказаў мне:

— Выкінь цукеркі! Ён твайго дзеда прадаў!

У тым вяку «прадаць дзеда» значыла для мяне прыкладна тое самае, што і «прадаць мяне» — малодшая сястра штодня рабіла гэта, паведамляючы бабулі пра кожны мой вылаз у суседчыны вішні або трускаўкі. Адбегшыся ад крамы, я са смакам з'еў падораныя ірыскі, не чуючы да сівога дзядка анічога, апрача ўдзячнасці. Падумаеш, прадаў нейкага там ніколі не бачанага дзеда!..

Трое капысічанаў, што, не паслухаўшыся дзеда Максіма, схаваліся ад роднае ўлады ў лесе, памарозіліся, але засталіся жывыя. Адзін потым не вярнуўся з вайны, другі ўжо даўно перасяліўся на пагост пад старыя бярэзіны, а з трэцім у апошнія пагасціны на мамінае радзіме мы выпілі пляшку гарэлкі.

— Не паслухаўся нас, Воўка, твой дзед,— казаў ён,— а то б зараз з намі чарачку ўзяць мог. Здаровы быў Дзянісавіч, як гэты, каб яго халера, рускі багатыр Ілля Мурамец. Неяк на станцыі рэйку падняў...

Ад маці бабы Аўгінні — маёй прабабкі Пёклы засталося толькі гэтае імя, амаль ужо зраўнаваны з зямлёю грудок на капысіцкіх кладах і згадка пра тое, што прабабка страшэнна не любіла жоўтых кветак. Затое, хоць і страціўшы ўжо сваё імя, трывала ўвайшла ў няпісаныя дагэтуль аналы нашага роду ейная маці — гэта значыць, мая прабабка ўжо з дзвюма прыстаўкамі «пра».

Паводле маіх разлікаў, тое лета, у якое пры лесе ля капысіцкіх могілак стаяў цыганскі табар, было яшчэ за першым, царскім, прыгонам. Цыганяты займаліся экспрапрыяцыяй садавіны і яек. Цыганкі хадзілі па хатах, варажылі па руцэ і на картах, паказвалі розныя штукі; напрыклад, налівалі ў шклянку вады, перакульвалі яе на далонь, і вада не толькі не вылівалася, але хутка пачынала кіпець — за гэта гледачы мусілі разлічвацца кавалкам сала. Бывалі выпадкі, калі заварожаныя гаспадары выносілі смуглявым гасцям і цэлыя кублы або шасткі з кілбасамі. Цыганы ж мужчыны, удзень не грэбуючы штукарствам, дачакаўшыся свайго цыганскага сонца, чынна скарачалі ў наваколлі конскае пагалоўе. Адзін з іх сярод гэтых клопатаў і атрымаў ад мае прабабкі нешта больш істотнае, чым рэшата яек.

Кажуць, у такіх выпадках гены наймацней праяўляюцца праз некалькі пакаленняў. Баюся, што гэта праўда. Калі бачу цыганоў, душа мая трывожна і ўадначас соладка сціскаецца, і я нібыта чую ў ёй звон крышталёвых келіхаў. Раз-пораз кроў майго безыменнага чарнявага продка ўладна змушае мяне забыцца пра найпільнейшыя клопаты і з'ехаць на колькі дзён проста ў свет, начаваць у гатэлях і на вакзалах, ці, прынамсі, ад'ехацца на спадарожнай машыне на паўсотні кіламетраў ад горада і, закінуўшы рукі за галаву, да ночы ляжаць недзе пад стогам, сочачы аблокі.

У мяне нядобрае вока: варта мне пільна паглядзець на чалавека, як ён — асабліва, калі гэта жанчына,—спатыкаецца. Цыганкі ніколі не бяруць з мяне грошай за варажбу. Што да іхніх прароцтваў, дык, апрача ўсяго іншага, яны, нібы змовіўшыся, абяцаюць мне нейкую «наглую» смерць.

Цыганкаю была і тая юная, кучаравая і ўмелая дзеўчынёшка, якая зрабіла мяне мужчынам.

Калі я бачу сучасны табар: пасцеленыя паміж вакзальных лавак коўдры, мурзатых дзяцей, маладзёнаў, што проста ў прыцемным кутку могуць адважна займацца любоўю, мяне часам перасмычвае, але насуперак розуму вусны ўсё адно шэпчуць немаведама калі і як запалыя ў памяць словы «Лачо дывэс тумэн, гэ ромалэ! — Шчаслівай дарогі вам, цыганы!..»

На цыганскім сучку абломваецца жаночая галіна мамінага радаводу і застаецца апошняя мая надзея і паратунак — маміны продкі па мячы.

Прадзед Дзяніс, бацька дзеда Максіма, не вярнуўся з апошняе рускатурэцкае вайны. Калі ў менскім храме Аляксандра Неўскага, што на Вайсковых могілках, я перачытваю імёны беларускіх воінаў 30-й артылерыйскай брыгады і 119-га Каломенскага палка, палеглых 18 ліпеня 1877 года пад Плеўнаю — «Канониры Іосіфъ Вайшвіло, Іаковъ Чирка... Рядовые Іоаннъ Гунька, Францъ Тваска, Стефанъ Комаръ, Григорій Мурашка, Стефанъ Сысъ...» — зазвычай на імені «Іосіфъ Войничъ» ува мне пачынае звінець струна загадкавага хвалявання. Якая сувязь існуе паміж мною і гэтым воінам? Мажліва, ён ваяваў разам з дзедам, мажліва, спаў з ім побач на балгарскіх камянях, а мажліва...

Хто скажа, што пераважыць на вагах гонару: смерць за свабоду іншага народа ці жыццё, аддадзенае за вызваленне свае зямлі? І ўсё ж горка ад таго, што ўжо два стагоддзі, як на першую з гэтых шаляў — за свабоду нашых далёкіх і блізкіх суседзяў — пакладзена беларускіх жыццяў нязмерна болей, чым за свабоду ўласную.

Мой прапрадзед Баўтрамей, народжаны (паводле запісу на некалькіх дзівам ацалелых старонках царкоўнае кнігі) у 1830 годзе, меў ва ўзросце Хрыста магчымасць абраць другі з двух гэтых шляхоў.

Якраз у тых мясцінах Прыдняпроўя дзейнічаў атрад Ігната Будзіловіча, пазней расстралянага царскімі карнікамі ў Воршы. Звабліва думаць, што Баўтрамей валіў тэлеграфныя слупы, вазіў па вёсках паўстанцкі маніфест «чырвоных» і з адчаем асуджанага на смерць біўся з казакамі 26 красавіка 1863 года ў няроўным баі пад Пагосцішчамі. Але верагоднасць гэтага досыць малая. Архіўныя дакументы сведчаць, што сярод прыдняпроўскіх беларусаў непараўнана болей было не тых, хто пайшоў пад штандары Касы-Будзіловіча і Тапара — паўстанцкага начальніка Магілёўскае губерні Людвіка Звяждоўскага, а тых падманутых, што дапамагалі лавіць і забіваць інсургентаў, атрымліваючы ад улады пяць рублёў за жывога і тры за мёртвага.

Мяркуючы па імёнах, якія захаваліся ў матчынай праваслаўнай Капысіцы дасёння — Баўтрамей, Домна, Якуб, Базыль, Цыпрыян — мае продкі па кудзелі былі, бясспрэчна, уніятамі, або, дакладней, грэка-каталікамі ці каталікамі ўсходняга абраду. Як падлічыў адзін наш паважны гісторык, напрыканцы XVIII стагоддзя да уніі належала болей за тры чвэрткі жыхароў Беларусі, у праваслаўі ж заставалася толькі каля шасці працэнтаў. Такім чынам, мае суродзічы слухалі казані, спявалі і гаманілі ў храме са святаром пабеларуску. Яны ані не здагадваліся пра антынародную сутнасць уніяцтва, што пагражала беларусам знікненнем, ад якога іх выратаваў, вядома ж, бацюхна-цар з памагатымі ў 1839 годзе, перагнаўшы цэлы народ у расійскае праваслаўе, што вельмі хутка не пакінула ў храмах анічога беларускага.

На памятку пра царкоўнае «ўз'яднанне» па ўказу імператара Мікалая I быў вібіты вялікі медаль з вобразам Спаса Нерукатворнага і надпісам: «Отторгнутые насилием (1596) возсоединены любовію (1839)». Аб гэтай любові мог бы распавесці нам безыменны беларускі хлапчук з-пад Гародні, якога, як паведамляў у сваім «Колоколе» Аляксандр Герцэн, з хрысціянскаю міласэрнасцю хвасталі бізунамі, пакуль не прыняў прычасця ад праваслаўнага папа.

Мусіць, нешта ведаў пра тую любоў і мой продак-рыбар, што прыстасаваў царска-праваслаўную рэліквію пад грузіла. Разам з тым няма сумневу, што гэтая любоў, мэтаю якой было духоўнае заняволенне і перараджэнне нашага народа, дала плён ужо ў наступным пакаленні, дапамагаючы беларускім мужыкам ужо праз нейкія два дзесяткі гадоў зарабляць крывавыя царскія траякі і пяцёркі.

Я набліжаюся да пачатку мінулага стагоддзя, і свечка сямейнага падання, што асвятляе мне шлях, пакрысе ператвараецца ў маленькі агарак. Але перш чым патухнуць, зліўшыся з няпамяццю, яна яшчэ раз успыхвае, вырываючы з цемры апошняе імя — Баўтрамеевага бацькі Цыпрыяна.

Калі адкінуць відавочна легендарныя звесткі пра тое, што Цыпрыян «адбіў у француза самога Кутуза» і пасля быў узяты да яго за кухара, бо рабіў надзіва смачныя пханыя пальцам кілбасы (прычым генерал-фельдмаршал так яго любіў, што нават вазіў з сабою па тэатрах), дык атрымаецца, што мой прапрапрадзед нарадзіўся недзе паміж першым і другім падзеламі Рэчы Паспалітай. Полацкае, Віцеоскае і Мсціслаўскае ваяводствы ўжо былі захоплены Расійскаю імперыяй, і Беларусь, што ніколі не ведала рэкруцкіх набораў (бо Вялікае княства Літоўскае мела прафесійнае войска), пачала спраўна пастаўляць юнакоў спачатку на пажыццёвую, а потым на мала чым ад яе адрозную 25-гадовую царскую службу. Дарэчы, пад час напалеонаўскага нападу ў расійскім войску служыла, паводле некаторых падлікаў, не меней за 100 тысяч беларусаў. Не нашмат меней было іх напачатку і ў войску французскага імператара.

Што да супольных з генерал-фельдмаршалам паходаў майго продка па тэатрах, дык можа стацца, згадкі гэтыя не зусім і легендарныя. Ці не захавалася ў іх памяць аб прыгонным тэатры графа Зорыча, якому з 1788 года належаў недалёкі ад Капысіцы павятовы Шклоў? У Зорычавым тэатры наладжваліся паказы алегарычных балетаў з хорамі, міфалагічных пантамім, камедый і трагедый, камічных опер і феерый. Імёны шасці акторaў са шклоўскае трупы можна знайсці ў Беларускай энцыклапедыі. Чаму б не ўявіць, што мой продак Цыпрыян трапіў на нейкую з тых камедый ці феерый? І ці не ў тыя часы ўзнікла ў матчынай радзіне трывалая прыхільнасць да тэатральнага мастацтва, якую нядаўна пацвердзіў абураны ліст аднае з маіх цётак. «Ты там, дзетка, у сваім Мінску, — пісала цётка, па засвоенай у школе завядзёнцы, пагарджаючы знакамі прыпынку, якія я расстаўляю толькі зараз, — схадзі ў ваш тэатр і скажы, што калі прыйшоў чалавек у клуб на пастаноўку прыабшчыцца, як той ваш міністр па цілівізары казаў, к сталічнаму іскуству, дык няхай яго ў клуб пускаюць і ў ботах, і ў кухвайцы, бо ён, чалавек гэты,—тружаніца, і ў клуб адразу з фермы прыйшла, а на ферме ў нас гардзяробаў нямашака, бо каровы калгасныя могуць з галадухі ўсе нашыя гардзяробы за малінну з'есці».

За прапрадзедам Цыпрыянам пачынаецца сцяна непрасвяцімае цемры, у якой бясследна губляюцца карані майго радаводу; што да кроны, дык, спадзяюся, пра яе паклапоцяцца мае сыны і ўнукі, калі, вядома, не ўмяшаецца кашчавая рука Чарнобыля.

Апошняе, пра што, улучыўшы нагоду, хачу тут сказаць, — адкуль у мяне расійскае прозвішча.

Найперш пакаюся, што быў час, калі я зусім паважна меўся перамяніць яго на іншае і нават пачаў падпісваць тым, іншым свае літаратурныя практыкаванні. На шчасце, Бог утрымаў мяне ад больш рашучых захадаў, і я не зняважаў памяці вядомых і невядомых продкаў, большасць якіх, спадзяюся, належала ўсё ж да людзей сумленных.

Што датычыць самога прозвішча, дык трэба пачаць з таго, што калі Расія захапіла нашы «исконно русские» землі, Кацярына II, а потым ейны сын Павел I «пожаловали» тут свайму дваранству 208,5 тысячы душ «мужеска полу». Па мужчынскіх душах тады лічыліся сялянскія сем'і, дзе ў сярэднім звычайна было яшчэ душы па чатыры, апрача гаспадара. Такім чынам, блізу мільёна беларусаў сталі прыгоннымі рускіх памешчыкаў, нібы менавіта ў гэтым была адвечная мара беларусаў, якія, паводле нашых афіцыйных герадотаў, ніколі не мелі большага клопату, як чакаць з усходу вызваліцеляў. Нават пасля таго, як Іван Грозны вызваліў Полацк ад палачанаў, а ваявода Шарамецьеў — Мсціслаў ад мсціслаўцаў. Нават пасля таго, як у сярэдзіне XVII стагоддзя ў войнах з Маскоўскай дзяржавай за няпоўныя дваццаць гадоў насельніцтва Беларусі скарацілася ў два разы. Нават пасля таго, як у тым самым стагоддзі былі перапоўненыя палоннымі беларусамі астраханскія нявольніцкія рынкі, дзе «вызваліцелі» прадавалі нашых продкаў у рабства па тры рублі за галаву.

Былы Сенненскі павет, адкуль родам мой бацька, уваходзіў у Магілёўскую губерню, у якой дзесяткі вёсак і тысячы прыгонных атрымаў адзін са шматлікіх фаварытаў расійскае імператрыцы граф Арлоў. Вядома, часам мяне апаноўвае спакуса вывесці свой радавод менавіта ад яго. Канчаткова не закрэсліваючы і гэтую версію, мушу зазначыць, што, пэўна, усё было больш банальна, бо ў роднай бацькавай вёсцы Арловы жывуць амаль у кожнай хаце. Маю спадзяванне, што сыны Раман і Багдан парупяцца, каб людзей з гэтым прозвішчам на нашай зямлі не менела.

Мае бацькі большую частку свайго свядомага жыцця, прынамсі, пасля таго, як пакінулі вёску, на мове сваіх бацькоў не гаварылі. Мае сыны-месцічы, калі былі малыя, пачыналі гаварыць на розных з бацькамі мовах якраз пасля летавання ў вёсцы, дзе іх старанна вучылі «па-гарадскому».

Тут я чамусьці—не сказаць, каб вельмі дарэчы — прыгадваю знаёмага кінарэжысёра, што аднойчы, гады тры таму, нападпітку наракаў мне на сваё цяжкое жыццё.

— Разумееш, Валодзя, столькі жанчын у мяне было, і хоць бы адна ў ложку слова па-беларуску сказала.

Я суцешыў гаротніка тым, што ўбіраюцца ў сілу працэсы нацыянальнага адраджэння. І не памыліўся. Сустрэўшы мяне днямі (хацелася напісаць: на вуліцы, але буду шчыры — у бары Дома літаратара, у тым самым, дзе ўвесь час сядзіць паэт А. Сыс), маэстра з пачуццём, так бы мовіць, нацыянальнага задавальнення, усцешана паведаміў, што ў ягоныя абдымкі (відаць, паводле тэорыі імавернасці) пачалі ўжо трапляць і нацыянальна свядомыя прадстаўніцы прыўкраснай, як пісаў незабыўны Уладзімір Караткевіч, паловы нашага народа.

На двары ўсчынаецца крык, і я падыходжу да вакна. Вакол жоўтае цыстэрны з півам (па-мясцоваму — свінаматка) віруе натоўп (па-мясцоваму — пленум). Мой сусед, ужо яўна і даўно размяняўшы пазычаны чырвонец, адпіхвае ад цыстэрны старога з бітончыкам.

— Подумаешь, удостоверение! У нас у каждого по десять удостоверений! У меня вон дед — герой борьбы за Советскую власть. Врагов народа от справедливого гнева товарища Сталина в ГУЛАГе охранял! А другой дедуля у Булак-Балаховича за наше светлое будущее боролся. Националист проклятый! А ты ко мне со своим удостоверением лезешь. Я тебе русским языком сказал: сховай удостоверение!

Вяртаюся да стала, каб дапісаць апошнія словы.

Мяркуйце самі, як абышліся б са мною продкі-крывічы.

А з вамі, шаноўныя?

Думаю, шанцы ў нас прыкладна аднолькавыя.

А таму — ці не паспрабаваць заняцца нечым падобным і вам?

1990.

З паэтычнай пошты

Віктар ЛУЖКОЎСКІ

Легенда пра хмару

Зноў хмара злуецца, зноў, мусіць, з тугі
Кідае свае бліскавіцы...
А. КУЛЯШОЎ.

Яе асадзілі, ці села сама
Хмарына, што з грыфам «Сакрэтна».
І пошапак чуем, зусім нездарма:
У неба пускалі ракеты...

А што там: гарматы грымелі ці гром
Вясновай жывой навальніцы
Над Бесяддзю рэчкай, над бацькам
Дняпром? —
Легенда збудзіла званіцы.

Над хатай, над плугам, над бляскам вясла
З Чарнобыля шызая хмарка
Няхай бы, як іншыя хмары, плыла
І радасць нясла гаспадаркам.

Яна ж пралілася на ярую рунь,
На дахі, на нераст ляшчовы,
Як смерць, затуманіла росную юнь
Сцяжынак лясных Куляшова.

Легенда і сёння блукае без меж.
А думак адзіны кірунак:
Мой краю, ну як ты, мой любы, жывеш?..
Хутчэй бы знайсці паратунак.

Што гэта з намі?

Абыякавасць душы з'ядае,
Свой парог—непрыступны, як трон.
Ціха грошы на кніжкі складаем,
Дружба чэзне. Маўчыць тэлефон.

Аглушылі заморскія песні,
Любім зорак эстрады глядзець.
А на нашым сухенькім Палессі
Плача, стогне хаўтурная медзь.

•

Абмінем, прамаўчым, не заўважым—
Боль суседа душу не кране.
А спытаюць, дык ветліва скажам:
Гэта справа не тычыць мяне.

Азірніся

У засені аблок аэразолю
Цьмянее воблік роднае зямлі,
І сэрца захлынаецца ад болю:
Калі ўсё гэта скончыцца, калі?

Куды ні ступіш ты — усюды страты:
Не чутна жаўранка, чарнее цвет калін,
І губяць нашу бульбачку нітраты, —
Калі ўсё гэта скончыцца, калі?

Апошні язь на водмелі трапеча.
Дыміцца звалка ля дубовых веж.
Спыніся, азірніся, чалавеча, —
У кратэры вулкана ты жывеш.

Ігару Лучанку

На тлумным брэжнеўскім папасе
Святочна адгучала медзь.
Нялёгка пець аб нашым часе,
Яшчэ цяжэй зусім не пець.

Перабудова — не абнова
Да слаўных дат календара.
Яна — будзённых спраў аснова
І новай музыкі пара.

Клімук у космас браў «Бярозку»
Як ветразь юных зім і лет.
І, славячы над рэчкай вёску,
Гучала музыка планет.

Душу інтымнасцю не звузіць.
Яна што космас — без канца.
Сумуючы ў чмяліным лузе,
Прасіла дзеўчына касца:

«Ой, мурожна ды росна
Ля быстрай вады:
Закасі мае вёсны,
Касец малады»...

Душа на сонечным папасе
Адпрэчыла аркестраў медзь.
Нялёгка пець аб нашым часе,
Яшчэ цяжэй зусім не пець.

Мікола ЧАРНЯЎСКІ

НАВАЛАЧ, ці Роздум на тэму самакрытыкі

Не чуць, не бачыць —
што ж такога?
Хіба разлік у гэтым ёсць?
Ды ўсё ж скубе, грызе
трывога,
ды ўсё ж сцінае думкі злосць:
якім жа трэба нарадзіцца,
якім жа трэба быць душой,
каб ад людзей адгарадзіцца
парканам чэрствасці глухой?

Якім жа трэба нарадзіцца,
якое сэрца трэба мець,
каб ад сумлення адступіцца,
бы ўраз аслепнуць, анямець?

«Ды згінь ты, навалач такая,
я ж не жыву, як сыч той,
сплю...» —
сябе кляну, сябе ўпікаю,
ды ўсё... маўчу, ды ўсё...
цярплю.

Барыс МАНЦЭВІЧ

ЗАСЕЛІ БЮРАКРАТЫ...

Заселі бюракраты
З павышанай зарплатай,
За гладкімі сталамі,
Як мумії, тырчаць.

У руках іх — склады-
складзікі,
У руках іх — базы-базікі,
А на ўсіх астатніх
Ім проста напляваць.

Дакуль, скажыце, людзі,
На белым свеце будзе
Лічыцца за нівошта
Сумленны чалавек?

Пара тым бюракратам
З павышанай зарплатай
Даць добранька у карак,
Каб помнілі навек.

г. Беразіно.

ФРАЗЫ

Колькі дэфіцытнага металу пайшло на стварэнне жалезнай заслоны!

□

Трэба час ад часу правяраць аксіёмы, інакш яны могуць ператварыцца ў тэарэмы.

□

У каго хутчэй вырашыцца пытанне: у таго, хто б'е ва ўсе званы, ці ў таго, хто здыме трубку і пазвоніць?

□

Так моцна пратрубіў трывогу, што падняў на бой праціўніка.

□

Трэба так трымацца ў цяні, каб цябе заўважылі.

А. СУШКЕВІЧ.

А. ПЕТРАЧЭНКА

НЕЎМІРУЧАЯ ПЕСНЯ

Кампазітар-песеннік Артур Джазаў, папрацаваўшы ўсман, напісаў на словы вядомага паэта Цімафея Ламавіна песню «Хлопец з дзеўкай парай ходзяць». Песня атрымалася, казаў,—як гімн спрадвечнаму пачуццю, што творыць жыццё чалавека. Першы, з кім ён падзяліўся сваёй радасцю, быў музыказнавец Кірыла Сімфанічны — якраз забег да яго перахапіць дзесятку на выдатні, пра якія нельга ведаць жонцы. Сімфанічны пачытаў ноты, сыграў на піяніна мелодыю. Наморшчыў нос, памыляў губамі.

Артур Джазаў усё зразумеў. Схаваў чырвонец, які падрыхтаваў ужо быў, у кішэні, усмешліва звузіў вочы:

— Не спадабалася, значыцца? Ну што з цябе возьмеш? Сказана — Сімфанічны, табе шум-звон падавай. А песню ж тонка трэба разумець, кожнай часцінкай душы. Артысты скажуць сваё важкае слова.

Аднак ішоў час, а песня не гучала ні ў канцэртных залах, ні ў палацах культуры, ні па радыё. Джазаў прапаноўваў яе многім спевакам, і ад усіх чуў амаль адно і тое ж: «Гэта браце, не маё амплуа...», «Яна, даруйце, дарагі таварыш, вялікадушна, не для майго голасу...» Ён абураўся: чорт ведае што! Папрысвойвалі ім званні народных, заслужаных, а яны ж сапраўдную песню спяваць не могуць! Там, дзе належыць данесці мелодыю на поўны голас, нават на мікрафоны не спадзяюцца!

Страціўшы веру ў прафесіяналаў, Джазаў кінуўся да самадзейнасці. Сапраўдныя таленты там, у гушчыні народа. Без мікрафонаў спяваюць — і як! Слухаеш — дык узнёсласць у грудзях не ўмяшчаецца, радасць, як тая рэчка ў весні разліў, з берагоў выходзіць.

Але і самадзейныя спевакі, хаваючы збянтэжанасць, яму казалі: «Нам такую мелодыю не выцягнуць». Тады Артур Джазаў вырашыў, што «лёд кранецца», калі папулярызаваць песню з дапамогай друку. Толькі трэба шырока і гучна. Няпраўда, усе спахопяцца: і народныя, і тыя, што з народа...

З гэтым ён і пайшоў да Сімфанічнага, прыхапіўшы на ўсякі выпадак «чырвоненькую».

Яны сядзелі ва ўтульнай, з ружовым таршэрам і каляровым тэлевізарам гасцінай, пілі чай. Джазаў стаў даставаць з кішэні насоўку, каб выцерці спатнелы лоб, і разам з насоўкай незнарок выцягнуў тую хрусткую купюру.

— Мая песня, калі глыбока разабрацца, будзе кранаць самыя інтымныя пачуцці чалавека і ўзбуджаць у ім самыя светлыя эмоцыі,— гаварыў ён, не спяшаючыся класці назад чырвонец.

— Разумею, разумею,— ківаў галавой Сімфанічны,— аднак пры чым тут я? Чым я магу дапамагчы табе?

— Рэцэнзію напішы! — раптам горача выдыхнуў Джазаў.

— Рэц... — Сімфанічны хаўкнуў ротам, заглытваючы паветра. — Але ж, як тут табе сказаць...

— Ха-ха-ха! — адкінуўся на спінку крэсла Джазаў. — Спасаваў, дробная твая душа, пабаяўся, што народных, якія адмовіліся, пакрыўдзіш? Не, песня мая не памрэ. Яна будзе жыць у народзе, бо спрадвеку хлопец з дзеўкай парай ходзяць. — Ён шпарка сунуў дзесятку ў кішэню. — І знойдуцца шаноўныя людзі, якія будуць яе выконваць.

— Але ж, як тут табе сказаць... Рэцэнзія ўсё роўна патрэбна. Яна зарыентуе, нацэліць...

Рука Джазава зноў палезла ў кішэню... па насоўку.

Сімфанічны напісаў на песню грунтоўную рэцэнзію. Твор — чарговая ўдача аўтараў: своеасаблівая навацыя, сімбіёз традыцыйнага нацыянальнага народнага духу і новай, прагрэсіўнай культуры захаду, якая стала магутным подыхам часу.

А неўзабаве бадзёры голас дыктара апавясціў радыёслухачоў:

— Новая песня «Хлопец з дзеўкай парай ходзяць»! Выконвае хор персанальных (тут ён узвысіў голас) пенсіянераў! Кіраўнік хору — аўтар песні кампазітар Артур Джазаў. Запявалы: Артур Джазаў — лірычны тэнар і Цімафей Ламавік — бас. Падпявала з мадуляцыяй на розныя галасы — Кірыла Сімфанічны!



Мал. А. ГУРСКАГА.

Анань ВЕРАБЕЙ

ЛЕЎ

БАЙКА

Здаўна вядома, Леў у лесе
— цар.
Усе звяры штодзённа
адчуваюць,
Што ён і гаспадар, і уладар,
І іхні лёс, звярыны, вырашае.
Хоць Леў і цар, ды зараз час
не той.
Звяры
кіраўніка абраць павінны.
І раяцца яны паміж сабой,
Каго ім выбраць у савет
звярыны.
І вырашыў звярыны апарат,
Што Леў — дастойны самы
кандыдат.
Ды бачаць — штосьці не ў
гуморы Леў:
Хвастом віляе і матае
грывай.
І апарат з паўслова
зразумеў —
Патрэбна сёння Льву
альтэрнатыва.
Яны сабралі дробных
грызуноў,
Прыйшлі на сход бабры,
зайцы, казулі.
Каб кворум быў,
яшчэ гукнулі
З суседняй трусафермы
двух трусоў.
Тут слова ўзяў Бабёр:
«Яно, вядома,
Патрэбен кандыдат ад
аграпрома».
І вылучыць Труса
прапанаваў.
Сход дружна за Труса
галасаваў.
Здаволены звярыны апарат.
Змагаюцца Леў з Трусам за
мандат.

З 13 ПА 19 ЖНІЎНЯ

14 жніўня. 20.10

ЖЫЦЦЁ З ПЕСНЯЙ

Тэленарыс пра сямейныя ансамблі вёсак Левашы і Азершчына Рэчыцкага раёна.

14 жніўня. 21.15

ЛІРА

Мастацка-публіцыстычная праграма.

Гледачы стануць удзельнікамі свята, якое адзначаецца на Беларусі ўжо больш за пяцьсот год — гэта свята цудатворнай Іконы Жыровіцкай Богамаці.

17 жніўня. 19.25

«ДЗВІНА»

Літаратурна-мастацкі часопіс з Віцебска.

Са старажытным Віцебскам знаёміць гісторык Л. Хмяльніцкая.

Журналіст Л. Няўдах прадстаўляе сваю новую кніжку «Формула дабрыні». Мастацтвазнаўца А. Новікава раскажа пра тыя мясціны на Віцебшчыне, якія звязаны з жыццём і творчасцю выдатнага рускага мастака І. Я. Рэпіна. Адбудзецца знаёмства з малавядомымі старонкамі нашай гісторыі, запісанымі ў свой час А. Рыпінскім.

18 жніўня. 12.00

«ВЕТАХ»

Старажытныя беларускія музычныя інструменты.

Гледачы сустрэнуцца з артыстамі аркестра фальклорнага ансамбля «Харошкі». Гутарку з кіраўніком аркестра С. Хвашчынскім вядзе журналіст Ю. Лакавец.

18 жніўня. 15.50

«ВЯРТАННЕ»

Дзейнасць грамадскасці рэспублікі па адраджэнню нацыянальнай культуры.

Удзел у перадачы бярэ старшыня камісіі «Вяртанне» Беларускага фонду культуры А. Мальдзіс. Адбудзецца знаёмства з этнаграфічным гуртом з ЗША «Васілёк».

18 жніўня. 17.40

У ЖЫВАПІСЕ, ГРАФІЦЫ, СКУЛЬПТУРЫ...

Перадача расказвае пра выстаўку Н. Чарнагаловай «Фарбы кахання», пра творчасць армянскага мастака Л. Дарбіняна і культурна-асветніцкае таварыства «Аястан». Адбудзецца знаёмства з псіхіятрам В. Круглянскім і яго калекцыяй карцін.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и совета Союза писателей БССР. Минск. На белорусском языке.

Літаратура і Мастацтва

Выходзіць раз на тыдзень, па пятніцах.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.

Індэкс 63856

П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220600, ГСП, Мінск, вул. Захарава, 19.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная рэдакцыі — 33-24-61; намеснік галоўнага рэдактара — 33-25-25; адказны сакратар — 33-19-85; аддзел публіцыстыкі: Міхась ЗАМСКІ, Віталь ТАРАС — 33-19-65; аддзел пісьмаў і грамадскай думкі: Людміла КРУШЫНСКАЯ, Марыя ГІЛЕВІЧ — 33-19-85; аддзел інфармацыі: Алесь МАРЦІНОВІЧ — 33-24-62; аддзел крытыкі і бібліяграфіі: Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ — 33-22-04; аддзел літаратуры: Юрась СВІРКА, Уладзімір ЯГОЎДЗІК — 33-22-04; аддзел музыкі: Святлана БЕРАСЦЕНЬ — 33-21-53; аддзел тэатра, кіно і тэлебачання: Жанна ЛАШКЕВІЧ — 33-21-53; аддзел выяўленчага мастацтва і аховы помнікаў: Пётра ВАСІЛЕЎСКІ — 33-24-62; аддзел народнай творчасці і культасветработы: Вячаслаў ЛАПЦІК — 33-24-62; аддзел мастацкага афармлення: Уладзімір ТАБУШАЎ — 33-44-04; фотакарэспандэнт: Уладзімір КРУК — 33-24-62.

Пры перадруку просьба спасылацца на «ЛіМ». Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе.

Галоўны рэдактар Анатоль ВЯРЦІНСКІ.

Рэдакцыйная калегія:

Заір АЗГУР, Алесь АСІПЕНКА, Анатоль БУТЭВІЧ, Уладзімір ГІЛЕП, Мікола ГІЛЬ (нам. галоўнага рэдактара), Уладзімір ГНІЛАМЕДАЎ, Лілія ДАВІДОВІЧ, Міхась ДРЫНЕЎСКІ, Алесь ЖУК, Галіна КАРЖАНЕЎСКАЯ, Ігар ЛУЧАНОК, Уладзімір НЯКЛЯЕЎ, Нічыпар ПАШКЕВІЧ, Барыс САЧАНКА, Юрась СВІРКА, Рычард СМОЛЬСКІ, Уладзімір СТАЛЬМАШОНАК, Віктар ТУРАЎ.

Адказны сакратар Андрэй ГАНЧАРОЎ.